КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 19 (1249) 7 мая 2016 г.

УКАЗАМ № 164 ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ СКЛІКАННЕ V УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ ПРЫЗНАЧАНА НА 22 — 23 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ



ВЫСОКАЯ ЗОРКА ПЕРАМОГІ

Святочныя мерапрыемствы да Дня Перамогі пачаліся ў сталіцы 6 мая ўрачыстым сходам і канцэртам "Па праву памяці жывы..." ў Палацы Рэспублікі.

Вольга РОПАТ, Алег КЛІМАЎ

Сёлета падзея ў Палацы Рэспублікі будзе вырашана як канцэрт-спектакль: музычнае тэатралізаванае прадстаўленне, героі якога — камандзір, салдаты, партызаны. У музычным прадстаўленні прагучаць песні ваенных, пасляваенных гадоў, сучасныя песні, а таксама вершы на ваенную тэматыку. У фінале канцэрта прагучыць твор кампазітара Васіля Раінчыка "Кветкі Вялікай Перамогі" у харавым выкананні.

— Міністэрства культуры рыхтуе канцэртную праграму, якая зацікавіць і ветэранаў, і сярэдняе пакаленне, і моладзь. Гэта будзе яркае, маштабнае свята, што закране душу кожнага, — падкрэсліла падчас сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга.

Начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны краіны Уладзімір Макараў дадаў, што зараз праводзяцца сустрэчы асабовага складу з ветэранамі, мерапрыемствы патрыятычнага кірунку ў гарнізонах і ваенных частках, а творчыя калектывы праводзяць гастрольны тур па брэсцкім, гродзенскім, полацкім гарнізонах.

Святочны канцэрт адбудзецца 7 мая на пляцоўцы каля Палаца спорту. Ён пройдзе ў рамках гастрольнага тура па Беларусі і і Расіі народнага артыста СССР Іосіфа Кабзона і лаўрэатаў конкурсу "Крышталёвыя зорачкі". А 8 мая пройдуць мерапрыемствы рэспубліканскай акцыі "Кветкі Вялікай Перамогі" .

Упершыню ў Дзень Перамогі адбудзецца шэсце памяці "Беларусь памятае". Ірына Дрыга адзначыла, што шэсце пройдзе як па праспекце Незалежнасці, так і па прылеглых вуліцах. Гэта сімвалізуе ўсенароднае адзінства і ўсенародную памяць. У руках удзельнікаў будуць знаходзіцца партрэты герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў Беларусі, герояў Савецкага Саюза, якія прымалі ўдзел за вызваленне Беларусі.

Сустрэць святочнае шэсце ветэраны змогуць на спецыяльна ўстаноўленых трыбунах. А ўвечары мінчан і гасцей сталіцы парадуе святочным канцэртам Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь, артысты эстрады. Скончыцца святочная праграма яскравым салютам — 30 залпамі.

Віктар Бабарыкін, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра, кажа:

— Да канцэрта "А памяць — священна...", які распачнецца на плошчы Перамогі 9 мая ў 20.30, наш аркестр рыхтаваўся ва ўзмоцненым рэжыме, без выхадных. Хоры рэпеціравалі ўдзень, салісты, якія ўсё дадаваліся ў выніковую праграму, — увечары, пастаянна нешта перабудоўвалася — урэшце, звыклая справа для вялікіх урачыстасцей дзяржаўнага значэння. Але аснова, вядома, засталася.

Дык вось, на Плошчы Перамогі разам з Прэзідэнцкім аркестрам выступяць хор Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, акадэмічны хор Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі, Дзяржаўны камерны хор краіны, Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Генадзя Цітовіча. Сярод салістаў — Уладзімір Громаў, Ірына Дарафеева, Вікторыя Алешка, іншыя зоркі оперы ды эстрады.

Праграму склалі, натуральна, музычныя творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, песні ваенных гадоў. "Упэўнены, нікога не пакіне абыякавым выкананне песні "Дзень Перамогі", якую праспявае трыа ў складзе папулярнага расійскага спевака Рэната Ібрагімава, саліста беларускай оперы Уладзіміра Пятрова ды народнага артыста Беларусі Мікалая Скорыкава, — мяркуе Віктар Бабарыкін. — Запамінальным для публікі будзе і наш сумесны нумар з ротай ганаровай варты, які суправаджаецца музыкай з кінафільма "Беларускі вакзал".

Сам Віктар Уладзіміравіч 9 мая аддае даніну павагі сваім дзядам, сваякам, усім людзям, якія абаранілі свет ад карычневай чумы, загінулым ды ацалелым. "У гэты дзень я перапоўнены асаблівым светлым пачуццём да пераможцаў, якіх, на жаль, з кожным годам застаецца ўсё менш і менш. Для мяне Дзень Перамогі — сапраўды свята са слязьмі на вачах, і той жа канцэрт — наша падзяка".





У нядзелю ля сталічнага Палаца спорту ў рамках арганізаванага Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі фэста пад адкрытым небам "Кветкі Вялікай Перамогі" адбудзецца прэзентацыя Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу аўтарскай (бардаўскай) песні "Кветкі Вялікай Перамогі". Яго суарганізатарам выступае Міністэрства культуры Беларусі. Творчае спаборніцтва пройдзе ва ўсіх рэгіёнах і завершыцца гала-канцэртам 2 ліпеня, напярэдадні Дня Незалежнасці Беларусі.

Падзея 8 мая аб'яднае больш за 500 тысяч удзельнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. У сталіцу з'едуцца маладзёжныя дэлегацыі абласных арганізацый БРСМ, а таксама прадстаўнікі клубаў ваенна-патрыятычных рэканструкцый, пошукавых атрадаў, аб'яднанняў рэтрааўтамабіляў, а таксама шматлікія творчыя калектывы. Ля Палаца спорту будзе дзейнічаць каля 40 тэматычных інтэрактыўных пляцовак.

Самую вялікую іх колькасць прадставіць Мінская гарадская арганізацыя БРСМ, сярод іх — "Танец памяці", "Беларусь і Я". Вобласці таксама не застануцца ў баку. Вось самыя цікавыя з іх праектаў на гэтую нядзелю: Брэстчына рыхтуе тэатралізаваную рэканструкцыю дзейнасці ў гады вайны абласнога штабу камсамольска-партызанскага руху ва ўрочышчы Хаваншчына. Гомельскі ваенна-патрыятычны клуб "Гонар" разаб'е "Паходны лагер". Магілёўшчына прывязе копію перасоўнай рэдакцыі, каб падрыхтаваць спецвыпуск франтавой газеты, рэтра-фотастудыю і прапануе наведвальнікам зрабіць бія-тату з лагатыпам фэсту.

Міншчына заклікае зазірнуць у "Музей ў чамадане". Гродзеншчына на арт-пляцоўцы "Вайна, гісторыя, людзі" пазнаёміць з выставай ваеннай паштовай прадукцыі. Віцебшчына прэзентуе брэнд Шаркаўшчынскага раёну: праект "Яблычны Спас" у Алашках", які выклікаў значны інтарэс на сталічнай турыстычнай выставе, пасля чаго быў уключаны ў праграму Фестывалю інтэрнацыянальнага сяброўства "Беларускае лета-2016" як турыстычны прадукт, што прадстаўляе частку нацыянальнай культуры краіны.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 3.**

"К" інфармуе

Бабруйск-2017: лаўры культурнай сталіцы

4 мая, падчас пасяджэння калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, было прынята рашэнне аб тым, што культурнай сталіцай нашай краіны ў 2017-м стане горад Бабруйск Магілёўскай вобласці.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Па словах намесніка старшыні Бабруйскага гарвыканкама Аляксандра Маркачова, гэта была не першая спроба атрымаць статус культурнай сталіцы краіны: горад удзельнічаў у конкурсным адборы яшчэ ў 2012 годзе. За пяць гадоў, якія мінулі з таго часу, у Бабруйску правялі вялікую працу па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў сферы культуры. Так, за апошнюю пяцігодку з гарадскога бюджэту пад гэтыя мэты было накіравана больш як 30 мільярдаў рублёў, у тым ліку паводле Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" — больш за 20 мільярдаў.

Сёння ў горадзе працуе тры ўстановы клубнага тыпу, дзе налічваюцца 92 творчыя фарміраванні. Да слова, 73 творчыя калектывы горада маюць найменні "народны" і "ўзорны", а 7 носяць ганаровае званне "заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь". У горадзе прадстаўлена 11 бібліятэк, два музеі, працуюць 3 дзіцячыя школы мастацтваў, у якіх агулам навучаецца каля 2 тысяч чалавек, а таксама ёсць парк культуры і адпачынку.

Як адзначыў Аляксандр Маркачоў, гарадская карцінная галерэя, адкрытая у 2012 годзе, налічвае ў сваёй калекцыі не толькі працы бабруйскіх мастакоў, але і творы ўдзельнікаў традыцыйнага пленэру "Art-Жыжаль" з 18 краін свету. Так, майстры з замежных краін пакінулі ў дар галерэі больш чым 600 экспанатаў. Натуральна, дадзеная калекцыя будзе пашырацца і папаўняцца надалей у час чарговых пленэраў.

Таксама за апошнія гады гарадскімі ўладамі быў праведзены капітальны рамонт дзіцячай школы мастацтваў № 2 імя Уладзіміра Алоўнікава. Гэта дазволіла арганізаваць сёлета, у Год культуры, Першы адкрыты конкурс юных піяністаў імя знакамітага кампазітара, які сабраў прадстаўнікоў моладзі з усіх куткоў краіны (пра падзею — у "К" № 15). Як спадзяецца Аляксандр Маркачоў, бліжэйшым часам мерапрыемства набудзе рэспубліканскі статус.

Натуральна, нельга не згадаць і пра тое, што візітоўкай горада стаў міжнародны фестываль "Вянок дружбы", які аб'яднаў пад дэвізам сяброўства за 13-гадовую гісторыю 38 краін з пяці кантынентаў. Упершыню за апошнія пяць гадоў удзельнікамі фестывалю сталі калектывы з Аўстрыі, Францыі, Бельгіі, Швецыі, Нідэрландаў, Іспаніі і некаторыя іншыя.

Як адзначыў, падводзячы вынікі пасяджэння, міністр культуры краіны Барыс Святлоў, Бабруйск цалкам заслугоўвае атрымання ганаровага звання "Культурнай сталіцы Беларусі", што і было яскрава прадэманстравана падчас прэзентацыі. Але, па словах кіраўніка Мінкультуры, вельмі важна, акрамя культурных акцый, спланаваць мерапрыемствы ў іншых сферах жыцця. Бо, як вядома, абвешчаны ў Беларусі Год культуры мае на ўвазе прадстаўленне культуры ў шырокім сэнсе гэтага слова, а значыць, варта паказваць і іншыя сферы паспяховай дзейнасці ў горадзе. Акрамя таго, Барыс Святлоў прапанаваў апрабаваць у Бабруйску у наступным годзе ідэю прысуджэння статусу "Ганаровы грамадзянін Культурнай сталіцы Беларусі", а таксама прадугледзець магчымасць ушанавання мясцовых мецэнатаў, якія паспрыяюць у правядзенні культурных мерапрыемстваў.

...І ЯЕ КВЕТКІ

Фота на першай паласе — Дзяміда Важніка, выявы банераў — з сайта Беларускага тэлеграфнага агенцтва

Актуальна

Сярэбраны “Славянскі…”

Юбілейны фестываль “Славянскі базар у Віцебску” пройдзе з 14 па 18 ліпеня. Тэмы сёлетняй падзеі — Год культуры, даніна памяці пераможцам у Вялікай Айчыннай вайне і 25-годдзе самога мерапрыемства. Пра гэтае паведамілі на прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Вольга РОПАТ

“Ад юбілейнага фестывалю многія чакаюць навінак. Мы, падводзячы вынік 25-гадовай працы, намагаемся сабраць на яго тых людзей, якія звязалі з ім усё сваё жыццё”, — адзначыў дырэктар Дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” Аляксандр Сідарэнка.

Такім чынам, аснова фестывальнай праграмы — зварот да гісторыі віцебскага форуму: пакажуць відэаматэрыялы, відэапрывітанні знакамітых творцаў з розных краін, якія калісьці прымалі ўдзел у мерапрыемстве, узначальвалі журы, рабілі першыя крокі на тутэйшых конкурсах у вялікі эстрадны свет. Дзень адкрыцця пачнецца з традыцыйнай прэс-канферэнцыі і святочнага тэатралізаванага параду-шэсця артыстаў, гасцей, удзельнікаў мерапрыемства ад віцебскай плошчы Перамогі да пляцоўкі ля Летняга амфітэатра, дзе ўпершыню адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўздыму вялікага фестывальнага флага — сімвала яднання народаў і дзяржаў-удзельніц. На Алеі зорак закладуць чарговы памятны знак у гонар уладальніка спецыяльнай узнагароды Кіраўніка дзяржавы “Праз мастацтва — да міра і ўзаемаразумення”. Пад дэвізам “З юбілеем — фестываль!” адбудуцца ўрачыстая цырымонія адкрыцця фэсту і прымеркаваны да яе гала-канцэрт. Традыцыйны Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск” пройдзе ў тры этапы (“Нацыянальны хіт”, “Славянскі хіт”, “Фестывальны хіт”), старшынёй яго сёлета з’яўляецца народны артыст Расіі Валерый Лявонцьеў. Узначаліць журы Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу “Віцебск” кіраўнік Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь Віктар Бабарыкін. На дзіцячым і дарослым спаборніцтвах агулам прадстаўлена 28 краін свету, прычым Калумбія і Аргенціна — упершыню.

Сярод спецыяльных юбілейных мерапрыемстваў — канцэртная праграма “25 імгненняў лета”, у якой уладальнікі Гран-пры, лаўрэаты Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск” выступяць у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга, канцэрт “Віцебск збірае сяброў”. У рамках Дня Саюзнай дзяржавы адбудзецца канцэрт Акадэмічнага ансамбля песні і танца Расійскай Арміі імя Аляксандра Аляксандрава. Адбудзецца “Фестываль без межаў”, у рамках якога пройдуць канцэрты артыстаў з Грузіі, Латвіі, Чэхіі, Ізраіля. Далучыцца таксама і Кітай, які праяўляе цікавасць да фестывалю.

У другі раз пройдзе фэст вулічнага мастацтва “На сямі вятрах”, праект “Лялечны квартал”, — паведаміла першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга. Рыхтуюцца тры праекты: чэшскі зборны канцэрт, ізраільскі канцэрт і сумесны беларуска-кітайскі. Увогуле арганізатары плануюць правесці не менш як 100 мерапрыемстваў.

Магчыма, будуць і рэкорды для Кнігі рэкордаў Гінэса. Арганізатары “Славянскага базару…” у рамках фэсту вулічнага мастацтва правядуць конкурс паэтаў. Яны каля 10 гадзін будуць чытаць вершы пра Віцебск. Яшчэ адно новаўвядзенне — продаж падарункавых сертыфікатаў, іх можна будзе набыць на працягу ўсяго каляндарнага года, а потым — абмяняць на білет форуму.

К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА”. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
“Культура”, 2016. Наклад 4 405. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 6.05.2016 у 18.00. Замова 1886. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

З архітэктурнай спадчынай усё збольшага зразумела. Даступныя кожнаму інтэрнэт-атласы “Радзіма” і “Глобус” ахопліваюць, напэўна, усе аб’екты, якія (часам нават з пэўнай нацяжкай) можна аднесці да гэтай катэгорыі. Прычым варта адзначыць, што абодва праекты ад самага пачатку з’яўляюцца валанцёрскімі. Іх стваральнікі і напаўняльнікі — гэта проста энтузіясты, і плён іх бескарыслівай у фінансавым вымярэнні працы, канешне ж, уражвае. Дзіўна, дарэчы, чаму гэтыя ўнікальныя для постсавецкай прасторы ініцыятывы даволі рэдка згадваліся падчас “круглага стала”, а іх завадатараў не было сярод яго ўдзельнікаў.

Іншая справа — пастаянны маніторынг актуальнага стану таго ці іншага аб’екта, як фізічнага гэтак і юрыдычнага. З гэтым пакуль праблема: цэнтралізаванага рэсурсу, які б яго адсочваў, у нас няма. І калі зацікаўленаму чалавеку раптам спатрэбіцца даведацца, ці была, урэшце, ліквідаваная дзірка ў даху сядзібнага дома ў вёсцы Арэхаўна, што на Ушаччыне, яму давядзецца альбо доўга сноўдацца па закутках Інтэрнэта, альбо… з’ездзіць ды паглядзець самому.

Дадзеную лакуну абяцае запоўніць база даных, якая ствараецца фондам “Urban Heritage” (пра яе мы згадвалі ў “К” №16). Прадстаўляючы гэты праект на “круглым стале”, спецыялісты па ахове спадчыны Ірына Лаўроўская і Тамара Матыль не пакінулі сумневаў: пачын вельмі сур’ёзны, не ў апошнюю чаргу, дзякуючы замежнаму фінансаванню. Параўнальна са згаданымі атласамі, разлічанымі перадусім на аматара падарожжаў, новая база мае быць больш грунтоўнай і “навуковай”, а сам матэрыял — належным чынам сістэматызаваным. Прыкладам, інвентар будзе ўключаць не толькі фота аб’ектаў, але і іх іканаграфію ў гістарычнай парадыгме і нават нерэалізаваныя праекты рэстаўрацыі. І хаця пакуль праект яшчэ не выйшаў нават на стадыю “бэта-версіі”, хочацца верыць, што яго стваральнікам удасца дасягнуць папраўдзе прынцыпова новага ўзроўню ў справе інвентарызацыі аб’ектаў спадчыны. Прычым яны спадзяюцца, што неўзабаве іх партал стане не проста банкам актуальных звестак, але таксама і інструментам дзеяння. І ўбачыўшы свежаспілаванае ў старым парку дрэва ці нейкі іншы абуральны факт, неабыякавы чалавек здолее “ў пару клікаў” паведаміць пра гэта адказнай за захаванне таго самага аб’екту асобе.

Тое, што такая база даных павінна быць публічнай і агульнадаступнай, падаецца неаспрэчным. Зусім іншая справа — інвентарызацыя помнікаў археалогіі. Як адзначыў падчас круглага стала намеснік дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вадзім Лакіза, некаторыя папулярныя выданні ўжо сталі настольнымі кнігамі для чорных капальнікаў. Заканамерна, што менавіта супрацьдзеянню гэтаму злу была прысвечана значная частка яго дакладу. У той самы час, у гэтай галіне ёсць і яшчэ адна праблема: заяўленая ў мінулым дзесяцігоддзі татальная інвентарызацыя тых археалагічных аб’ектаў, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, на сённяшні дзень адбылася добра калі ў паўсотні раёнаў. Прычына зразумелая: брак ініцыятывы на месцах. Ды і спадзявацца выключна на энтузіястаў у дадзеным выпадку не выпадае: без удзелу спецыялістаў такая працэдура проста немагчымая.

Між тым, згаданы Дзяржспіс утрымлівае далёка не ўсе вядомыя нам археалагічныя аб’екты — насамрэч іх у разы болей. Таму патрэба стварэння асобнага банку даных наспела ўжо даўно. Пагадзіўшыся з тым, што такая база павінна быць даступнай толькі для спецыялістаў — каб не спрашчаць жыццё тым самым “капачам”, — каардынатар семінара, начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па

У сярэдзіне XIX стагоддзя па мястэчках ды сядзібах колішняга Вялікага Княства Літоўскага вандраваў паважнага выгляду мужчына з мальбертам. На ягоных аркушах заставаліся руіны замкаў, старадаўнія храмы, палацы ды паркі. Дзякуючы выключна гэтым малюнкам, сёння мы можам сабе ўявіць, як некалі выглядалі многія з іх. Ці думаў тады Напалеон Орда, што ягоную справу некалі назавуць інвентарызацыяй гісторыка-культурнай спадчыны? Можа, і не, але інтэнцыя ў яго была падобная. Праўда, сёння ён бы назапашваў свае выявы не ў альбоме, а ў якім-небудзь блогу. За прамінулыя паўтара стагоддзі, у тым ліку, і стаўленне да спадчыны як такой. Але праблемы з яе інвентарызацыяй па-ранейшаму актуальныя. Гэта засведчыў і “круглы стол” на дадзеную тэму, які прайшоў у мінскай мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага 27 красавіка па ініцыятыве фонду “Культурная спадчына і сучаснасць”.

Ілья СВІРЫН

Пра што не мог здагадацца Напалеон Орда?

Інвентарызацыя інвентарызатараў

5 і 6 мая ў Мінску прайшоў I Міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры. Арганізатарамі прадстаўнічага форуму выступілі Міністэрства культуры Беларусі і Нацыянальная акадэмія навук.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

На першы культурны кангрэс прыехалі больш за 300 даследчыкаў, навукоўцаў і спецыялістаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Японіі, ЗША, Ірана і некаторых іншых краін.

— Такі прадстаўнічы склад удзельнікаў сведчыць, наколькі сёння беларуская культура цікавая ў свеце, — адзначае дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, акадэмік НАН Беларусі Аляксандр Лакотка. Паводле ягоных словаў, у Год культуры даследчыкам трэба падвысіць планку навуковага абмеркавання праблем развіцця беларускай культуры

Захаваць самабытнасць

— А пытанняў тут сапраўды даволі шмат, — заявіў суразмоўца, — бо ў сённяшніх умовах глабалізацыі паўстае праблема захавання самабытных нацыянальных культур. Напрыклад, у Еўрапейскім саюзе, дзе цяпер існуе адзіная валюта і эканамічная прастора, кожная краіна заклапочана захаваннем сваіх нацыянальных культурных асаблівасцяў. Таму надзвычай важнай у названым аспекце мне бачыцца праграма UNESCO, скіраваная на захаванне культурнай і моўнай разнастайнасці ва ўсім свеце.

На думку Аляксандра Лакоткі, яшчэ адно важнае для абмеркавання пытанне — развіццё і функцыянаванне беларускай мовы ў варунках дзвюхмоўя.

— Што ні кажы, а праблема тут ёсць, — сказаў дырэктар Цэнтра, — хоць беларускай мовы, на мой погляд, у інфармацыйнай прасторы, у нашым грамадстве не меншае. Наадварот, сёння беларускую мову мы чуем ўсюды — яе ўспрыняла моладзь, успрыняў Інтэрнэт, пачала з’яўляцца беларускамоўная рэклама.

Падчас мерапрыемства ўдзельнікі форуму маглі не толькі абмеркаваць тыя ці іншыя пытанні і даклады, але і наведаць выставы выратаваных беларускімі рэстаўратарамі артэфактаў, а таксама пагартаць навуковыя выданні на тэму культуры, мовы і літаратуры, якія выйшлі з друку ў апошнія гады. Акрамя таго, госці кангрэсу за гэтыя два дні наведалі з экскурсіямі Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны гістарычны музей, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музей старажытнай беларускай культуры ды Нацыянальную бібліятэку краіны.

К

Надзённае

З 4 красавіка ўступілі ў сілу змены ў Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях адносна сферы аўтарскага права. “К” прапанавала начальніку Цэнтра па калектыўным кіраванні Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Аляксею БІЧУРЫНУ пракаментаваць сітуацыі, з якімі сутыкаюцца (ці ў якія могуць патрапіць) работнікі ўстаноў культуры краіны, і іх магчымае развіццё з юрыдычнага пункта гледжання.

Настасся ПАНКРАТАВА

Правілы паводзін з аўтарскім

(Пачатак тэмы ў № 16 — 18.)

— Мяркую, у краіне засталося зусім мала бібліятэк, якія не прапаноўвалі б сваім наведвальнікам паслугі ксеракапіравання. Тэксты таксама з’яўляюцца аб’ектам аўтарскага права. Як аказваць платныя паслугі на капіраванні, каб не парушыць закон?

— Закон дазваляе бібліятэкам займацца капіраваннем матэрыялаў без мэты атрымання прыбытку. Пачуўшы такі адказ, бібліятэкары кожны раз кажуць, маўляў, распачынаюць такую форму дзейнасці толькі для таго, каб мець дадатковую крыніцу фінансавання, а атрыманыя грошы накіроўваць на патрэбы кніжніцы. Паважаныя, калі на сайце паслуга пададзена ў выглядзе “ксеракапіраванне: 1 ліст — столькі рублёў”, чытач разумее, што здымаць копіі можна з чаго хочацца і ў любым аб’ёме. А тое — парушэнне закону. У гэтай справе шмат нюансаў. У прыватнасці, у адпаведнасці з заканадаўствам дапускаецца капіраванне бібліятэкамі па запытах іх чытачамі на некамерцыйнай аснове (без мэты атрымання прыбытку) толькі артыкулаў і іншых малааб’ёмных твораў выключна ў адукацыйных і даследчых мэтах. Капіраванне кніг цалкам нельга. Напрыклад, не дапускаецца капіраванне ўсяго тэксту дысертацый айчынных навукоўцаў. Можна ўзяць толькі пэўны фрагмент, каб потым працытаваць яго ў сваёй працы. Я разумею, што ад устаноў культуры патрабуецца нарошчванне долі пазабюджэтнага фінансавання. Гэтыя задачы агульныя, ставяцца перад усімі, але трэба ўсвядоміць, што аб’ёмы павінны ўзбуйняцца законнымі сродкамі.

— Зараз педагогі ўсё часцей звяртаюцца да сацыяльных сетак. На онлайн-старонцы яны

ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі Ала Сташкевіч, аднак, адзначыла: гэта не адмяняе неабходнасці стварэння агульнадаступнага партала, прысвечанага беларускай археалогіі. Прычым тут важная папулярызацыя не столькі саміх аб'ектаў спадчыны (далёка не кожны з іх можа ўяўляць з сябе турыстычную цікавостку), колькі адэкватных да іх падыходаў з боку грамадства.

Падобны партал, прысвечаны нематэрыяльнай культурнай спадчыне, ужо быў створаны стараннямі згаданага інстытута. Там можна знайсці як інвентар яе элементаў з іх апісаннем, фота- і відэафіксацыяй, так і актуальныя навіны, нарматыўныя дакументы і шмат чаго іншага. Як падаецца, сайт разлічаны перадусім на "прасунутага карыстальніка", ды і частка назапашанай інфармацыі ў адкрыты доступ не патрапіла — гэта звесткі пра тыя элементы НКС, якія іх носьбіты не надта хочуць падзяляць з усімі ахвотнымі.

…Урэшце, "круглы стол" прымусіў задумацца і пра яшчэ адну надзённую сёння праблему, пра якую нават і здагадацца не мог Напалеон Орда. Наспела выразная патрэба нейкім чынам сабраць у адным месцы (скажам, на адной вэб-старонцы) усе інвентары — ад афіцыйнага Дзяржспісу да згаданых ужо валанцёрскіх ініцыятыў. Бо на сёння просты карыстальнік можа ў гэтым лесе трошачкі разгубіцца.

К

Высокая зорка Перамогі і яе кветкі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Прыцягнуць моладзь да чытання беларускамоўных кніг і твораў айчынных аўтараў дапаможа мабільная кніжная экспазіцыя, арганізаваная ў рамках сумеснага з Саюзам пісьменнікаў Беларусі праекта "Буккросінг". Можна будзе наведаць унікальны перасоўны музей-бус, запрацуе фотастудыя пад адкрытым небам. З 15.30 стартуе маладзёжная творчая эстафета, падчас якой выступяць як групы, так і сольныя выканаўцы. Завершыцца фэст бітвай дзі-джэяў, дзе абавязковым патрабаваннем да канкурсантаў стала выкананне кампазіцый на тэму песень ваенных гадоў. На сцэне ж падтрымаюць выступоўцаў зоркі беларускай эстрады.

Нагадаем, святочныя мерапрыемствы ладзяцца ў Мінску на працягу ўсяго тыдня. Ужо з 3 мая ля галоўнага ўваходу ў Маладзёжны тэатры эстрады разгарнулася інтэрактыўная экспазіцыя. А 5 мая на яго сцэне адбылася тэматычная святочная праграма з удзелам папулярных выканаўцаў, выхаванцаў майстэрні эстраднага вакалу і Нацыянальнага цэнтра музычных мастацтваў імя Уладзіміра Мулявіна, шоу-тэатра Таццяны Пановай "Хвілінка" і артыстаў самога Тэатра эстрады.

У той жа дзень у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай айчыннай вайны падвялі вынікі патрыятычнага конкурсу музычных кліпаў "Песні ваенных гадоў", арганізаванага БРСМ. Цягам двух месяцаў у аргкамітэт было даслана больш за 40 роліка. Моладзь запрашала да здымак ветэранаў. Да праекта таксама далучыліся такія айчынныя выканаўцы, як Дарыя, Георгій Калдун, Дзядька Ваня і групы "Bycity", "Правакацыя" і "Напалі".

Сёлета сталічныя дызайнеры скарысталі новую палітру колераў пры аздабленні цэнтральных вуліц і праспектаў, дадалі ў паліграфічную прадукцыю выявы яблыневых кветак. З'явіліся аб'ёмныя канструкцыі са сцягаў, пілоны з неонавай падсветкай, 3D "9 Мая". Цікавасць выклікалі плакаты, падрыхтаваныя Беларускім тэлеграфным агенцтвам. На банерах побач з вядомымі прадстаўнікамі сфер культуры, спорту, медыцыны змешчаны фотаздымкі іх дзядоў, якія прынеслі краіне Перамогу. На мінскіх вуліцах можна пабачыць партрэты прымы Беларускага балета Ірыны Яромкінай і саліста айчыннай оперы Ілы Сільчукова, а таксама лідара гурта "J:Mors" Уладзіміра Пугача.

К



Фотафакт

4 мая пасля капітальнага рамонту зноў адчыніў свае дзверы Музей-лецішча Васіля Быкава ў аграгарадку Ждановічы-6. Фармат музея для нашай краіны новы: дача знакамітага народнага пісьменніка краіны сталася, па сутнасці, збіральным вобразам загараднага жыцця беларускай інтэлігенцыі. Падрабязна пра ўстанову — у наступных нумарах.

Фота Аліны САЎЧАНКА

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

Песня скрозь ураган агню

У Год культуры супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны Людміла Манкевіч, Іна Павераная, Алена Кудраўцава, Вольга Емяльянава, Уладзімір Павонскі і Венедзікт Білевіч падрыхтавалі зборнік вершаў і песень.

Лейтматывам жа выдання паслужыў верш "Толькі на фронце" вядомага савецкага паэта Васіля Лебедзева-Кумача. У зборніку творы размешчаны па гадах вайны, пачынаючы з верша Якуба Коласа "На абарону", прысвечанага першым трагічным дням Вялікай Айчыннай. Патрыятычны ўздым народу адлюстраваны ў творах Аляксея Суркова, Аляксандра Твардоўскага, Янкі Купалы, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка…

Нямала хвалюючых паэтычных радкоў прысвечана гераічным абаронцам Брэсцкай крэпасці. У кнігу увайшла, скажам, "Крэпасць над Бугам" народнага паэта краіны Петруся Броўкі. Побач — здымак знакамітага надпісу "Памрэм, але з крэпасці не сыдзем!", а таксама фотакадры музейных інсталяцый.

Асаблівасцю зборніку стаў цэлы раздзел, прысвечаны беларускім партызанам. Тут змешчаны вершы Міхаіла Ісакоўскага "Ой, туманы, мои растуманы…", Якуба Коласа "Бацьку Мінаю", Анатоля Астрэйкі "Партызанскі медаль", песні — "Партызанская барада", "Аршанская старонка", "Партызанская паходная" і іншыя. Завяршаецца падборка вершаў і песень карцінай беларускага мастака Яўгена Зайцава "Парад партызан у Мінску 16 ліпеня 1944 года", якая суправаджаецца словамі паэта Анатоля Вялюгіна.

Зборнік праілюстраваны здымкамі ветэранаў — удзельнікаў патрыятычных мерапрыемстваў з моладдзю: Герояў Савецкага Саюза Івана Кустава, Васіля Мічурына, франтавікоў Аляксандра Феня, Віктара Кастко, Аляксандра Ульяновіча, Васіля Даўжонка і іншых. Падзякай ад імя маладога пакалення гучыць песня "Пакланіцеся, унукі, дзеду!" кампазітара Ігара Лучанка і паэта Міхаіла Ясеня. Сапраўднымі гімнамі падаюцца вершы і песні, прысвечаныя Вялікай Перамозе. Іх падмацоўвае дакументальны здымак надпісу на сценах пераможанага рэйхстага "Тут быў беларус Ванікевіч". Фота зрабілі некалькі гадоў таму музейныя супрацоўнікі, калі наведалі германа-расійскі музей "Берлін-Карлсхорст".

Мікалай ШАЎЧЭНКА

Дыялог на колах

Дзіцячая школа выяўленчых мастацтваў горада Крычава зрабіла ўнёсак у святкаванне Дня Перамогі. 5 мая пры падтрымцы крычаўскага філіяла аўтобуснага парка № 3 "Магілёўаблаўтатранса" ў раённым цэнтры стартавала акцыя "Дыялог на колах".

Настаўнікі і навучэнцы згаданай школы наладзілі перасоўную выставу дзіцячай творчасці. Кожная з дзвюх экспазіцый (па 24 работы) размешчана ў салонах двух рэйсавых аўтобусаў, што курсіруюць па Крычаве. Паўсотні юных мастакоў мовай фарбаў і пачуццяў распавялі пра цяжар Вялікай Айчыннай вайны, подзвіг вызваліцеляў і светлы Дзень Перамогі.

Мэта перасоўных выстаў у тым, каб распачаць дыялог з жыхарамі горада і раёна, выклікаць у іх суперажыванне, гонар, патрыятызм. Дырэктар Крычаўскай дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў Міхаіл Гарбуноў перакананы: "Памяць пра вайну не павінна знікнуць. Таму наш мастацкі расповед пра вялікае свята і подзвіг нашага народа звернуты да кожнага. І мы павінны цаніць, што жывем пад мірным небам".

Выстава на колах ужо выклікала станоўчыя водгукі. І не толькі ў пасажыраў. Справа вось у чым: малюнкі размешчаны так, што іх можна бачыць і ў салоне транспарту, і звонку аўтобуса, і таму яны навідавоку ва ўсяго горада.

У салоне аўтобуса-галерэі.

Да слова, гэта не першая перасоўная выстава школы. Ладзілі яе ў рэйсавых аўтобусах і ў леташнім маі. Дзіцячыя работы адбіраліся па выніках раённага конкурсу плакатаў "Няхай заўжды будзе мір!" А напярэдадні мінулагодняга Міжнароднага дня абароны дзяцей стартавала акцыя "Чароўная вясёлка на аўтобусным акне". У школе дзякуюць крычаўскаму філіялу аўтобуснага парка № 3 за тое, што заўжды падтрымлівае ініцыятывы ўстановы.

Ганна САКОВІЧ,
настаўнік Дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў Крычава

Філарманічны калейдаскоп

У красавіку французскі Ліён упершыню вітаў Дзень беларускай культуры. У яго рамках адбыўся канцэрт ансамбля танца, музыкі і песні "Талака" Віцебскай абласной філармоніі.

Мерапрыемства было арганізавана асацыяцыяй беларусаў Ліёна "БелАрт", якім кіруе грамадзянка Беларусі Надзея Крывашанава, пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Францыі і Ганаровага консула Беларусі ў Ліёне Жана-Жака Ранка, а таксама пры фінансавай падтрымцы Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

У гастролях удзельнічалі ўсе тры групы ансамбля: харэаграфічная, аркестравая і вакальная. "Талака" прывезла гэтым разам толькі беларускія фальклор і сучасныя творы. Выканальніцкі талент беларускіх артыстаў, высокая якасць арыгінальных харэаграфічных пастановак мастацкага кіраўніка ансамбля Мікалая Падалякі выклікалі ў французскай публікі непадробнае захапленне. Гасцямі ж імпрэзы, паведамляе Пасольства нашай краіны ў Францыі, сталі больш за 300 гледачоў, сярод якіх французскія грамадзяне, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, супрацоўнікі Міжнароднай арганізацыі крымінальнай паліцыі (Інтэрпол), чыя штабкватэра знаходзіцца ў Ліёне, прадстаўнікі беларускай дыяспары.

Дарэчы, госці вечарыны змаглі пабачыць экспанаты з прыватнай калекцыі Пасла Беларусі ў Францыі, Пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры UNESCO Паўла Латушкі: 20 рушнікоў з розных рэгіёнаў Беларусі. Побач размясцілася экспазіцыя карцін беларускай мастачкі Наталлі Альховай.

Пасля Ліёна "Талака" завітала ў Парыж, дзе прымала ўдзел у адкрыцці І Беларускіх музычных сезонаў у Францыі. Утульная бібліятэка — традыцыйнае месца правядзення культурных мерапрыемстваў у Пасольстве — з цяжкасцю здолела ўмясціць усіх гледачоў. Тут ансамбль прадставіў акрамя традыцыйнага фальклору кампазіцыі "Ой, кума" і "Ля замкавай гары", прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння народнага артыста Беларусі, народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна. Напрыканцы мерапрыемства Мікалаю Падаляку была ўручана падзяка ад Пасольства.

Ірына ШАГАЛЕЕВА; ул.інф.

правам

выкладваюць для сваіх вучняў нотны матэрыял, спасылкі на фільмы, відэафайлы, якія, на іх думку, дапамогуць у адукацыйным працэсе.

— Так, задавалася б, выкладчык мае добрую мэту. Напрыклад, настаўнік музычнай школы ці каледжа размяшчае на "сцяне" набор файлаў, як узорныя прыклады выканання музычнага твору. Ён робіць гэта ў межах удасканалення адукацыйнага працэсу, бо, на першы погляд, дае магчымасць навучэнцам трэніравацца на прыкладзе лепшых выканаўцаў. Аднак праблема ў тым, што сацыяльная сетка не абмяжоўвае доступ да прафайла пэўнага чалавека.

У вучэбнай аўдыторыі выкарыстанне аб'ектаў аўтарскага права строга лімітаванае і абмежаванае, бо разлічана на вузкае кола асоб (навучэнцаў). Тут зразумелы адукацыйны чыннік, таму дазволена выкарыстанне твораў без выплаты ўзнагароджання аўтару. У сацыяльнай сетцы доступ да старонкі не мае гэтага ж жорстка прывязанага адукацыйнага кірунку, па сутнасці адбываецца выкарыстанне твораў, якія пры іншых роўных падлягаюць ліцэнзаванню. А калі ліцэнзіі на размяшчэнне кантэнта няма — парушэнне закону відавочнае.

Любы далёкі ад навучальнага працэсу карыстальнік можа зайсці на вашу старонку. Калі ён "лайкне" вашу спасылку, піратскі кантэнт адлюструецца ўжо на яго асабістай старонцы, дзе яго зможа пабачыць новае кола карыстальнікаў Сеціва. Такім чынам адбываецца распаўсюджванне кантрафактнага матэрыялу, а настаўнік становіцца тым, хто адкрывае доступ да яго шырокай публіцы. Дарэчы, размяшчэнне відэаматэрыялаў закранае вельмі шырокае кола зацікаўленых асоб: аўтары музычнага твору, выканаўцы, вытворцы відэакліпа… Адпаведна, узрастае верагоднасць таго, што хтосьці заўважыць ваша самавольства і прад'явіць законныя патрабаванні.

Пакуль такіх прэцэдэнтаў на тэрыторыі нашай краіны не было. Але прыгадайце сітуацыю ў суседзяў, калі настаўнік невялічкага заўральскага гарадка ўстанавіў неліцэнзаваную аперацыйную сістэму на школьныя камп'ютары, а вядомая IT-карпарацыя падала на яго ў суд і, натуральна, выйграла справу. Многім цікава, як фірма выйшла на гэтага настаўніка… Маючы шматлікія інтэрнэт-рэсурсы, знайсці парушальніка аўтарскіх правоў сёння не так складана. Нават у найпростым пошукавіку ўвядзіце назву песні — і Сеціва выдае спіс аж да пераліку старонак сацсетак, дзе змешчана патрбная кампазіцыя.

К

"Лічбавы" падыход

Тэндар тэндару не таварыш?

Моднае слова "тэндар" даўно на слыху не толькі ў бізнесменаў, але і ў арганізацыях дзяржаўнай формы ўласнасці, у тым ліку — і сферы культуры. Менавіта праз тэндары сёння праводзяцца закупкі новых музычных інструментаў для школ мастацтваў, гукаўзмацняльнай і асвятляльнай апаратуры для Дамоў культуры, камп'ютарнага абсталявання для музеяў і многае іншае. А цяпер як у беларускіх, так і ў замежных кампаній з'явілася магчымасць паўдзельнічаць у тэндарах па арганізацыі фестываляў і культурных імпрэз.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Напрыклад, днямі Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама абвесціла тэндар на арганізацыю і правядзенне XIX Міжнароднага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік", які плануецца правесці ў Паставах з 10 па 12 чэрвеня. Арыенціровачны кошт закупкі, згодна з дакументамі тэндара, складае 230 мільёнаў рублёў, прычым 80 мільёнаў прадастаўляецца рэспубліканскім бюджэтам, а 150 мільёнаў — абласным.

Згодна з палажэннем, жыхароў і гасцей горада падчас культурнай дзеі чакаюць літаратурнае свята і канцэрт аднаго з замежных калектываў, конкурс "Хто каго?", канцэрт класічнай музыкі ў мясцовым касцёле ды гала-канцэрт удзельнікаў форуму. Таксама ў фестывальныя дні можна будзе наведаць горад майстроў і сельскія падворкі раёна. На свята павінны прыехаць самадзейныя артысты і калектывы з Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны і Эстоніі.

Натуральна, раней фэст у Паставах ладзіўся сіламі супрацоўнікаў аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама пры падтрымцы Міністэрства культуры і абласнога ўпраўлення. Цяпер жа, як вынікае, любая прыватная арганізацыя, здольная ладзіць падобныя мерапрыемствы, можа выйграць тэндар і зладзіць фэст пасвойму і з не меншым размахам.

Названая практыка, як распавяла "К" намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Ларыса Аленская, распаўсюджваецца з пачатку гэтага года на ўсе маштабныя мерапрыемствы як міжнароднага, так і мясцовага маштабу. "Натуральна, пры адборы прэтэндэнтаў мы будзем улічваць пэўныя крытэрыі, — кажа суразмоўца. — Але пэўная насцярога ў нас прысутнічае: з аднаго боку, мы можам зэканоміць немалыя фінансавыя і чалавечыя рэсурсы, а з іншага, цалкам магчымая і такая сітуацыя, калі прыватнік ці прыватная ж арганізацыя проста не змогуць забяспечыць правядзенне фестываляў і святаў на належным, высокім узроўні".

З гэтай думкай згодны і намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Тадэвуш Стружэцкі. Па ягоных словах, калі практыка правядзення тэндараў пры набыцці музычных інструментаў ці абсталявання для Дамоў культуры цалкам сябе апраўдвае, дык з фестывалямі гэта не так. "Справа ў тым, што ўзяць на сябе ўсе арганізацыйныя клопаты па правядзенні фестывалю не так проста. Трэба ведаць фестывальную "кухню", валодаць усімі арганізацыйнымі пытаннямі на прафесійным узроўні. Ды і хто можа лепш правесці той жа фестываль "Берагіня", як не мясцовы Акцябрскі райвыканкам?"

Між тым, лічыць Тадэвуш Стружэцкі, практыка правядзення тэндараў можа прывесці да пэўных праблем пры арганізацыі культурных мерапрыемстваў. "Цяпер тэндар можа выйграць любая арганізацыя, якая прапануе зладзіць фэст ці майстар-клас за меншыя грошы. Але ці справіцца прыватнік з гэтай працай? Прыгадваю, што некалькі гадоў таму пад патранатам Саюзнай дзяржавы ў Маскве ладзіліся майстар-класы па выканальніцкім мастацтве. Аднойчы тэндар на іх правядзенне выйграла прыватная фірма — і не змагла забяспечыць усе арганізацыйныя моманты для правядзення культурнай дзеі. У выніку, майстар-клас у тым годзе быў адменены. Не выключаю, што такая сітуацыя можа паўтарыцца і ў Беларусі. Таму адбіраць тых, хто прыме ўдзел у падобных тэндарах, трэба, на маю думку, асабліва пільна".

Пра праблемы ў гэтым плане казала "К" і намеснік начальніка ўпраўлення культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Інга Заўгародняя. На прэс-канферэнцыі "Развіццё фестывальнага руху ў рэгіёнах", якая адбылася ў Прэс-цэнтры сталічнага Дома прэсы, яна адзначыла, што вызначыць пэўныя крытэрыі па арганізацыі святаў і фестываляў сёння даволі складана. "Фестываль — гэта жывое дзейства, якое не можа быць цалкам рэгламентавана, — пераканана яна. — Таму пытанняў у гэтым плане вельмі шмат, а ў такіх тэндарах трэба абавязкова прапісваць канкрэтныя тэрміны выканання тых або іншых мерапрыемстваў ці тэхнічных заданняў".

Як адзначыў "К" кансультант упраўлення устаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Іван Галабурда, поўнасцю рэгламентаваць творчы працэс, на яго погляд, будзе проста немагчыма. "Тут, у першую чаргу, трэба казаць пра традыцыі таго ці іншага фестывалю, якія больш вядомыя мясцовым культработнікам і, натуральна, менавіта яны і будуць гэтыя традыцыі захоўваць і прапагандаваць. А вось, напрыклад, пытанні арганізацыі харчавання, пражывання, праезду ўдзельнікаў і гасцей могуць браць на сябе па тэндарах камерцыйныя структуры. Скажам, падчас Рэспубліканскага фестывалю народнага гумару ў Аўцюках, рассяленнем турыстаў займаюцца не толькі гасцінічныя комплексы ў Калінкавічах, але і ў Мазыры.".

Як бачна, "творчыя" тэндары ў Беларусі на правядзенне фестываляў хоць і аб'яўляюцца, але пакуль што застаюцца, так бы мовіць, "манапалізаваныя" супрацоўнікамі сферы культуры. Іншая справа, ці доўга гэта працягнецца? Цалкам магчыма, што ў будучым канкурэнцыя ўзрасце: што ні кажы, а сотні мільёнаў рублёў — неблагая сума для любога прыватніка ці прыватнай арганізацыі, якія займаюцца арганізацыяй святочных мерапрыемстваў.

К

З рэдакцыйнага савета "К"

Эканомія, баланс, аптымізацыя

Пра пытанні, кроплю і камень

Ёсць рэчы ды з'явы, якія немагчыма асэнсаваць. Не зважаючы на гэта, чалавек заўжды і ва ўсім імкнецца адшукаць сэнс, нават калі яго няма. Так, напэўна, уладкаваны свет. Але досыць філасофствавання. На чарговым рэдакцыйным савеце мы пастараліся асэнсаваць самыя балючыя кропкі сённяшняга культурнага развіцця. Атрымалася ці не, меркаваць чытачу.

Яўген РАГІН

Гэтым разам рэдакцыі "К" дапамагалі першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рагачоўскага райвыканкама Міхаіл ЗАЙЦАЎ, дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы і старшыня Рэспубліканскага савета дырэктараў абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці Алег ХМЯЛЬКОЎ.

Пазабюджэт

Пра што гавораць практыкі, калі абмяркоўваюць улюбёную справу? Так, пра тое, што замінае, што перашкаджае даць на выхадзе прыгожы якасны вынік. Гаворка пры пытанні, якія варта неадкладна вырашыць, але адразу не атрымліваецца. Уражанне такое, што праблемы на культурнай дзялянцы невынішчальныя, нібы падступны каларадскі жук. Узяць хаця б пазабюджэтную дзейнасць. Ці ўлічваецца пры "вёрстцы" плана па аказанні культурных паслуг рэальная дэмаграфічная сітуацыя ў раёнах і на сяле? Практыка паказвае, што, мякка кажучы, не вельмі. Больш за тое, пазабюджэтныя планы для раённых аддзелаў па абласцях значна адрозніваюцца. І ці можа быць заданне па пазабюджэтнай дзейнасці загадзя невыканальным? Калі так, дык губляецца стымул для такога звышнапружанага нарошчвання тэмпаў камерцыялізацыі. Каму карысць ад дадзенай сітуацыі?

Пойдзем далей. Плата за навучанне дзяцей у ДШМ не выкарыстоўваецца для патрэб аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. Калі казаць больш канкрэтна, не ідзе на матэрыяльнае стымуляванне педагогаў і паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

З эканоміі фонду заработнай платы раней можна было выкарыстоўваць сродкі для ўмацавання матэрыяльнай базы, на матэрыяльнае стымуляванне. Цяпер такой магчымасці няма.

Сёння мы кажам пра аптымізацыю ў сферы культуры як пра меру вымушаную ды ўсеагульна карысную. Цяжка не пагадзіцца. Але пры той умове, што выпрацоўваецца сапраўды аптымальны эканамічны механізм далейшага развіцця нацыянальнай культуры. Інакш установы культуры ў нас застануцца толькі ў буйных гарадах. Як тады план пазабюджэтнай дзейнасці выконваць?

Аптымізацыя

Аптымізацыя сеткі ўстаноў культуры працягваецца. Хоць у асобных раёнах ужо амаль няма чаго аптымізаваць. Няўжо неўзабаве будзем скарачаць ўстановы культуры ў аграгарадках? А Беларусь тым і славілася на постсавецкай культурнай прасторы, што, нягледзячы на самыя розныя сацыяльныя пераструсы, здолела захаваць разгалінаваную, а таму дзейсную сетку бібліятэк і клубаў. Адзіны аргумент на карысць яе далейшага скасавання ў тым, што сельскія бібліятэкі і клубы наведваюць цяпер лічаныя ахвотныя. Маўляў, усё кампенсуецца пашырэннем парку мабільных устаноў, і няма чаго пускаць на вецер грошы. Калі такое меркаванне існуе, для яго ёсць падставы.

Ці патрапяць пад аптымізацыю абласныя метадычныя цэнтры? Ёсць тут некалькі меркаванняў. Адно з іх у тым, што скарачаць згаданыя цэнтры немэтазгодна, бо яны — творчы, так бы мовіць, каталізатар раённых аддзелаў і, лічы, адзіны абагульняльнік станоўчага досведу. Але пры належным прафесійным узроўні раённых кадраў не існуе праблем з падрыхтоўкай сцэнарыя ці з пастановачнай яго рэалізацыяй, а для абагульнення досведу хопіць і штоквартальнай онлайн-канферэнцыі... Іншая справа, што абласны метадычны цэнтр павінен аналізаваць сённяшнюю і прагназаваць-накіроўваць сітуацыю заўтрашнюю. Найперш маюцца на ўвазе захады маніторынгавыя ды маркетынгавыя для дакладнага вызначэння мэтавай аўдыторыі.

І яшчэ адзін праблемны момант, звязаны з аптымізацыяй устаноў культуры ў аддаленых паселішчах. Ну, не прадаюцца будынкі скасаваных сельскіх клубаў ды бібліятэк з аукцыёна! А пускаць іх на будматэрыялы ў пэўных выпадках проста не па-гаспадарску. Дык мо перадаваць такія, яшчэ не надта лядашчыя, будынкі на балансы сельскіх саветаў? Будзе, прынамсі, дзе збіраць людзей пад час "прывазных" канцэртаў ці планавага візіту прадстаўнікоў улады. Такія "сацыяльныя цэнтры" могуць быць куставымі. Зразумела толькі адно: у заняпадзе застануцца гэтыя будынкі — знікне ў вёсцы і грамадскае жыццё.

Штатны расклад

Па школах мастацтваў штатны расклад, быццам, мяркуецца змяняць. А па іншых установах культуры? Гэтае пытанне чуецца адусюль. Як, дарэчы, і праблема начных дыскатэк для непаўналетніх.

Усе разумеюць, што тут мяняць штосьці трэба, а сітуацыя з мёртвай кропкі ўсё не зрушыцца. Няўжо міжведамасная няўзгодненасць замінае? Між тым, з "фінансістамі" (і не толькі) трэба вучыцца сябраваць.

Аплата працы і...

Што яшчэ было вынесена на агульнае абмеркаванне рэдакцыйнага савета? Натуральна — актуальныя на сёння пытанні аплаты працы. Да прыкладу, варта перагледзець групы па аплаце працы работнікаў клубных устаноў. На сёння ёсць толькі два паказчыкі: "клубныя фарміраванні" ды "дасугавыя формы". Няма матывацыі для павышэння прафесійнай кваліфікацыі.

Тое ж тычыцца і груп па аплаце працы работнікаў устаноў новай тыпалогіі (сельскі дом народнай творчасці, сельскі дом традыцыйнай культуры, музеі народнай славы...). Яны адносяцца да трэцяй групы аплаты працы і не ўлічваюць колькасць клубных фарміраванняў. У малых гарадах нерэальна перайсці з ніжэйшай чацвёртай групы на трэцюю. У музеях, да прыкладу, для гэтага не хапае ні экспанатаў, ні наведвальнікаў.

...матэрыяльнае стымуляванне

Ёсць пытанне з аказаннем матэрыяльнай дапамогі і выплатай прэміяльных кіраўнікам падведамасных устаноў раённага звяна на ўзроўні гаспадарчай групы, цэнтралізаванай бухгалтэрыі. Гэтыя кіраўнікі працуюць на "голым" акладзе. Дадаць тут штосьці цяжка. Адназначна толькі адно, гаспадарчыя групы сям-там працуюць адно толькі на энтузіязме. А кіраўнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі робіць усё магчымае і немагчымае для хоць нейкага матэрыяльнага стымулявання названых работнікаў. Да першай праверкі. І ўвогуле, начальнік раённай культуры часам нагадвае факіра, які імкнецца ўвязаць у адно яву і мару, напінаецца і разавыя дыскатэкі рэгулярна ладзіць, і новыя штатныя расклады на раённым узроўні "прабіць". Іншым разам нават і атрымліваецца.

Навука і практыка

Пасля аб'яднання культурнай і ідэалагічнай сфер прайшоў ладны час. Але і па сёння адчуваецца пэўная адасобленасць ідэолагаў ад работнікаў культуры. Нават на абласных нарадах яны збіраюцца ў асобныя купкі. Як іх паяднаць? Слушна заўважыў адзін з дасведчаных работнікаў культуры: "Нас трэба вучыць: максімальна выкарыстоўваць магчымасці мясцовага самакіравання, аб'ядноўваць структурныя аддзелаўскія намаганні, зарабляць пазабюджэтныя грошы, працаваць са спонсарамі, "выбіваць" гранты, займацца праектнай ды гаспадарчай дзейнасцю для таго, каб і закон не парушыць, фінансавых парушэнняў не дапусціць, і карысць для сябе атрымаць". Залатыя словы!

Тут, напэўна, толькі адно нельга з-пад увагі выпусціць: каб тэорыя з практыкай не разыходзілася. Да каго гэта пажаданне? Да раённых і абласных метадыстаў, да супрацоўнікаў Інстытута культуры Беларусі. Для таго, каб вучыць, таксама варта вучыцца.

"Культура" і культура

Нас, журналістаў "К", часта крытыкуюць за тое, што праблемы ўзнімаем стала, а вось паспрыяць іх вырашэнню — амаль не здатныя. Слушна. Аднак ёсць і іншыя прыклады. І гэтая публікацыя — як кропля ў моры. Аднак крыху заспакойвае тое, што менавіта кропля камень точыць.

К

Юбілей як нагода

Аляксандр ГРЫГОР'ЕЎ,
дырэктар Беларускага тэатра "Лялька" (Віцебск)

Днямі наш тэатр справіў 30-годдзе. Юбілей — цудоўная нагода для дадатковай папулярызацыі калектыву, і мы паспрабавалі гэта скарыстаць. Дый самі ўрачыстасці-ўшанаванні хацелася правесці неяк нешарагова, запамінальна, крэатыўна.

Уласна святочная вечарына прайшла ў форме капусніка на тры гадзіны. Але час праляцеў незаўважна. Было шмат віншаванняў — і са сцэны, і дасланых па пошце, у тым ліку з Расіі, Сербіі, ад іншых замежных калег. Больш за 30 узнагарод. У прыватнасці, артысты Ларыса Мартынава і Аляксей Макарскі атрымалі нагрудныя знакі Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі".

Нягледзячы на халаднаватае надвор'е, свята пачыналася з вуліцы: там іграў духавы аркестр, потым выступілі нашы маладыя артысты, якія засвоілі хадулі. У час "Славянскага базару ў Віцебску" на пляцоўцы перад тэатрам выступалі запрошаныя ўдзельнікі народнага маладзёжнага тэатра "Колесо", якія добра валодаюць рознымі тэхнікамі вулічных паказаў. А мы чым горшыя? Набылі шэсць пар хадуляў, пашылі спецыяльныя касцюмы — і цяпер наша моладзь у самым прамым сэнсе слова "ўзрасла".

Што жа творчага росту, дык зусім невыпадкова са святочнай праграмай да нас прыязджаў гурт "Сярэбранае вяселле". Ягоны лідар Святлана Бень калісьці пачынала менавіта ў нашым тэатры — бутафорам. Дый свой дыпломны спектакль у нас ставіла — "Асцярожна, Соня!", ён і дагэтуль у рэпертуары. Нядаўна яна стала рэжысёрам яшчэ аднаго нашага спектакля "Лялькі" — "Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам". Хочам, каб у хуткім часе паставіла яна і штосьці яшчэ.

Шыкоўны падарунак зрабіў нам Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Там адкрылася выстава "Беларускаму тэатру "Лялька" — 30 гадоў". Там можна пазнаёміцца са сцэнаграфіяй і касцюмамі (у эскізах і канчатковым выглядзе) многіх нашых спектакляў, а таксама ўбачыць знакамітую магілёўскую батлейку XIX стагоддзя, рэканструяваную мастаком Аляксандрам Сідаравым. Такая сумесная акцыя (а мы даўно з музеем супрацоўнічаем) — як дадатковы "напамін" пра наш тэатр, куды можна скіравацца адразу пасля музея, тым больш што і адлегласць — хвіліна хады.

Ездзіць па школах, як гэта робяць дзеля выканання плану многія тэатры, — не наша традыцыя. Але напярэдадні юбілею мы яе парушылі. У адным з так званых "спальных" мікрараёнаў на ўскрайку горада ёсць новая школа з вельмі добрай залай. Чаму б не скарыстацца выпадкам і не пратэставаць яе? І мы павезлі туды "Ямелева шчасце". Дзеці і выкладчыкі былі ў захапленні! Бо акрамя ўласна спектакля яны сустрэліся з артыстамі, паўдзельнічалі ў віктарыне — і пабеглі прасіць бацькоў, каб тыя звадзілі іх на іншыя нашы спектаклі. Дарэчы, сямейныя прагляды — вельмі актуальная на сёння форма, і мы імкнемся зрабіць яе нормай для віцябчан.

Колькі часу таму на нашым сайце з'явіўся відэапраект "Лялька-live". Выйшлі ўжо два яго выпускі, дзе мы зазіралі ў закуліссе, на рэпетыцыі, у жартоўна-прыгодніцкім жанры шукалі месцазнаходжанне тэатра. Праводзілі мы і модны цяпер флэш-моб: дзеці і іх бацькі фатаграфавалі лялек у акенцах кватэр, машын, вітрын, казачных дамкоў, а ў якасці прызоў атрымлівалі запрашальнікі ў тэатр.

Увогуле, апошнім часам імкнемся усё больш "выходзіць у народ". На сёлетнім "Славянскім базары…" наш "Лялечны квартал" не толькі захаваецца, але і пашырыцца, з'яднаўшыся з праектам вулічных тэатраў "На сямі вятрах". Бо некаторыя спектаклі тэатраў лялек з Палтавы, Кіева будуць паказвацца на адкрытым паветры, з інтэрактывам. Сімвалічна, што квіткі на спектаклі "Лялечнага квартала" пачалі распаўсюджваць акурат у дзень нашага юбілею. 30-годдзе — нагода для далейшых творчых заваёў. Адразу пасля святкаванняў мастацкі кіраўнік тэатра Віктар Клімчук рушыў на фестываль у Белгарад. У Мінску на IX Міжнародным фестывалі тэатраў лялек у маі мы пакажам "Спакушэнне" паводле апавядання Антона Чэхава "Чорны манах". Так што з юбілеем усё не толькі не заканчваецца, а, наадварот, пачынаецца і працягваецца.

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Прыватная археалогія

Рыгор СІТНІЦА,
мастак, паэт, старшыня Беларускага саюза мастакоў

Я прэзентаваў гэтымі днямі арт-праект "Прыватная археалогія". Задумаў яго яшчэ ў 2009-м, калі Беларускі саюз мастакоў рыхтаваў выставу "Міленіум", прысвечаную 1000-годдзю гістарычнай Літвы. Да гэтай выставы я падрыхтаваў тры творы, у якіх зрабіў мастацкую рэканструкцыю велікакняжацкіх пячатак як сімвалаў нашай старажытнай дзяржаўнай улады.

Даследуючы гістарычныя артэфакты, я імкнуўся, каб дакументальны матэрыял, захоўваючы сваю гіперрэалістычную дакументальнасць, набыў рысы сучаснага арт-аб'екта, адпаведнага найноўшым прынцыпам сённяшняй пластычнай мовы. Для рэалізацыі задумы я не толькі трымаўся прынцыпаў уласнай мастацкай стылістыкі, але і паспрабаваў радыкалізаваць іх. Раней для мяне прынцыповым было выкарастанне элементаў канструктывізму ў пабудове кампазіцыі ды спалучэнне іх з амаль гіперрэалістычнай трактоўкай формы. У творах з пячаткамі паспрабаваў выкарыстаць элементы супрэматызму — круг, дыяганаль, — захоўваючы максімальна падрабязную дакументальнасць аб'екта ды імкнучыся надаць яму рысы вобраза, сімвала, знака.

Працяг тэмы адбыўся падчас рэалізацыі мастацкай выставы да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Рэшткі старой зброі ды вайсковага рыштунку для мяне маюць не толькі гістарычную вартасць, але і высокі эстэтычны кшталт, які сёння таксама ўспрымаецца як знак і сімвал.

Асобныя часткі праекта гледачы маглі бачыць на розных выставах, але сёлета серыя твораў, давершаная чатырма новымі працамі, займела аблічча цэльнага выказвання, якое хаця і мае выгляд завершанага, але ж наўрад ці закончанае насамрэч. Зважаючы, што ў нацыянальнай гісторыі безліч артэфактаў, якія патрабуюць новага прафесійнага мастацкага погляду, цалкам уяўляю працяг гэтага творчага сумоўя з нашай вялікай і шматлікай гістарычнай спадчынай.

Сёлета ў сакавіку арт-праект "Прыватная археалогія" быў экспанаваны ў Маскве на пляцоўках Цэнтральнага дома мастака. І скажу без перабольшання — меў поспех, нават мяркуючы па вялікай колькасці гледачоў, прафесійных мастакоў-калег і арткрытыкаў. Цяпер я з радасцю дзялюся гэтым сваім праектам з наведвальнікамі Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў — на пляцоўцы Музея сучаснага выяўленчага мастацтва. І мне было вельмі прыемна, што на вернісаж маёй выставы 3 мая прыйшло столькі людзей, сярод якіх і калегі-аднадумцы, і мастацтвазнаўцы, і журналісты, і пісьменнікі, і проста незнаёмыя мне гледачы. Значыць, на шчасце, камусьці патрэбна наша беларускае мастацтва, значыць, наша ўнікальная спадчына не пакідае абыякавым майго сучасніка. А гэта, думаю, дарагога каштуе… Яшчэ раз падкрэслю, што асабіста для мяне галоўнае ў мастацтве (было і ёсць) — спавяданне нацыянальных святынь, нацыянальных каштоўнасцяў, і змяняць свае прыярытэты і арыенціры ў гэтым кірунку не збіраюся…

Занатаваў Барыс КРЭПАК

Што дадаць у напрацаваны пласт?

Аляксандр ШАППО,
скульптар

Тэма вайны не знікла ў сучасным айчынным мастацтве. Яна застаецца актуальнай і зараз. Іншая справа, што патрабуецца іншае яе прачытанне.

Скажам, нядаўна праводзіў сустрэчу ў Цэнтры тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі "Зорка" (арганізатар падзеі — метадыст Валянціна Яргольская). Зразумела, сёння цяжка запрасіць ветэранаў на падобныя імпрэзы, але ёсць магчымасць сустрэцца з тымі ж скульптарамі, якія прымалі ўдзел у стварэнні помнікаў на ваенную тэматыку. Вось і я распавёў навучэнцам пра свой досвед, пра пленэры, сімпозіумы, дзе прымаў удзел. Важна данесці сваё разуменне свету, бачанне — шчыра і праўдзіва. Толькі такім чынам зацікавім моладзь. Дзіцячая аўдыторыя самая складаная. Вось я гадаваўся на фільмах пра Вялікую Айчынную — "Яны змагаліся за Радзіму", "Вызваленне", "Жывыя і мёртвыя". І наогул: калі хочаце, каб змянілася свядомасць у людзей — прапануйце альтэрнатыўную "карцінку" ў дзяцінстве. Зараз жа для большасці школьнікаў героі — Спайдармэн, Бэтмэн, Жалезны чалавек…

У кожнай тэме, асабліва ваеннай, патрэбен асабісты складнік. Скажам, падчас вайны пазнаёміліся мае дзед (ваяваў у партызанскім атрадзе) і бабуля, якая вызваляла Мінск. Ці работа Осіпа Цадкіна "Разбураны горад". На мой погляд, гэта адна з найвялікшых рэчаў на ваенную тэму ў XX стагоддзі, вельмі дакладная метафара вайны. І прыйшоў жа Цадкін да гэтай скульптуры ва ўзросце 60 гадоў. Кажу гэта таму, што важна тэму "правесці" праз сябе.

Распавёў я навучэнцам і пра мінскі мемарыял "Памяць", і пра помнік савецкім ваеннапалонным у Бабруйску на месцы, дзе знаходзіўся лагер для іх. Памятаю, як на адкрыццё тамтэйшага помніка "Куб мужнасці і смутку" прыехалі жанчыны з Расіі, даведаўшыся, што іх родзічы загінулі на гэтай зямлі.

Мне пашчасціла на сваім шляху сустрэць архітэктара Леаніда Левіна — аднаго з аўтараў "Хатыні", "Ямы", мемарыяла ў Чырвоным Беразе. Як на маю думку, акурат гэтыя аб'екты самыя шчымлівыя і, разам з тым, паэтычныя помнікі на тэму вайны. Дык вось, Леанід Мендзелевіч запрасіў мяне ў якасці скульптара прыняць удзел у праекце па рэканструкцыі брацкай магілы "Памяць", што на праспекце Дзяржынскага. Разам з тым, у пасляваенны час нярэдка ставілі бетонныя тыпавыя скульптуры на брацкіх магілах салдатаў і на месцах баявых дзеянняў — не было магчымасці аддаць належнае кожнаму з загінулых, на жаль.

У дачыненні ж да арганізацыі гарадской прасторы ёсць думкі стварыць на Камсамольскім возеры парк скульптур з разнымі пластычнымі рэчамі: з умоўнымі, абстрактнымі, але і рэалістычнымі скульптурамі. Прычым не толькі беларускіх аўтараў. У нас ёсць падобнага кшталту пляцоўкі, але яны не рэкламуюцца. Напрыклад, да мяне з Масквы прыязджалі знаёмыя, я іх вадзіў у музей валуноў. І тое месца ім вельмі спадабалася! Урэшце, Мінск паступова эвалюцыянуе, набірае адпаведны сталічнаму статусу "лоск". Так, падчас навучання ў гімназіі-каледжы імя Івана Ахрэмчыка я і прадставіць не мог, што на плоце парка Чалюскінцаў калі-небудзь развесяць рэпрадукцыі палотнаў альбо на плошчы Якуба Коласа магчымы праект "Мастак і горад".

І яшчэ. Наша краіна павінна мець праграму, стратэгію для развіцця культуры не на адзін год наперад. Каб гэтым пачалі займацца яшчэ ў 1990-я, то сёння існавала б пэўная тэматычная пляцоўка па той жа субкультуры. У Верхнім горадзе ёсць "канцэнтрацыя" твораў ("Каляска губернатара" Уладзіміра Жбанава, "Войт" Сяргея Аганава, "Гарадскія вагі" Аляксандра Прохарава, лаўка, прысвечаная Міхалу Клеафасу Агінскаму аўтарства Уладзіміра Мацкевіча…). А гэта цэлы напрацаваны пласт! Прычым усе скульптуры звязаны з гісторыяй і культурай Беларусі.

Занатавала Вольга РОПАТ

Дзяжурны па нумары

"Гоп" ужо сказалі…

Пра набалелае, напэўна, для многіх журналістаў. Добра, калі мерапрыемства/праект/выстава адбыліся. І можна з чагосьці зыходзіць — аналізаваць, параўноўваць, прыслухацца да сябе, сваіх адчуванняў і ўражанняў. А калі падзея знаходзіцца на стадыі падрыхтоўкі? Чаму нельга даведацца пра нейкія моманты, якія зацікавяць чытачоў — патэнцыйных наведвальнікаў? Тым больш, калі ладны кавалак інфармацыі ўжо "прасачыўся" ў Сеціва…

Вольга РОПАТ

Нядаўна патрапіла ў наступную сітуацыю: даведалася, што ў адным з рэгіянальных музеяў адбудзецца мерапрыемства. Даведалася, канешне, праз той самы Інтэрнэт. Тэлефаную ў музей: так, падрыхтоўка знаходзіцца на стадыі завяршэння — застаюцца апошнія штрыхі. Але на мае пытанні не захацелі адказваць, маўляў, не кажы "гоп"… Але ж "гоп" ужо сказалі — прычым самі супрацоўнікі і не аднаму СМІ. Калі ў пошукавіку напісаць ключавыя словы, дык спасылак пяць можна знайсці на гэтую падзею і сёння…

Сказанае/напісанае — гнуткі матэрыял, што імгненна перабіраецца ў віртуальную прастору. А калі інфармацыя ўжо там — яе не вярнуць. Дык чаму б не скарыстацца падобнай магчымасцю і не прапіярыць сваю ўстанову яшчэ больш? Такой "нягнуткасці", мяркую, не толькі мне, але і ўсім маладым ды больш сталым калегам па журналісцкай сферы не зразумець.

І яшчэ. Падаецца, што журналістыку ў шэрагу ўстаноў культуры блытаюць са сферай абслугоўвання. Журналістыка ж, як і мастацкая крытыка, існуюць не толькі, каб паведаміць пра падзеі тэлеграфным стылем, але і каб "падправіць", "скіраваць", "падказаць" грамадству наогул або пэўнаму творцу. Карацей, дапамагаць. (Гэтаму, урэшце, доказам айчынная блогасфера і сацыяльныя медыя з іх неверагоднай актыўнасцю.) Ды, на жаль, многае грамадствам успрымаецца "ў штыкі": хочацца прачытаць пра сябе толькі тое, што можна з гонарам паказаць сябрам, дзецям, унукам… Без уліку балансу, што можа быць не толькі са знакам "плюс", але і з тлустым "мінусам". Прычым, "мінус" часам — відавочны. Разам з тым, напрыклад, праца арт-журналістаў — не толькі ў тым, каб пахваліць або "разнесці". Але крытычны матэрыял апрыёры выклікае пытанні: напісалі мала — і ўражанні, а хочацца аналітыкі — у вас жа крытыка. Агульны ж назоўнік гэтага "дробу" — чаму нас не пахвалілі?..

К

Будзем на сувязі!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

Тактыка культурнага развіцця

Што можа бібліятэка

Звычайна народную творчасць на месцах развіваюць і пашыраюць цэнтры рамёстваў. А вось у вёсцы Брольнікі, што ў Навагрудскім раёне, гэты абавязак узяла на сябе бібліятэка. Праўда, на новы лад.

У справе эстэтычнага выхавання многае залежыць ад асобы бібліятэкара, ад яго арганізатарскіх здольнасцей. У Брольніцкай сельскай бібліятэцы менавіта бібліятэкар узначальвае клуб па інтарэсах "Народны майстар". Клубу сёлета споўнілася 20 гадоў. Спачатку яго ўзначальвала Надзея Зайцава. Дзеці тады займаліся вязаннем сурвэтак, шыццём мяккіх цацак, разеткавай, рапортнай і сіметрычнай выцінанкай. Ніхто клуб не фінансаваў, усе матэрыялы бібліятэкар і дзеці куплялі за свае грошы. Запомніўся вялікі поспех клубнай выставы на рэспубліканскім свяце з нагоды 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча (у 1998 годзе). Замежныя госці з задавальненнем набывалі зробленае рукамі майстроў з Брольнікаў.

Кола відаў прыкладной творчасці, якім займаўся клуб па інтарэсах, пашырыла новы бібліятэкар Алена Казак. Фірменным стылем "Народнага майстра" сталі вырабы з пластыку і салёнага цеста, пляценне з саломкі, вышыўка стужкай, контурная вышыўка, канзашы, тапіарый, энкаўстыка, квілінг.

Канзашы — жаночыя ўпрыгожванні для валасоў, у Японіі іх робяць з драўніны, самшыта, сакуры, магноліі і пакрываюць лакам. Майстрыхі ж з Брольнікаў канзашы робяць з шаўковай стужкі. А квілінг — мастацтва вырабу плоскіх або аб'ёмных кампазіцый са скручаных у спіралькі доўгіх і вузкіх палосак паперы. Атрымліваюцца модулі. Яны і з'яўляюцца "будаўнічым" матэрыялам для стварэння карцін, паштовак, альбомаў, рамак для фатаграфій, розных фігурак, біжутэрыі… Тапіарый называюць "еўрапейскім дрэвам" і "дрэвам шчасця". Насамрэч гэта звычайнае ўпрыгожванне інтэр'ера ў фармаце фларыстыкі. Яркасць дасягаецца не толькі за кошт формы, але і за кошт выкарыстання ў кампазіцыі спалучэння колераў і шматфактурных матэрыялаў. Маленькія дрэўцы выдатна ўпісваюцца ў любы інтэр'ер.

У 2010 годзе Брольніцкая сельская бібліятэка атрымала статус аграгарадоцкай. Сюды з вёскі Гарадзечна пераехаў сельскі савет. Пад яго кантору быў капітальна адрамантаваны будынак былога дзіцячага садка, у якім размясцілася і бібліятэка (дагэтуль знаходзілася ў Доме культуры). Яна заняла пакоі плошчай 137м^2. Для бібліятэкі была закуплена мэбля, мясцовае прыватнае прадпрыемства зрабіла новыя арыгінальныя стэлажы. Так што нават сваім інтэр'ерам установа вылучылася сярод іншых. Бібліятэка мае электронную пошту, чытачы атрымалі магчымасць у пошуку літаратуры выкарыстоўваць электронны каталог.

Чытачоў тут шмат. З 2014 года склад членаў клуба па інтарэсах стаў змяшаным: жанчыны таксама выказалі сваё жаданне паспытаць сябе ў сучасных відах прыкладнога мастацтва. Бібліятэка распачала работу па мэтавай праграме "Азбука рукадзелля".

Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Яўхіма Карскага арганізавала летась абласны конкурс самаробнай кнігі. "Вершы" Яўгена Пясецкага ў выкананні чытачоў Брольніцкай сельскай бібліятэкі атрымалася сапраўды арыгінальнай, бо выканана ў тэхніцы энкаўстыкі мастацтвам выплаўлення.

Для чаго я гэта ўсё распавяла? Для разумення адной вельмі важнай для сённяшняга часу высновы: добра, што на вёсцы яшчэ ёсць бібліятэка. Ёсць дзе ўзяць кнігі, ёсць дзе з карысцю правесці свой вольны час. Ці ж можна забіраць у вяскоўцаў такую выгоду?

Фаіна МАЛЮЖЭНЕЦ,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Навагрудскай раённай бібліятэкі

Мадагаскарац у Гродне

Стэла Фідзі: пра райскі востраў і жыццё ў родным тэатры

Савецкі Саюз. У Беларусь прыязджае хлопец з Мадагаскара. За яго плячыма тысячы кіламетраў, ён ляціць па веды, але атрымлівае куды больш: Стэла-Фідзіарылала Ракутуарысуа знаходзіць каханне. Беларуска з рэдкім імем Мая становіцца лёсам іншаземца. А далей новы сюрпрыз: малагасіец едзе ў родны горад жонкі, і тэатр над Нёманам гасцінна расчыняе для артыста свае дзверы. Праз 30 гадоў Гродна для Стэлы ўжо не далёкі, а блізкі, дарагі і любімы, і сцэна таксама свая, хатняя. Гэтага вакаліста любяць за прыгожы голас, яго выступленні на канцэртах гледачы чакаюць з нецярпеннем. Дзе ж яшчэ пачуеш французскую мову ад носьбіта?



Стэла Фідзі (справа) з Аляксандрам Шапкаплясавым у спектаклі "Наш гарадок" паводле Торнтана Уайлдара.

Хто ў джунглях гаспадар?

"Так, на Мадагаскары крыху цяплей", — сціпла ўсміхаецца наш герой. Вядома, лета доўжыцца там бясконца. Велічэзны востраў у Індыйскім акіяне, не Азія, але ўжо і не Афрыка — карацей, "мініяцюрны кантынент", што называюць Ноевым каўчэгам. Патухлыя вулканы і высокія горы, зялёныя даліны і глыбокія рэкі, трапічныя лясы і паўпустыні, шматкіламетровыя беласнежныя пляжы і запаведнікі. Без малога ўсе расліны і жывёлы, што насяляюць востраў, існуюць толькі на ім. А вось драпежных звяроў і змеяў ніколі там не было. Экзотыка на ўсе сто працэнтаў! І калі пальмы ды баабабы для многіх не навінка, то анідзе на планеце вы не убачыце тысячу відаў архідэй (сусветны рэкорд), дрэва вандроўнікаў (нацыянальны сімвал Мадагаскара), жалезнае і хлебнае дрэвы, а таксама калючае баваўнянае дрэва. Сярод унікальных раслін сапраўдным цудам лічаць "плаксівыя" блакітныя джакаранда. Унікальная флора цэлымі пасямі ўзвышаецца на востраве. Нездарма лемуры, персанажы папулярнай анімацыйнай стужкі "Мадагаскар", заблукалі ў непралазных лясах. Так, гэтыя рэдкія жывёлінкі жывуць менавіта там. Трэба сказаць, у краіне панавалі каралі, затым вялі рэй каланізатары, але валадарамі лесу заўжды заставаліся лемуры.

Дзе жыве музычнае шчасце?

Стэла Фідзі нарадзіўся і вырас у сталіцы гэтай краіны — Антананарыву — самым буйным горадзе, які часта называюць "горадам тысячы воінаў". Бацька — авіяцыйны інжынер, прафесар, маці — выкладчыца французскай мовы. У інтэлігентнай, уплывовай сям'і пяцёра дзяцей. Сёстры нашага героя засталіся на Мадагаскары, брат з'ехаў у Францыю, дзе паспяхова вядзе фармацэўтычны бізнес.

Музыкай Стэла Фідзі захапіўся яшчэ на радзіме. Зусім малым, ён атрымаў прыемны падарунак ад бацькоў — ксілафон. Гэта быў яго першы інструмент, на якім ён граў чатыры гады. А затым душа запатрабавала чагосьці больш гарачага — і будучы артыст з імпэтам пераключыўся на барабаны. Суседзі не скардзіліся на шум, бо яны проста адсутнічалі. Сям'я Стэлы ў сталіцы мела асобны вялікі дом, а дзіця магло цешыцца новым захапленнем, колькі душа жадае. "Толькі зрэдку хатнім надакучала, маглі сказаць: "Ну, годзе, спыніся", — пасміхаецца наш герой. Неўзабаве ён адвучыўся ў музычнай школе па класу флейты, з тых далёкіх часоў музыка назаўсёды пасялілася ў сэрцы малагасійца.

Ад зары да зары на Мадагаскары гучалі, гучаць і будуць гучаць песні. "Пастаянна, паўсюдна. Нам не патрэбны асаблівыя нагоды, спяваем проста так", — дзеліцца Стэла Фідзі. Асабліва шмат песняў можна пачуць на "зуме", самым знакамітым кірмашы вострава. Кожную пятніцу на цэнтральную плошчу сталіцы прыходзіць мноства гандляроў і рамеснікаў. Любоў да музыкі ў малагасійцаў настолькі моцная, што фотаздымак музыканта знайшоў пачэснае месца на тысячафранкавай купюры. Размова ідзе пра флейціста Ракуту Фрах, знакамітага дзядулю малагасійскай эстрады. Кажуць, ён быў бедняком па перакананні і выпіў не адзін келіх рому ў мясцовым бары.

"Ведаеце, Антананарыву — горад-казка, — прызнаецца Стэла Фідзі. — Той, хто прыязджае ўпершыню, трапляе ў цудоўны свет. Сумесь самых розных стыляў робіць архітэктуру непаўторнай. А чаму я кажу пра казку? Проста сталіца нібыта складзеная з мноства маленькіх рынкаў пад адкрытым небам. У цэнтры вас чакаюць каралеўскія будынкі (былыя, зразумела), а таксама руіны палаца каралевы Рова, найвялікшай жанчыны ў гісторыі Мадагаскара".

Як быць вечна маладым?

А яшчэ малагасійцы ўсміхаюцца паўсюдна. Таму Стэла ў нашым натоўпе вылучаецца сваёй непаўторнай ўсмешкай. Нават беларус з дрэнным настроем, сутыкнуўшыся па дарозе з артыстам, не вытрымае ды і ўсміхнецца ў адказ. За адкрытасць, жыццялюбства Гродзенскі абласны драматычны тэатр вельмі цэніць свайго вакаліста. Цяжка сказаць: вечна ці не вечна маладыя іншыя карэнныя жыхары райскага вострава — Стэла ў нас такі адзін… Але, відаць, нарадзіцца ў экзатычнай краіне, дзе сонца грэе круглы год, — гэта ўсё роўна, што стаць невычэрпнай крыніцай аптымізму для сябе і для кожнага. Не верыцца, але ў маі наш герой адсвяткуе 50-годдзе.

Без кахання няма вучобы?

"Пасля заканчэння ліцэя ў Антананарыву я атрымаў ступень бакалаўра ў сферы матэматыкі, — удакладняе Стэла Фідзі. — Можна было выбіраць, куды ісці далей. Я паразважаў і вырашыў паглядзець на замежнае жыццё. І вось паляцеў у Маскву, а адтуль — у Мінск, дзе мяне залічылі на падрыхтоўчыя курсы, каб вывучаць рускую мову".

"А ці было жаданне, як мага хутчэй вярнуцца на радзіму?" — пытаюся ў Стэлы.

"Яшчэ якое, — смяецца артыст. — унутраны голас казаў: "Не хачу. Холадна! Едзь дахаты!" Але сябры запэўнівалі, што вярнуцца ніколі не позна, а з часам становіцца ўсё прасцей і прасцей. Як бачыце, прызвычаіўся". У сталіцы Стэла атрымаў вышэйшую філалагічную адукацыю і пазнаёміўся з будучай жонкай: "Я сустрэў яе, калі займаўся на падрыхтоўчым факультэце ў Мінскім педагагічным інстытуце замежных моваў *(цяпер — Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт —* **Рэд.***)*. Мая вучылася са мною ў адным корпусе інстытута — там і пазнаёміліся, а сустракаліся аж да апошняга курса, калі нарэшце распісаліся".

Як жывецца ў драматычным тэатры?

У "ліхія" 1990-я ён прыйшоў працаваць у тэатр, дзе хутка і справядліва ацанілі чыстую французскую мову і англійскую без акцэнта. Малагасіец стаў вакалістам і артыстам аркестру, а затым ступіў на сцежку акцёра: то роля хлопчыка-пажа ў "Папялушцы", то шматлікія ролі музыкантаў у самых розных спектаклях. Калі ж шукалі каларытнага артыста для камедыі "Нараджэнне", выбар быў відавочны: Стэла Фідзі, толькі ён. Малагасіец увасобіў вобраз багацея Джона ў шыкоўным белым строі. Дарэчы, "Нараджэнне" сёння таксама працягвае збіраць поўныя залы.

Народнае тэатральнае мастацтва на Мадагаскары чымсьці аддалена нагадвае нашу батлейку. Стэла Фідзі распавёў: "Ёсць такая назва "хіра гасі". Гэтыя словы азначаюць асаблівы народны тэатр на маёй радзіме. Падчас "хіра гасі" адбываюцца выступленні бадзяжных труп, кожная з якіх бесперапынна вандруе па Мадагаскары. Такія паказы ідуць тыднямі запар. Трэба сказаць, старшыня федэрацыі тэатральных кампаній "Хіра Гасі" заснаваў асацыяцыю беднякоў. Вось ужо шмат гадоў ён займаецца рамонтам дарог і раздачай лекаў".

Любіш беларускую мову?

Сёлета артыст атрымаў ролю заморскага купца ў сялянскай прытчы-шоу "Клеменс". Хутка адбудзецца доўгачаканая прэм'ера спектакля, а пакуль актыўна ідуць рэпетыцыі. Запрошаны рэжысёр цвёрда вырашыў ставіць "Клеменс" па-беларуску. Але якія ж стасункі мае малагасіец з нашай нацыянальнай мовай? Як ён плануе ўліцца ў калектыў беларускамоўных персанажаў? "Лёгка", — гучыць адказ. Стэла Фідзі паважае і любіць беларускае, хоць разумее далёка не ўсё. З цеплынёй ён узгадвае і малагасійскую мову. Паводле слоў артыста, мова на Мадагаскары мае багатую гісторыю станаўлення. Многія памылкова лічаць: яна падобная да іншых на афрыканскім кантыненце. Насамрэч жа малагасійская паходзіць з аўстранезійскай сям'і, а значыць, яна "сябруе" з мовамі Філіпінаў, Малазіі і Інданезіі. Аднак, найбольш падабенстваў знаходзяць з гаворкай жыхароў не менш райскага вострава Барнэа.

Падчас размовы з артыстам адразу становіцца зразумелым: ён аніколі ні пра што не шкадуе, жыве, быццам сёння яго першы ці апошні дзень. Але як склаўся б лёс юбіляра, каб не тое рашэнне паляцець у Савецкі Саюз? Мадагаскар альбо Францыя? А што, каб ён не сустрэў у Беларусі каханне? Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя…

Маргарыта САДОЎСКАЯ,
літаратурны рэдактар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра

Хто паедзе на "пусты" фэст: рынак дыктуе ўмовы, а чакаюць усё адно да апошняга

У Беларусі хутка пачнуць "фестываліць". Але, на жаль, многія фестывальныя дзеі, якія цягам часам і дзясяткаў гадоў прапануюць у тых або іншых раёнах краіны, пакуль не могуць пахваліцца вялікай колькасцю турыстаў і заезджых гасцей. І гаворка тут, у першую чаргу, пра тыя абласныя і рэспубліканскія фэсты, якія не так часта свецяцца на экранах тэлевізараў, як, скажам, той жа Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску"...

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

"Пікнік на ўзбочыне" фестывалю не пасуе

Як лічаць эксперты, якіх мы запрасілі ў рэдакцыю "К", справа тут не толькі браку рэкламы ці аднатыпнасці сцэнарных распрацовак. Такім чынам, наш сённяшні "Форум" (які, дарэчы, планавалася зрабіць "круглым сталом", але, на жаль, кіраўнікі некалькіх турыстычных фірмаў, нягледзячы на неаднаразовае запрашэнне і папярэднюю згоду, так да нас і не завіталі) прысвечаны фестывальнаму турызму і тым праблемам, якія паўстаюць пры арганізацыі маштабных культурных мерапрыемстваў, а таксама аднаму вельмі важнаму пытанню: як зрабіць так, каб турысты праязджалі на айчынныя фестывалі не выпадкова і адзінкамі, а цэлымі аўтобусамі, сем'ямі — карацей, вялікай грамадой...

Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ,
намеснік старшыні Беларускага фонду культуры, ініцыятар і арганізатар шэрагу беларускіх фестываляў, у тым ліку — "Звіняць цымбалы і гармонік" у Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці:

— Напярэдадні фестывальнага сезону абавязкова трэба выпрацоўваць стратэгію дзеянняў, рабіць нейкі аналіз на перспектыву, сыходзячы з практыкі мінулых гадоў. І справы — не надта паспяховыя: у раёнах, дзе пастаянна праводзяцца фэсты, дасюль не ўсё добра з вырабам і продажам сувенірнай прадукцыі, з фестывальнай сімволікай, не наладжаная належным чынам рэклама, а многія важныя арганізацыйныя моманты зазвычай адсоўваюцца на апошнія дні перад правядзеннем мерапрыемства.

Акрамя таго, скарачэнне ў апошнія гады рэспубліканскіх і нават міжнародных фестываляў да паўтара — двух дзён — гэта, лічу, прафанацыя як фестывальнага руху, так і фестывальнага турызму. Немагчыма паўнавартасна рэалізаваць канцэпцыю фестывалю, ды і турыст не захоча ехаць на фэст, які ладзіцца ўсяго толькі дзень з гакам! Вопыт многіх замежных краін паказвае, што за кошт актыўна арганізаванага фестывальнага турызму зарабляюцца значныя грошы, неабходныя для падрыхтоўкі і правядзення такіх падзей.

Таксама варта казаць і пра тое, што сёння, на жаль, у мясцовых уладаў няма яшчэ разумення, што пэўны фестываль павінен быць не толькі своеасаблівай "візітоўкай" краю, ягоным брэндам, але і паўплываць на сацыяльна-эканамічнае развіццё як раёна, так і цэлага рэгіёна краіны. Таму 50 фестываляў, якія сёння ладзяцца ў Беларусі, — не так і многа. У той жа Польшчы цягам года адбываюцца ад 800 да 1000 фестываляў. Чым мы горшыя ў гэтым плане за нашых суседзяў?

А аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў усё ж абавязкова трэба наладжваць сістэмную працу з турыстычнымі фірмамі і арганізацыямі, бо зазвычай культработнікі гэтага не робяць, а турфірмы ігнаруюць культурныя мерапрыемствы. З улікам перспектыў развіцця культурна-турыстычнай дзейнасці неабходна арганізаваць або аднавіць у кожным раёне цэнтры турыстычных паслуг або турыстычныя бюро, якія маглі б не толькі прадастаўляць турфірмам інфармацыю пра пэўную культурную акцыю, але і быць самастойнымі арганізатарамі турыстычных паездак. У Паставах такі цэнтр калісьці працаваў эфектыўна, і яго цяперашняя адсутнасць значна ўскладняе працу з турыстычнымі арганізацыямі. Галоўнае, што для наладжвання дзейнасці гэтых устаноў не спатрэбяцца значныя бюджэтныя сродкі.

Тадэвуш Стружэцкі: "Мясцовыя жыхары павінны **адчуваць сябе гаспадарамі** свята. Інакш і турыстаў на такі "пусты" фэст не зацягнеш..."



Надзея Дударонак: "Адносна даты, дык за год ці два невядома, калі пройдзе імпрэза, хто на яе прыедзе, бо **шмат залежыць ад фінансаў**".

Адносна рэкламы. У сувязі з тым, што сёння ў Беларусі нават адзін рэкламны ролік зняць даволі дорага, варта, магчыма, падумаць пра тое, каб падобныя сюжэты на тэлебачанні дэманстраваліся як сацыяльная рэклама альбо за мінімальны кошт. Думаю, калі дзяржава зацікаўлена ў развіцці турызму, дык гэта цалкам магчыма зрабіць.

Абавязкова да ўдзелу ў фэстах трэба актыўна далучаць і мясцовае насельніцтва. Бо гэта нонсэнс, калі фестывальныя дзеі ладзяцца пры паўпустых залах ці пустых трыбунах. Мясцовыя жыхары павінны адчуваць сябе гаспадарамі свята, запрашаць на начлег гасцей фестывалю (хай нават і за грошы), цікавіцца імпрэзай. Інакш і турыстаў на такі "пусты" фэст не зацягнеш... І, канешне, варта развіваць на фестывалях рух валанцёраў. Яны могуць сустракаць гасцей, арганізоўваць тую ж рэкламу праз сацыяльныя сеткі...

Святлана БЕРАЗОЎСКАЯ,
начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама Гомельскай вобласці, дырэктар Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня":

— У нашага фестывалю цікавая праграма, ён, як вы ведаеце, адзіны і непаўторны. Але я згодна з тым, што мы мала ўвагі надаем рэкламе мерапрыемства, бо, як вядома, зняць той жа ролік і "пракруціць" яго на тэлебачанні каштуе вельмі дорага. Таксама, як і год, і пяць гадоў таму, у нас востра паўстае праблема пражывання. Мы рассяляем сотні ўдзельнікаў па школах, а вось наяўная ў Акцябрскім гасцініца разлічана ўсяго на 60 месцаў. Праўда, маем гасцінічны комплекс у Бубнаўцы, але ён таксама не надта вялікі. Так што гэта праблема сёння, мабыць, самая галоўная для нас.

Мікалай КОЗЕНКА,
мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня":

— Асноўная праблема, на мой погляд, у тым, што "Берагіня", якая мае статус рэспубліканскага фестывалю, не мае грунтоўнай падтрымкі ні ад Міністэрства культуры, ні ад Інстытута культуры Беларусі. Усімі справамі займаецца раённы аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. А гэта няправільна, бо ў культработнікаў хапае і іншай працы. Я прапанаваў бы стварыць у Беларусі ўстанову, якая займалася б фестывальным рухам, курыравала б яго. Як, скажам, гэта робіць Дзяржаўны расійскі дом народнай творчасці ды Дзяржаўны цэнтр рускага фальклору ў суседзяў.

Што да рэкламы, дык за мяжой ведаюць, калі дакладна пройдзе фестываль — і за год, і за два, і нават за тры. А мы не ведаем, у які час ён адбудзецца, бо тое ж Міністэрства культуры рассылае ў рэгіёны палажэнне аб фестывалі за некалькі месяцаў да яго пачатку. Так што і ў гэтым сэнсе мы наўрад ці зможам усё прадугледзець. Натуральна, турысты да нас пры такім раскладзе не паедуць.

Надзея ДУДАРОНАК,
дырэктар Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў (Віцебская вобласць) — арганізатара міжнароднага фестывалю "Меч Брачыслава":

— Я працую над арганізацыяй фестывалю тры гады, і толькі цяпер пачала ўсведамляць, што менавіта трэба рабіць, каб прыцягнуць на нашу імпрэзу плыні турыстаў. Гэта і рэклама ў СМІ, як мясцовых, так і рэспубліканскіх, і інфармацыйныя лісты-рассылкі па самых розных турыстычных арганізацыях, гэта і ўзгадненне праграмы з мясцовымі ўладамі ды многае іншае.

Падтрымліваю ідэю наконт стварэння структуры, якая б каардынавала фестывальны рух у Беларусі. Бо сапраўды, спраў у нас хапае, а займацца арганізацыйнымі момантамі фэсту трэба не за дзень да яго пачатку, а цягам усяго года. І падобнае ўтварэнне было б вельмі дарэчным.

Што да канкрэтнай даты правядзення фэсту, дык, на мой погляд, зрабіць гэта будзе вельмі праблематычна. За год ці нават два я не магу дакладна ведаць, калі дакладна пройдзе імпрэза, хто на яе прыедзе, бо шмат што залежыць ад наяўных у пэўным годзе фінансавых магчымасцяў.



Святлана Беразоўская: "Мала ўвагі **надаем рэкламе:** зняць ролік і "пракруціць" яго на ТБ каштуе дорага. Вострая і праблема пражывання".



Галіна Патаева: "Планы па правядзенні фестываляў **трэба зацвярджаць, прынамсі, у канцы перадфестывальнага года** і тады ж рассылаць прапановы па турфірмах".

Мікалай Козенка: "Прапанаваў бы **стварыць у Беларусі ўстанову,** якая займалася б фестывальным рухам".

Пралічыць іх загадзя проста не атрымаецца.

Галіна ПАТАЕВА,
дырэктар турыстычнай кампаніі "Віяполь":

— У першую чаргу трэба зразумець, што кампаній, якія займаюцца ўязным турызмам, у Беларусі не так і шмат. Гэта рынак, і ён патрабуе пэўных умоў працы. Таму культработнікам і арганізатарам фестываляў я сказала б так: можна рабіць на фэстах, што заўгодна, але трэба дзейнічаць арганізавана. Тое тычыцца жылля, харчавання, месца для стаянкі, месцаў для смецця, прыбіральняў. І калі арганізатары плануюць, што ў іх, скажам, будуць прадстаўлены месцы для харчавання, трэба, каб іх было шмат, прычым самых розных: для людзей, якія хочуць добра пад'есці, для тых, хто плануе проста перакусіць, для тых, хто прыносіць ежу з сабой або захоча набыць вады ці мінералкі. Усё гэта абавязкова трэба пралічыць, вызначыць, дзе такія месцы будуць знаходзіцца і, магчыма, змясціць усю гэтую інфармацыю ў фестывальных буклетах.

Варта казаць і пра сувеніры. Добрых сувеніраў, па вялікім рахунку, у Беларусі і няма. Ну навошта турысту тыя ж саламяныя вырабы? Лепш зрабіць нешта ўтылітарнае, тое, што захоча набыць сабе кожны: чахол для тэлефона, абшытыя скурай нататнікі, ручкі з фестывальнай сімволікай і гэтай далей. Усё тое, чым чалавек будзе карыстацца і пасля ад'езду з фестывалю. Вось такі сувенір ён абавязкова набудзе.

Асобная гаворка — пра гарантаванасць падзеі. Планы па правядзенні фестываляў трэба зацвярджаць, прынамсі, у канцы перадфестывальнага года і тады ж рассылаць прапановы па турфірмах. Напрыклад, пазначыць у рассылцы назву фэсту (нават прыкладную) і дзе ён адбудзецца, канкрэтную, а не ўмоўную дату культурнага мерапрыемства, а таксама невялічкую інфармацыю пра будучую падзею. І не так важна, на мой погляд, якія будуць выканаўцы, госці — важна, што мерапрыемства адбудзецца пры любой умове (нават з улікам дажджу). Бо людзям трэба загадзя ведаць, калі, на які час набываць білеты на цягнік ці на самалёт, загадзя браніраваць гасцініцы, планаваць свае выдаткі на харчаванне і гэтак далей. І, канешне, арганізатарам фестываляў варта вывучаць замежны досвед. Напрыклад, у той жа Францыі ладзяцца своеасаблівыя рыцарскія турніры. За паўтары-дзве гадзіны артысты, апранутыя па тагачаснай сярэднявечнай модзе, паспяваюць і пазнаёміцца паміж сабой, і патанчыць, і нават ажаніцца... Карацей, нейкімі падобнымі імправізацыямі, цалкам умоўнымі, але відовішчнымі дзеямі прыцягваецца увага гасцей фестывалю. Каб кожны, хто на гэтай культурнай імпрэзе пабывае, захацеў сюды прыехаць яшчэ неаднойчы — з сям'ёй ці з сябрамі...

Фота Аліны САЎЧАНКА

К

Мінская “Больш чым вясна”

Падчас канцэрта “Больш чым вясна” Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

XXXII “Мінская вясна”, што праходзіла на сцэне сталічнай філармоніі ўвесь красавік, аказалася не зусім звычайнай. Яна адрадзіла сваю колішнюю маладзёжную адметнасць і пачала называцца Міжнародным маладзёжным форумам.

Надзея БУНЦЭВІЧ

У свой час “Мінская вясна” з’явілася як своеасаблівая “маладзёжная” альтэрнатыва больш сталай “Беларускай музычнай восені”. Калі “… Восень” і сапраўды “збірала ўраджай” (там выступалі найперш знаныя ўсесаюзныя зоркі, народныя артысты), дык “… Вясна” адкрывала новыя імёны — выканальніцкія і кампазітарскія. Але з цягам часу, адчуваючы эканамічныя складанасці, пераварылася ў звыклы цыкл канцэртаў, адметнасць якому надавалі хіба “фестывалі ў фестывалі” — праекты “Мандалінісіма”, што збірае выканаўцаў на лютні, гітары, мандаліне, і “Дуэцісіма”, скіраваны на фартэпіянныя дуэты. Сёлета ж “… Вясна” напоўніцу прадэманстравала свой багаты патэнцыял.

Афіша была як ніколі разнастайнай, папраўдзе міжнароднай і магла б даць фору такім нашумелым праектам, як, напрыклад, той жа фестываль Юрыя Башмета, які пазіцыянуецца як магчымасць маладым выступіць з сусветна прызнанымі маэстра. На “Мінскай вясне” таксама былі падобныя сумесныя праекты: майстар-класы Кірыла Родзіна (Расія), Ромаса Ванагса (Латвія) і іх выступленні, адпаведна, з ансамблем “Маладыя віяланчэлісты Мінска” і хорам нашай Акадэміі музыкі (“К” № 15), прэм’ера румынскай джазавай сімфоніі (“К” № 18), “Мандалінісіма”, куды завіталі зоркі Францыі, Калумбіі, Венесуэлы. Далучыце сюды шматлікія сольныя выступленні і вечарыны нашых маладых музыкантаў, многія з якіх стажыраваліся і працягвалі кар’еру ў замежжы: піяністаў Міхаіла Ялецкага, Віталя Стахіевіча, Сяргея Смірнова, гітарыста Паўла Кухты, трыа “Nouvelle Philarmonie” на чале са скрыпачом Арцёмам Шышковым, віяланчэліста Дзмітрыя Цыпкіна, флейтысткі Дар’і Бельцюковай, яе сястры скрыпачкі Ксеніі ды іншыя падзеі.

Прыйшла “… Вясна” і на кампазітарскую вуліцу, уключыўшы ў праграму сольны вечар Алены Атрашкевіч, прэм’еры сімфанічных твораў Сяргея Бельцюкова (Канцэрт для чатырох салістаў з аркестрам), Галіны Гарэлавай (сюіта “Партрэты” для струннага аркестра, ударных і саліруючага кларнэта паводле выстаўкі “Мастакі Парыжскай школы з Беларусі”, што ладзілася некалькі гадоў таму ў Нацыянальным мастацкім музеі краіны), Аляксея Пілатава (тры часткі з сімфоніі № 2 “Ікар”), а таксама шматлікія выкананні беларускай камернай музыкі.

Ды ўсё ж галоўнай “медыясобай” усёй “… Вясны” стала Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі — і не толькі таму, што ў рамках форуму адбылася традыцыйная ўжо вечарына гэтай навучальнай установы. Сапраўдным упрыгожаннем фестывальнай праграмы сталі і сольнікі асобных творчых калектываў Акадэміі: ансамбля цымбалістаў “Ліпея” пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Яўгена Гладкова (да 50-годдзя калектыву), студэнцкага хору на чале з Інэсай Бадзяка, які выконваў выключна сучасную музыку кампазітараў Літвы, Латвіі, Эстоніі (“К” № 15). Дый практычна ўсе беларускія ўдзельнікі форуму — былыя выхаванцы БДАМ: ледзь не скрозь лаўрэаты міжнародных конкурсаў, стыпендыяты і лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

А тое, што Акадэмія можа быць не толькі “акадэмічнай”, яна давяла ў сваім “сольніку”, названым сёлета “Больш чым вясна”. Канцэрт будаваўся на пастаянным змене інструментаў, складаў, жанраў: ансамблі трубачоў, цымбалістаў, гітарны аркестр, якім дырыжыраваў не толькі прафесар Валерый Жывалеўскі, але і магістрантка Ірына Жалязовіча, дуэт марымбы з альт-саксафонам, сучасная харэаграфія, фрагменты з мюзікла — куды больш? Паўтары гадзіны без перапынку, элементы тэатралізацыі, відэакліпы на кожным з нумароў — часам здавалася, што ўсяго гэтага было нават занадта, хапіла б і менш усялякіх дадатковых “расфарбовак” уласна музыкі. Але публіка, сярод якой, як гэта часта здараецца апошнім часам, было многа зусім “не філарманічнай”, успрыняла ўсё “на ўра”. Не менш задаволенымі засталіся і прыдзірлівыя знаўцы, якіх не скарыць адно прывабнай “абгорткай”.

Магістрант Сяргей Бутар (клас прафесара Мірона Булы) запомніўся надзвычай лёгкім гучаннем баяна, дзе быў і бісер, і пырскі шампанскага. Юлія Мельнічук, якая навучаецца харэаграфіі ў народнага артыста Беларусі, народнага артыста СССР Валянціна Елізар’ева, паспрабавала далучыць да сваіх танцавальных фантазій яшчэ і піяніста Аляксандра Музыкантава (музычна-харэаграфічная кампазіцыя “Тая, якая штоноч прыходзіць у твае сны”). Дывертысмент сучаснага японскага кампазітара Акіра Юяма ўразіў прыцягальна насычаным гучаннем альт-саксафона ва ўлонні тонкай марымбавай фонасферы (маладыя выкладчыкі Мікіта Пятроў і Антон Лазоўскі).

А хор выходзіў (ды яшчэ і выбягаў) ажно тройчы! У пачатку канцэрта — у якасці гяткай “акцёрскай масоўкі”. Потым — з вельмі стылёва вывераным, дакладным выкананнем духоўнай музыкі, а менавіта Месы выпускніка БДАМ, іерэя Андрэя Саўрыцкага. Нарэшце, у фінале вечарыны — з папуры паводле “Вестсайдскай гісторыі” Леанарда Бернстайна, дзе частку нумароў харавіёз спявалі і адначасова танчылі ўвогуле без дырыжора. Так што калі ўся “Мінская вясна” атрымалася нават “больш за вясну”, дык Акадэмія музыкі ў чарговы раз даказала, што можа быць “больш чым акадэміяй”.

К

“На дне” Магілёўскага абласнога тэатра лялек у пастаноўцы галоўнага рэжысёра Ігара Казакова — спектакль знакавы, набалелы, “няўтульны”, правакацыйны. Шэраг эпітэтаў можна працягваць — усё роўна яны не перададуць і сотай долі таго жывога, рухавага клубка змей-думак, якія жаляць пасля прагляду.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Галоўная сярод іх — дык гэта “дно” нейкага жудаснага склепа з каналізацыйнымі трубамі ці ўсё ж паддашак з комінам, ад якога да нябёсаў зусім блізка? А калі і сапраўды нябёсы побач, дык што яны нясуць — смерць ці ўваскрэсенне? Такія пытанні, зададзеныя сцэнаграфіяй, зусім не дарэмныя, бо ў іх сама сутнасць спектакля — яго перманентная амбівалентнасць, пастаянныя павароты усіх герояў і падзей то адным, то другім бокам. Жанравае азначэнне спектакля, дадзенае пастаноўшчыкамі, такой падвойнасці трактовак не дае: п’еса Максіма Горкага прачытана як “экзістэнцыйная драма ў двух актах роспачы”. Ды ўсё ж і той экзістэнцыялізм, усё яшчэ новы для беларускай культуры, і роспач, дзе ўжо само гэта слова міжволі вядзе да Уладзіміра Караткевіча, маюць у спектаклі рознае “начынне”.

Спачатку ўзнікае музыка (кампазітар — Аляксандр Літвіноўскі). Бы оперная ўвертюра пры апушчанай заслоне, яна настройвае на далейшае дзеянне. Але чуем мы арганны космас, сапраўдную харавую містэрыю — а бачым... нейкіх жудасных чарвякоў, што абгрызаюць труп, а той, у сваю чаргу, пазней выклікае асацыяцыі з пакладзеннем Хрыста ў труну. Ці ж гэта не супрацьлегласці, нечакана звязаныя ў разгалінаваныя ланцужкі інтэртэкстуальных спасылак? У такім неверагодным лабірынце скрыжаванняў, напластаванняў сэнсаў, у той самы момант, калі пасля амаль дзвюх гадзін мы канчаткова прымаем прапанаваны нам філасофскі хорар і пачынаем спачуваць жудасным двухгаловым пачварам (адна галава — лялькі, другая — самога артыста), якія імкнуцца скінуць абалонкі чарвякоў і паўстаць у чалавечых абліччах,— у гэты самы момант прыходзіць канец. Не фінал, а менавіта канец: з’яўляюцца санітары і праводзяць дэзінфекцыю — “зачыстку” тэрыторыі. Усё. Больш няма нічога. І не будзе...

Рэжысёр пазбаўляецца 4-й дзеі, што ёсць у арыгінале, разам з ёй знікаюць “галоўныя”, па савецкіх

13 мая ў Мінску адкрываецца IX Міжнародны фестываль тэатраў лялек. Да гэтай падзеі змяшчаем рэцэнзіі на некаторыя ўключаныя ў яго спектаклі, якія давялося паглядзець раней.

Што гучыць пасля апакаліпсісу?

Сцэны са спектакля “На дне”.

мерках, словы: “Чалавек — гэта гучыць горда!” Дый што можа гучаць пасля апакаліпсісу? Але — не проста гучыць, а літаральна б’е ў набат усё “суквецце” масавых чалавечых трагедый XX стагоддзя: экалагічныя катастрофы (невыпадкова “двухгаловыя”: яны прымушаюць згадаць постчарнобыльскіх мутантаў), сталінскія рэпрэсіі (трое санітараў асацыююцца з “тройкамі”, якія выносілі прысуд), фашысцкі генацыд. П’еса, напісаная на досвітку мінулага стагоддзя, на мяжы 1901 — 1902 гадоў, інтэрпрэтавана як мастацкія прароцтвы-папярэджванні аўтара ўсяму далейшаму разгорту сусветнай гісторыі. Дый “прышэсце санітараў” пастаноўшчыкі “выцягнулі” ўсё з той жа 4-й дзеі, увасобіўшы словы Насты: “Змесці б вас, як смецце… куды-небудзь у яму!” Так што калі штосьці не падабаецца ў такім фінале — усе прэтэнзіі да Горкага. Дый само заканчэнне спектакля раптоўным апакаліпсісам — зусім не ноў-хаў. Той жа Мікалай Пінігін сваю “Чайку” ў купалаўцаў завяршае прылётам каметы — і нічога, усе артысты жывыя, а гледачы адразу пераключаюцца для аплядысментаў.

Пры ўсім “чарноцці” зместу, спектакль “На дне” выклікае самыя высокія эстэтычныя ўражанні. Адмысловыя лялькі (мастак — Таццяна Нерсісян) здзіўляюць не прыгажосцю, а выразнасцю — настолькі моцнай, што змест перадаецца не словамі (іх у першай палове спектакля часам увогуле не зразумець, бо ўсе крычаць на адной ноце, і лямант зліваецца ў аднастайную какафонію), а менавіта “лялькава-джэннем”. Нават самая простая з іх — Лука — адначасова падобная да абскубенага анёла, з якога ляцяць пух ды пер’е, і да мухі-назолы.

Акрамя сваіх артыстаў, на пастаноўку былі запрошаны двое з абласнога драмтэатра, таму спектакль можна лічыць сумесным праектам магілёўскіх труп. І ўсё ж “жывыя” артысты тут значна прайграюць лялькам-чарвякам — няўжо наўмысна, каб яшчэ больш падкрэсліць безнадзейнасць фіналу, вырашанага як “апошняе папярэджванне”?

Разнастайная музыка Аляксандра Літвіноўскага скарае эмацыйнай трапнасцю. Яна не дапаўняе відовішча, не каментуе яго, не “дасказвае” за герояў іх стан — наадварот, прынцыпова кантрастуе гэтаму паўраспаду чалавечых целаў і душ, і часам яе неверагодная прыгажосць і глыбіня робіць дзеянне яшчэ больш страшным.

Спектакль можна прымаць ці не прымаць — абысці яго немагчыма. І забыць — таксама. Мабыць, на гэта і разлік?..

К

Будзем на сувязі!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

“Фро”-2. Каханне. Брэст

Брэсцкі абласны тэатр лялек прывозіць на фестываль сваю нядаўнюю прэм’еру — навэлу пра каханне “Фро” паводле аднайменнага апавядання Андрэя Платонава ў пастаноўцы запрошанага расійскага рэжысёра Руслана Кудашова.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Гэты пастаноўшчык ужо дзесяцігоддзе з’яўляецца галоўным рэжысёрам маскоўскага Вялікага тэатра лялек, але з брэстчанамі супрацоўнічае не ўпершыню: раней ён ставіў тут “Месяц Сальеры” і “Халстамера”, якія аб’ездзілі шматлікія фестывалі, атрымліваючы міжнародныя ўзнагароды. Свае ўзаемаадносіны ў Кудашова і з творчасцю Платонава. Паводле яго “Ракі Патудань” ён ставіў свой дыпломны спектакль, пазней арганізаваўшы з аднакурснікамі ўласны тэатр лялек з такой жа назвай — “Патудань”. Дый цяперашні спектакль стаў не першым зваротам рэжысёра да “Фро”. Годам раней ён паставіў аднайменны спектакль у Рыжскім рускім тэатры імя Міхаіла Чэхава, і нам паказвалі яго на XX Міжнародным тэатральным фестывалі “Белая вежа” ў Брэсце. Драматычная версія “Фро” зрабіла фурор не толькі сярод публікі, але і ў асяродку запрошаных на форум крытыкаў з розных краін. Таму да чарговага ўвасаблення таго ж твора, якое мне давялося глядзець пазней, я ставілася з некаторай падазронасцю: ці ж можна перанесці тыя напрацоўкі ў тэатр лялек?

А Кудашоў і не пераносіў. Ён прапанаваў абсалютна іншы спектакль. Часам нават здаецца, што рэжысёр наўмысна рабіў многія рэчы не проста іначай, а прынцыпова супрацьлегла. Той палаў шалёнай энергетыкай — у гэтым пануе няспешная распавядальнасць. Там было шмат чырвонага — ва ўсіх энсах слова, уключаючы рэвалюцыйную сімволіку і дакладны зрэз савецкага часу. Тут — чорна-белага, касмічнага (невыпадкова ў адзін з момантаў лялькі з’явяцца з галовамі ўнутры “лямпачак” — як у скафандрах), быццам увесь аповед, нягледзячы на дакладна акрэсленае “месца дзеяння”, вынесены ў пазачасавае вымярэнне.

Параўнанні можна працягваць, але сутнасць не ў іх, а ў тым, што кожны з варыянтаў — самадастатковы. Здараецца, рэжысёры неаднойчы звяртаюцца да аднаго твора, бо разумеюць, што раней не сказалі ў ім чагосьці вельмі важнага. Ці адчуваюць, што праз час успрыманне твора змяняецца. “Фро” не адпавядае ніводнаму з гэтых варыянтаў. У абодвух спектаклях Кудашоў даводзіць адныя і тыя ж думкі, толькі па-рознаму, на рознай тэатральнай мове, і з-за гэтага акцэнты прыпадаюць на іншыя дэталі. Адзінае, бадай, што злучае абодва спектаклі, гэта выкарыстанне, сярод іншай музыкі, “Bella ciao” — песні італьянскіх партызан, якая не мае дачынення да “месца і часу дзеяння”, а, разам з іншымі сродкамі, выводзіць аповед да абагульненняў. Вось толькі ў рыжскім драматычным спектаклі гэта мелодыя праходзіла праз увесь спектакль лейтматывам, а ў брэсцкай лялечнай пастаноўцы “патальнае” ў акіяне іншай музыкі, у тым ліку замежнай эстрады, а таксама найноўшай мінімалісцкай (музычнае афармленне — Уладзіміра Бычкоўскага).

Сцэна са спектакля “Фро”.

Брэсцкі спектакль пачынаецца з гяткай “атмасфернай” уверцюры. Гучыць ханг — швейцарскае вынаходніцтва XXI стагоддзя, і з цемры то чыгуначны ліхтар на нас свеціць (чыгуначных атрыбутаў будзе яшчэ шмат), то героі раз-пораз выбягаюць, кідаюць папяровыя самалёцікі (у спектаклі яны стануць ліставаннем са словамі кахання), потым ловяць ды хаваюць тыя, што ляцяць з цемры да іх. Лялькі (мастак — Марына Заўлава) будуць вынятыя са скрыні-пасылкі з надпісам “FRO” — двое кранальных драўляных чалавечкаў без вопраткі з тканіны, бы аголеныя душы ці наўпрост Адам і Ева (Ева “жывым планам”, увасобленая артысткай Аленай Паляшэнка, з’явіцца пазней, падобная ці то на Феміду, ці то на працаўніцу-камсамолку-сіняблузніцу). А разам з чалавечкамі са скрыні паўстане дзіўнаватае “дрэва” з дзвюма галінамі-рукамі. Сэнс гэтага “дрэва кахання” раскрыецца ў кульмінацыі, дзе замест любоўнай “анатоміі” мы ўбачым зачараваны танец рук, што сплятаюцца ў пяшчотных ласках і ўзрастаюць, цягнуцца да свята (для параўнання: тая ж сцэна ў драмспектаклі была вырашана праз вялізную дынама-машыну, якую круцілі заканханыя, дасягаючы экстазу пад лівень промняў-струменяў).

Хлопчык з верхняга паверха ўвасабляецца пухнатай распашонкай, падобнай да птушкі і анёла. Цягнікі — і маленечкім адкрытым зверху вагончыкам-цысцэрнай (скрыняй на колцах), і вялізнымі шчытамі-дзвярыма таварных вагонаў, і проста барабанным дробатам, і друкарскай машынкай, на якой сядзіць Фёдар, едучы на Далёкі Усход, дзякуючы чаму герой часам асацыюецца з аўтарам аповеда. Шмат і іншых візуальных знаходак. Мужчынскі парык эпохі Людовіка XIV нагадвае патронную стужку для кулямёта. Плакатныя выявы “Чырвонага кутка” з іх квадратнымі дыў трохвугольнымі “палымянымі сэрцамі” скіроўваюць да Казіміра Малевіча. Удала выкарыстоўваюцца тантамарэскі — малюнкі з “дзіркай” для твару лялькі ці артыста.

Удзельнікі спектакля добра спраўляюцца з прапанаванымі ім рэальна-“касмічнымі” ўмовамі існавання. Хіба ў пачатку здараецца залішні пафас, але чым далей, тым больш “размоўная частка” ўваходзіць у патрэбную танальнасць. Пры вялікай колькасці каларытных эпізадычных персанажаў асабліва запамінаюцца героі Андрэя Палянскага. Але ў цэнтры ўвагі ўсё роўна застаюцца Фрося (Аксана Чывялёва) і не столькі яе муж Фёдар (Канстанцін Крышталовіч), колькі бацька (заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Іван Герасімовіч). Майстэрства гэтых артыстаў узмацняе ў спектаклі лінію бацькоўскай любові, яе пераемнасць — ад бацькі да дачкі, у якой таксама нараджаюцца матчыны пачуцці, хай пакуль і да суседскага дзіцяці.

К

“Мандрагора” па-маладзечанскі

Галоўны рэжысёр Мінскага абласнога тэатра лялек “Батлейка” Мікалай Андрэеў, распавядаючы пра планы свайго тэатра ў даўнім інтэрв’ю штотыднёвіку “Культура”, згадаў пра пастаноўку п’есы “Мандрагора” італьянскага аўтара эпохі Адраджэння Ніколы Макіявелі. Словы не разышліся са справай: 22 красавіка маладзечанскія лялечнікі паказалі прэм’еру.

У інтэрнэце адшукаў інфармацыю пра пастаноўку гэтай п’есы выключна ў драматычных тэатрах. Відаць, і сапраўды ў выпадку з “Мандрагорай” тэатр “Батлейка” стаўся першапраходцам сярод калег-лялечнікаў. Урэшце, ні аматарам сцэнічнага мастацтва, ні крытыкам не прывыкаць да эксперыментаў айчынных тэатраў лялек, калі рэжысёры выбіраюць для пастаноўкі “дарослую” драматургію. Прыкладам, апошняя навінка Магілёўскага абласнога тэатра лялек — спектакль “На дне” паводле п’есы Максіма Горкага. А п’еса Макіявелі — наогул асаблівы выпадак. У яе сюжэце закладзены эратычны кантэкст, і па духу яна блізкая да твора іншага італьянца — “Дэкамерон” Джавані Бакача...

Рэжысёрская канцэпцыя спектакля — тэатр у тэатры. Сцэнаграфічнае вырашэнне мастака-пастаноўшчыка Вольгі Разумавай простае і вобразнае — гэта перасоўны вулічны тэатр: заслона-шторка ў латках і сама рабочая пляцоўка. Яе функцыю выконвае масіўны стол з разнымі ножкамі, на якім месціцца “дэкарацыя ў дэкарацыі” — шматстворчатая шырма з прарэзанымі аркамі. Апошняя вытанчана імітуе каланду дамоў Флярэнцыі, яе вулачкі і падваротні. Побач з гэтымі аркамі разгортваецца асноўная дзея спектакля. (Хоць рэжысёр з акцёрамі пастаралася асвоіць і астатнюю прастору сцэны ўмоўнага “перасоўнага” тэатра.) Касцюмы артыстаў вандроўнай трупы, як і лялек-марыянетак, стылізаваныя пад час напісання твора. Адпаведна аранжыравана і музыка кампазітара кампазітара Сяргея Бельцюкова.

Артысты, занятыя ў спектаклі, — Таццяна Паўлючук, Міхаіл Асановіч, Таццяна Чаеўская, Уладзімір Уладыка, Аляксандр Майрын — іграюць азартна, з бляскам у вачах. Ды і як інакш, калі дзеянне п’есы адбываецца ў Італіі! Кожны персанаж надзелены непаўторнай галасавой інтанацыяй і характарнасцю гаворкі. Пры мізансцэнічнай статычнасці асобных сцэн асабіста ў мяне стваралася адчуванне, што марыянеткі раптам набылі голас, а артысты ўсяго толькі падтрымліваюць іх за нітачкі. На працягу спектакля выканаўцы часам «пакідаюць» сваіх лялек, працуючы жывым планам. Яны разыгрываюць тэкст Макіявелі, падкладаючы сваё іранічнае стаўленне да калізій сюжэту.

Кранальна і з тактам вырашана апафеозам сцэна, дзе герой Лігурыя нарэшце аказваецца сам-насам з прадметам свайго запалу — Лукрэцыяй. Гэта тэатр ценяў. У промні пражэктара фігуркі марыянетак павольна набліжаюцца адна да адной (як ні згадаць радкі Барыса Пастарнака: “Скрещенье рук... Судьбы скрещенье”). У пэўны момант пражэктар паволі згасае, пакідаючы герояў сам-насам са сваімі пачуццямі. Пасля паказу артысты прызналіся, што хваляваліся ўдвая, не ведаючы, якой акажацца рэакцыя публікі катэгорыі “18+” на лялечны спектакль дарослай тэматыкі. А рэакцыя сталася самая пазітыўная, асабліва ў маладзёжнай аўдыторыі.

Для тэатра “Батлейка” гэта прэм’ера — не толькі свята, але і спроба сказаць сваё слова ў мастацтве. Асабліва, калі ўлічваць шэраг прэстыжных узнагарод, якія ў апошнія гады атрымалі айчынныя рэжысёры лялечнага тэатра на розных форумах: гэта і Нацыянальная тэатральная прэмія, і расійская тэатральная прэмія “Залатая Маска”. Але, як мне падалося, у тэатры лялек не бывае чужых перамог і радасцяў. Гэта акалічнасць і прымушае кожны тэатр шукаць нешта новае і рухацца наперад.

Яшчэ адзін аспект. Сярод жыхароў Маладзечна сфармаваўся ўстойлівы стэрэатып ўспрымання “Батлейкі” як тэатра, што працуе выключна для дашкольнікаў і на аўдыторыю малодшага школьнага ўзросту. Які пракатны лёс чакае прэм’ерны спектакль пры такім раскладзе? З такім пытаннем я звярнуўся да дырэктара тэатра Алы Паляковай. І вось, што яна адказала: “Мы паспрабуем разбурыць стэрэатып. У першую чаргу, нас натхнілі вусныя «рэцэнзіі» і запісы гледачоў у кнізе водгукаў. Гэта захопленыя словы падзякі і нават здзіўленне ад таго, што вячэрні спектакль магчымы і ў тэатры лялек. Некалькі сезонаў запар мы практыкуем фармат сямейнага прагляду, пракатваючы спектаклі дзіцячага рэпертуару па нядзелях у ранішні час. З новага сезона ўвядзем фармат вячэрняга спектакля па пятніцах. Акрамя гэтай прэм’еры, у нас ёсць яшчэ, прынамсі, спектакль “Голы кароль” паводле Ганса-Хрысціяна Андэрсана, які трэба аднавіць, пастаноўкі “Яна і Я” паводле аднайменнай паэмы Янкі Купалы, “Неверагодныя прыгоды паноў Кубліцкага і Заблоцкага” Пятро Васючэнкі і Сяргея Кавалёва...”

Як спрацуе служба арганізацыі гледача і наколькі гарадскі глядач гатовы адгукнуцца на прапанову? А калі ідзя знойдзе свой водгук? Тады ... “Ці не замахнуцца на Вільяма нашага?..”

Алег ЧЭЧАНЕЎ, акцёр, рэжысёр

Сцэна са спектакля “Мандрагора”.

Гацук: з месца ў кар’еру

Адзін мой сябар пажартаваў, разыграўшы дыялог: “Як ты рыхтуешся да размеркавання?” — “Ну, гляджу “Падарожжы дылетанта”. (Дарэчы, гэты салігорскі хлопец адкараскаўся спалохам: яго ўзялі на прэстыжную пасаду ў Мінску). Але жарту тут — працэнтаў на 15, астатняе — праўда. Штогод маем інфармацыю ад ВНУ, колькі запытаў прыходзіць, ад якіх арганізацый і ўстаноў, з якіх населеных пунктаў. І, самае цікавае, колькі маладых спецыялістаў гатова паехаць (і даехаць) на месца, каб сумленна адпрацаваць там два гады, а мо застацца і надалей.

Аліна САЎЧАНКА, Мінск — Слуцкі раён — Мінск / Фота аўтара

Паліна Панамарова за творчай...

...і адміністрацыйнай працай.

Статыстыка — рэч вельмі змястоўная і красамоўная, але за кожнай лічбай і прозвішчам — чалавечы лёс. “К” вырашыла ці не пад лупай разгледзець адзін з іх — шлях Паліны Панамаровай, выпускніцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, што летам 2015 года накіравалася ў Падлескі сельскі дом культуры Слуцкага раёна на пасаду мастацкага кіраўніка разам са сваім калегам Уладзіславам Палянскім, які па плане павінен быў узначаліць гэтую ўстанову (пачатак гісторыі — “К” №28 за мінулы год), але абавязак перад радзімай трошкі змяніў курс хлопца.

Паліну ж, з дапамогай ужо знаёмай мне дырэктара Раённага цэнтра народнай творчасці Таццяны Івановай, я знайшла не ў Падлессі, як планавалася, а ў аграгарадку Гацук, які знаходзіцца за 35 кіламетраў ад Слуцка. Працуе яна там дырэктарам Дома фальклору. Месца працы змянілі з некалькіх прычын: па-першае, заставацца адной у велізарным будынку Падлескага СДК падалося выпускніцы неяк няўтульна, па-другое, ад Гацука да Мінска значна лягчэй дабірацца. Рашэнне было прынята з дапамогай метадычнага аддзела РЦК на карысць Паліны.

■■■

Некалькі рэмарак пра маладую дырэктарку. Родам яна з расійскай Самары, шмат павандравала з сям’ёй, але заўсёды — па буйных гарадах. На час вучобы ў ВНУ Паліна вырашыла прыпыніцца ў Мінску.

Скончыўшы БДУКіМ як менеджар міжнародных культурных сувязей, пасля ўніверсітэта яна ўяўляла сабе арганізатарам культурных праектаў, але рэальнасць перасягнула ўсе Палініны чаканні.



Імправізаваны музей, створаны выхаванцамі Дома фальклору.

■■■

Заўсёды цікава, ці рыхтуюць сталічных студэнтаў за 4 гады да працы ў рэгіёнах. Паліна падзялілася, што яе заўсёды вабілі буйныя міжнародныя праекты Мінска, у якіх яна прымала ўдзел як валанцёр. Прайсці практыку на раёне таксама можна было б, але, кажа, гэта не дужа цікава і прыярытэтна для моладзі.

Таму, калі надышоў “час Х”, яна спярша разглядала варыянты пераразмеркавання ды шукала альтэрнатыву. “Фіктыўна выйсці замуж і тым самым выратаваць сябе мне не дазволілі асабістыя перакананні. Таму я вырашыла інакш: трэба адмежавацца ад масавай істэрыі і перастаць бегчы ад таго, чаго проста не ведаеш”, — паведаміла гераіня. Невядомым аказалася разнапланавая работа, дзе можна рэалізаваць сябе і як менеджар, і як творца, і як педагог, і як этнограф — магчымасці шырокія. Сапраўднай жа праблемай бачыцца тое, што ў Мінску сутнасць складанай і спецыфічнай працы ў раёне тлумачаць збольшага ў агульных рысах, бо і самі выкладчыкі з гэтай сферай судакранаюцца збольшага ў тэорыі. Усе тонкасці ўчарашнія студэнты “хапаюць” на месцы. З іншага боку, ці не ў гэтым хараство маладосці: хутка арыентавацца, знаходзіць у сабе рэзервы, нестандартна думаць?

У выпадку з Палінай Панамаровай мясцовае кіраўніцтва было само зацікаўлена ў маладым спецыялісце, стварыўшы ёй максімальны камфорт, які толькі можна арганізаваць ва ўмовах аграгарадка: двухпакаёвая кватэра па цане “камуналкі”, адрамантаваны дом фальклору з дзейнай сістэмай ацяплення. Ну і галоўнае: кругласутачная сувязь з падапечнай, спагадлівасць і жаданне дапамагчы.

“Мне давялося вывучаць, што такое сельская мясцовасць. Я абсалютна гарадскі чалавек, мяне ніколі не адпраўлялі на лета ў вёску да бабулі, таму і элементарныя рэчы былі ў навінку: як набраць ваду з калодзежа, скажам. А ў Падлессі гэта спатрэбілася, у Гацуку ж ёсць калонка. Не ведала, чым адрозніваецца калгас ад сельсавета. Карацей, трапіла ў нейкі асобны свет”, — Паліна распавядае, мы разам смяемся, але я разумею, што на яе месцы першыя дні была б такой жа бездапаможнай. Праўда, зараз дзяўчына выглядае вельмі ўпэўненай, поўнай годнасці і спакою.

Што да прафесійнай сферы, то ў яе маецца куратар ад Цэнтра народнай творчасці Слуцкага раёна, які адказвае на кожнае зададзенае пытанне. Хаця Паліна запэўнівае, што ёй “займаюцца ўсе”.

■■■

Акалічнасць, якая “ўсплыла” толькі падчас размовы: штат у Гацукоўскім доме фальклору складаецца… толькі з Паліны. Не, канешне, у яе яшчэ ёсць тэхнічны персанал (два качагары), што візаві падкрэслівала, але па факце дырэктар выконвае ўсе адміністрацыйныя, арганізатарскія і творчыя функцыі, а менавіта: кіруе 5 клубнымі фарміраваннямі (4 з іх — дзіцячыя); ладзіць шэраг стандартных мерапрыемстваў (кшталту святочных канцэртаў) ды нефармальных (псіхалагічныя трэнінгі для моладзі, скажам). Адразу наогул ставала запалу, але зараз Паліна больш удумліва падыходзіць да працы, расстаўляе прыярытэты. (Калі нумар здаваўся ў друк, “К” даведалася, што ў Дом фальклору ўладкавалася дзяўчына на стаўку мастацкага кіраўніка. Спадзяемся, што ўдваіх працавацца будзе весялей, лягчэй і больш прадуктыўна).

“Фінансамі займаецца бухгалтэрыя ў Слуцку. Як і ва ўсіх установах, у Доме фальклору ёсць платныя паслугі: дыскатэкі, некаторыя мерапрыемствы. Трэба выканаць план — 20 мільёнаў за год. У такім выпадку вельмі дапамагаюць менавіта дыскатэкі”, — кажа візаві. Дарэчы, вечарыны ў Гацуку былі настолькі шырока прарэкламаваны Палінай у Сеціве, што сюды прыязджаюць нават з Мінска. “А вось на канцэртах я зарабляю сваю рэпутацыю сярод насельніцтва, таму браць грошы за іх з людзей пакуль не хочацца”, — зазначае Паліна. Мне такі падыход падаецца вельмі дальнабачным. І чамусьці я ўпэўнена, што Паліна Панамарова, хаця і пачатковец у культуры, але працу сваю робіць на ўзроўні. Гэта пацвярджаюць і старэйшыя калегі.

■■■

Гацук — не такі і вялікі населены пункт, усяго 1260 жыхароў. Але ён мае ўласную агульнаадукацыйную школу, прычым — з экалагічным ухілам, і школу мастацтваў. З дырэктарамі гэтых устаноў Паліна Панамарова адразу

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Веткаўшчына / З косамі у карагод

Штогод “Карагод сена” на другі дзень Вялікадня збірае жыхароў аграгарадка “Старое Сяло”.

Сёлета ў карагод сабраліся дырэктар СДК Ала Маскаленка, кіраўнік народнага фальклорнага ансамбля “Рэчанька” Антаніна Болбасава, удзельнікі калектыву Тамара Кірчанка, Надзея Малюшына, Клаўдзія Малюшына, Валянціна Бондар, Любоў Рачкова, Ніна Паўлючкова, Наталля Хацімцова, Ганна Медзіна.

Грае гармонь, карагод дзеліцца і разыходзіцца па баках, каб ісці на “Вялікдзень” і на “Канаплёўку”. На плячах людзі нясуць косы, граблі, вілы. Жанчыны спяваюць, пасля ставяць вядро з зямлёю і пачынаюць “вырошчваць хрэн”, вадзіць карагод са старажытнымі абрадавымі песнямі, тройчы просяць кума даць хрэну…

Гэты абрад існуе з даўніх часоў. “Карагод сена”— гэта спрадвечны калаўрот жыцця, “Рэчанька” яго захавала.

Людміла МЕЛЬНІКАВА, вядучы метадыст па народных традыцыях і абрадах Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці

Падчас дабрачыннага кірмашу ў Гродне.

“Карагод сена” ў аграгарадку “Старое Сяло”.

Гродна / Дабрачынны кірмаш

У гістарычным цэнтры горада над Нёманам адбыўся рэгіянальны дабрачынны кірмаш вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі — да свята Вялікадня”.

Сярод удзельнікаў — носьбіты традыцый, пэўныя элементы якіх занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Праз выстаўкі і шматлікія майстар-класы можна было даведацца, як выглядаюць знакамітыя гродзенскія велікодныя вербы, у чым адметнасць сапоцкінскіх пісанак — васкаванак, як выразаюць выцінанку на Лідчыне. Каравайніцы Ларыса Мудрацова і Зоя Юрчык са Слонімшчыны падзяліліся старажытнымі рэцэптамі і нават прывезлі гатовыя традыцыйныя пірагі.

Пад час дабрачыннай акцыі, зладжанай Гродзенскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці, былі сабраны і перададзены Гродзенскаму спецыялізаванаму Дому дзіцяці сродкі гігіены для немаўлят.

Яніна БАРЫСЕВІЧ, вядучы метадыст па выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Гродзенскага АМЦНТ

Гармата, якая вызваляла Столін.

Удзельнікі конкурсу “Шматдзетная сям’я года-2016”.

Столін/ Слова пра гармату

На Брэстчыне пад час акупацыі фашысты забілі і замучалі 198 384 чалавекі, у тым ліку — 65 533 жанчыны і 45 258 дзяцей, звезлі ў няволю 30 008 жыхароў вобласці.

У Століне ля ўвахода ў старадаўні парк стаіць помнік вызваліцелям райцэнтра — артылерыйская гармата. Вось што пра яе распавядаюць супрацоўнікі мясцовага краязнаўчага музея. Некалькі месяцаў цягнуліся пазіцыйныя баі. Напярэдадні рашаючага наступлення ля вёскі Струга сапёры пабудавалі мост праз наравістую Гарынь. У ноч з 6 на 7 ліпеня 1944-га да вечару працягваліся крывапралітныя баі. Трапным выстралам з гарматы быў знішчаны гітлераўскі назіральны пункт на званіцы столінскага касцёла. Ва ўсе часіны падобнае святатацтва дорага каштавала, але дзеля Перамогі людзі аддавалі самае дарагое…

Як пісаў у лісце камандзір гарматы 397-й стралковай дывізіі, Герой Савецкага Саюза, старшына Мікалай Аўсяннікаў, «пушкі кацілі ўручную, знішчаючы агнявыя кропкі праціўніка». У склад гарматнага разліку ўваходзілі тады Акбар Галіахметаў, Уладзімір Маркін, Раман Палагін, Дзмітрый Цуканаў.

Гармата, якая вызваляла Столін, завяршыла свой пераможны шлях у Берліне. А да 40-годдзя Вялікай Перамогі такая ж гармата была ўзнята з непраходных беларускіх балотаў на п’едэстал гісторыі.

Уладзімір ЖЫЛЕВІЧ
Фота аўтара

Вялікая Бераставіца / У трох намінацыях

Раённае свята-конкурс “Шматдзетная сям’я года-2016” адбыўся ў

наладзіла кантакт, працягвае супрацоўніцтва і сёння. Зноў жа хочацца адзначыць мудрасць такога падыходу, а галоўнае — выніковасць, бо дом фальклору ніколі не бывае пустым нават з улікам свайго асноўнага кірунку — вывучэння народнай творчасці. Гэтаму моманту Паліна прысвячае багата ўвагі, пералапачваючы літаратуру, прыгадваючы заняткі ва ўніверсітэце, спрабуючы збіраць інфармацыю ў старшага пакалення вёскі. Ну а дзякуючы Паліне гацучане вучацца рабіць абрадавыя лялькі, спяваць народныя песні, адрозніваць аўтэнтычнае ў святах. Нагадаю, спадарыня Панамарова — ураджэнка Расіі.

■■■

Вольнага часу ў дырэктара Гацукоўскага дома фальклору асабліва няма, таму і адсутнасць асаблівай інфраструктуры яна не заўважае. Дзяўчына падкрэслівае, што яе работа мае значна больш плюсаў, чым недахопаў. Усё тое, што яна не атрымлівае ў аграгарадку, кампенсуецца частымі паездкамі ў Мінск. "Думаю, я на сваім месцы. Не ведаю, каму было б лягчэй тут: мінчаніну ці выхадцу з іншага рэгіёна. Проста любому гнуткаму чалавеку, таму, хто ўмее адаптавацца. Выхад з зоны камфорту насцярожвае, але гэта не смяротна. Балазе, тут агромністая армія людзей, гатовых дапамагчы".

Паліна Панамарова пакуль не ведае, што зробіць праз паўтара гады, але запэўнівае: час, праведзены ў Гацуку на пасадзе дырэктара Дома фальклору, ужо стаў адным з самых яскравых адрэзкаў яе жыцця. Сюды яна будзе вяртацца зноў і зноў, калі ўвогуле зможа адсюль з'ехаць, бо заўсёды складана пакідаць улюбёную працу, аднадумцаў, сваю аўдыторыю, новых сяброў.

К

Пасля эканамічнага у... Дом рамёстваў

Сяргей МАКАРЭВІЧ, які вырас у Мінску, займаўся рамёствамі і танцамі ў Студэнцкім этнаграфічным таварыстве, працуе па размеркаванні ў Ганцавіцкім доме рамёстваў. Мы з Сяргеем пагутарылі на гуканні вясны ў Вязынцы. Там ён гандляваў вырабамі згаданай установы.

Алена ЛЯШКЕВІЧ / Фота аўтара

Сяргей Макарэвіч з гуртом вёскі Боркі падчас сумеснай вечарыны ў клубе, лета 2015 года.

— Як ты, мінчанін, патрапіў у Ганцавічы?

— Знайшоў адпрацоўку, хаця мая спецыяльнасць не звязаная з рамёствамі. Я вучыўся ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, спецыяліст па міжкультурных камунікацыях. З'явілася ідэя паехаць у Ганцавічы, балазе ў гэтым раёне жыве мая бабуля. Нешта паклікала… Размеркаванне прайшло ўвесну, у ліпені была экспедыцыя Студэнцкага этнаграфічнага таварыства на Ганцавіччыну. Падчас яе наладзіў кантакты, даведаўся, з чым давядзецца працаваць.

— Як паставіліся ва ўніверсітэце да такога незвычайнага запыту на размеркаванне?

— Нічога незвычайнага, запыт жа быў ад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. Складана адмовіць! Ды і прапанаваць альтэрнатывы ўніверсітэт не мог. Я спрабаваў шукаць сабе месца для адпрацоўкі ў Мінску. Зрэшты, і ў які-небудзь сталічны аддзел ідэалогіі мог бы размеркавацца на тыя ж тры мільёны. Але ж у Мінску іншыя выдаткі на жыццё…

— Што цябе чакала ў Ганцавічах, якія ўмовы?

— Прапаноўвалі пакой у інтэрнаце сельскагаспадарчага ліцэя, але плаціць за яго трэба было са свайго заробку, прыкладна столькі ж, колькі я зараз плачу за кватэру. Таму я вырашыў быць гаспадаром самому сабе. Хоць Ганцавічы і горад, ёсць пяціпавярховікі, але збольшага — прыватны сектар, і не дзіва нават у цэнтры калі-нікалі пабачыць пеўня!

— І чым займаешся па-за працай?

— Тку, шыю, вышываю — я сам майстар. Апрацоўваю матэрыялы той самай экспедыцыі.

— Распавядзі, калі ласка, пра сваю працу ў Доме рамёстваў.

— Я малодшы навуковы супрацоўнік. У дамах рамёстваў няма метадыстаў — толькі навуковыя супрацоўнікі і майстры. Наш будынак рамантуецца ўжо 2 гады, таму пакуль тулімся па іншых памяшканнях. Асабіста я працую з майстрамі, арганізоўваю выставы, мерапрыемствы для моладзі, для дзяцей. Таксама займаемся папулярызацыяй традыцыйных рамёстваў у горадзе. Ёсць у нас невялікая калекцыя, таму працую і з фондамі: яны збіраліся на працягу 20 гадоў, і ў 2017-м у Дома рамёстваў — круглая дата. Акрамя рэчаў, у фондах захоўваецца невялікі фотаархіў, відэазапісы. Даследчая праца таксама на мне, як і метадычная дапамога.

З вырабамі Ганцавіцкага дома рамёстваў.

— Як перасоўваешся па раёне?

— Калі на ўласнай машыне, калі на ровары. Усё ж машына — раскоша для маладога спецыяліста: карыстаюся, калі ёсць пільная патрэба. Чыгункай таксама езджу.

— Ці ёсць інтарэс да тваёй працы сярод насельніцтва раёна?

— Звяртаюцца, напрыклад, з такімі пытаннямі: "Я хачу ручнік на вяселле, парайце мне, што там лепш вышыць". У Дома рамёстваў ёсць яшчэ і камерцыйная функцыя. У нас працуе двое майстроў, адна з іх — народны майстар Беларусі Ніна Казак. Спецыялізуемся на вышыўцы, ткацтве. Ёсць яшчэ майстры ў раёне — рознай спецыялізацыі і ўзросту. Мы ўсім дапамагаем рэалізаваць прадукцыю. У Вязынку, напрыклад, прывёз вырабы, вязаныя шыдэлкам. Гэта не супрацоўнік Дома рамёстваў рабіў, а майстрыха Яўгенія Станкевіч, якая, праўда, у нас даўней працавала, а цяпер займаецца рамяством у вольны час.

— Ці ўдзельнічаеш у культурным жыцці раёна па-за працай з рамёствамі?

— На Масленку мы ладзілі фэст у вёсцы Боркі. Прыйшла такая ідэя, у прынцыпе, не новая, збірацца жыхарам вёскі разам, запрашаць гасцей. Падгледзелі трохі ў Любанскім раёне, дзе этнахарэограф Сяргей Выскварка ўжо ладзіў такое, вырашылі зрабіць у сябе. Арыентаваліся, у першую чаргу, на мясцовых людзей, запрасілі гасцей. Хацелася неяк актывізаваць тамтэйшых жыхароў, паказаць, што святы — гэта не толькі нейкія канцэрты, выступленні. Бабулі, дзядулі памятаюць, як раней збіраліся па хатах, гулялі, спявалі, танцавалі. Удалае атрымалася свята, — было больш за 100 чалавек. Гэта фальклорныя гурты з вёсак Боркі, Хатынічы, Раздзялавічы нашага раёна, а таксама гурты з Лунінецкага і Клецкага раёнаў, капэла "На таку" з Мінска. Клуб у Борках цяпер ператвораны ў Дом сацыяльна-культурных паслуг, там і прайшла вечарына. Мяркую, будзе працяг. Магчыма, у Борках, магчыма, у іншай вёсцы атрымаецца нешта арганізаваць. Улетку плануецца спеўны летнік сумесна са Студэнцкім этнаграфічным таварыствам.

■■■

Можна толькі парадавацца, што Ганцавіцкаму дому рамёстваў пашанцавала з маладым спецыялістам. Сяргей не паленаваўся прывезці на вязынкаўскі кірмаш не самыя малыя вырабы: падушкі, палавікі. У выніку, на свяце знайшлі сваіх гаспадароў два палавікі па 350 тысяч рублёў кожны. З захапленнем кажуць пра Сяргея мясцовыя работнікі культуры і носьбіты фальклору: "Сяргей Віктаравіч такі малады, а так шмат робіць для нас!" Але ці надоўга затрымаецца ў Ганцавічах малады спецыяліст, нават так сур'ёзна настроены, як Сяргей? На пытанне пра планы ён пасміхаецца ў вусы…

К

Бераставіцкім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці.

Гэта падзея стала ўжо добрай традыцыяй, якая дэманструе станоўчы вопыт сямейнага выхавання і садзейнічае павышэнню прэстыжу і аўтарытэту шматдзетнай сям'і ў грамадстве. Сёлета за званне лепшых замагаліся шматдзетныя сем'і з аграгарадкоў "Макараўцы", "Стары Дворац", "Массоляны", "Малая Бераставіца", "Вялікія Эйсманты" і з Вялікай Бераставіцы. Конкурсная праграма свята складалася з трох намінацый: «Візітная картка сям'і", "Вясёлка творчасці" і "Умелыя рукі".

Пераможцам стала сям'я Пянчук з Вялікай Бераставіцы, якая атрымала дыплом I ступені і грашовую ўзнагароду ў 12 базавых велічынь. Другое месца — у сям'і Яскевіч з Вялікіх Эйсмантаў, трэцяе прысуджана сям'і Манцэвіч з Макароўцаў.

Спонсарамі раённага конкурсу выступілі раённыя арганізацыі Беларускага фонду міру і грамадскага аб'яднання "Белая Русь".

Ірына МІКЛАШ
Фота аўтара

Бяспека жыцця

Не пакідайце дзяцей адных

З мэтай папярэджання надзвычайных сітуацый з удзелам дзяцей з 11 мая па 1 чэрвеня ў Мінску праходзіць рэспубліканская акцыя "Не пакідайце дзяцей адных!", да Міжнароднага Дня абароны дзяцей. Яна скіравана на працу са шматдзетнымі сем'ямі, дзіцячымі дамамі, дамамі сямейнага тыпу, а таксама сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Штогод вялікая колькасць дзяцей становяцца ахвярамі надзвычайных сітуацый з прычыны свайго няведання і легкадумнасці, а часцей за ўсё — па недаглядзе бацькоў. Дарослыя, пакідаючы дзяцей без нагляду на некалькі хвілін, проста не задумваюцца аб тым, што можа адбыцца бяда. І за лічаныя хвіліны здараюцца трагедыі.

У мінулым годзе няшчасныя выпадкі забралі жыцці 149 дзяцей. На 49 менш, чым у 2014 годзе. Але гэта ўсё роўна нямала, улічваючы, што ў большасці выпадкаў дарослыя маглі прадухіліць трагедыю. Па іх недаглядзе дзеці глытаюць іншародныя прадметы, тонуць у басейнах і ванных, атрымліваюць смяротныя апёкі, трапляюць пад колы аўтамабіляў.

Дзеці, асабліва маленькія, часцей за ўсё атрымліваюць траўмы дома. Пакінутыя на краі пліты гарачыя каструлі, небяспечныя прадметы (нажы, нажніцы, запалкі), лекі (таблеткі, мікстуры), незамацаваныя паліцы, адкрытыя вокны — пералічваць можна бясконца. Бацькі часцей за ўсё нават не могуць выказаць здагадку, што дзіця дабярэцца да цікавага яму прадмета. Але ж нават двухгодка ў стане прыцягнуць табурэтку, залезці на падваконнік, адкрыць акно… І вельмі рэдка падзенні з вокнаў засканчваюцца спалохам і нязначнымі траўмамі для дзіцяці…

Бацькам абавязкова трэба ўлічваць і тое, што маленькія дзеці "спрабуюць на зуб" усё, што трапляецца пад руку, у тым ліку і небяспечныя прадметы, напрыклад, батарэйкі (гаворка ідзе пра плоскія адзінкі дыяметрам да 1,5 см). А ў дзіцячых цацках, гадзінніках гэты элемент сілкавання вельмі часта выкарыстоўваецца. Выцягнуць батарэйку запатрабуе часу ў цікаўнага дзіцяці, але не складзе адмысловай працы. Натуральна пасля вымання "здабычу" малеча пацягне ў рот. Як кажуць лекары, цяжар пашкоджанняў залежыць ад таго, зараджаны ці не элемент сілкавання і як доўга ён знаходзіўся ўнутры. У большасці выпадкаў пасля вымання батарэйкі дзеці застаюцца інвалідамі. У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры дзіцячай хірургіі дзяцей з іншародным целам у страўніка-кішэчным тракце дастаўляюць практычна штодня. Да ўсяго, сур'ёзныя атручванні малечы атрымліваюць пры "дэгустацыі" небяспечных вадкасцяў (бытавой хіміі, воцату). І тут, са слоў лекараў, наступствы несуцяшальныя: цяжкія апёкі стрававода, а часам і яго выдаленне.

Не меншую небяспеку ўяўляюць і магніты, а больш дакладна — магнітныя шарыкі, якія выкарыстоўваліся ў дзіцячых канструктарах. Як сцвярджаюць медработнікі, некалькі гадоў таму гэта было сапраўднай катастрофай. Толькі пасля звароту медработнікаў да вытворцаў магнітныя цацкі пачалі выпускаць у спецыяльных абалонках і выключна вялікіх памераў. Дзякуючы настойлівасці медыкаў знікла з продажу і воцатная эсэнцыя, якая не раз станавілася прычынай інваліднасці дарослых і дзяцей.

Адназначна можна сказаць, што траўмы малых — гэта цалкам віна бацькоў. Але і ў дзяцей малодшага школьнага веку траўмаў і калецтваў нямала з той самай прычыны — адсутнасці кантролю з боку дарослых. Як толькі дзеці становяцца больш ці менш самастойнымі, узрастае і колькасць траўмаў.

Яшчэ адна даволі распаўсюджаная прычына траўмаў — гэта выкарыстанне дзецьмі лёгкіх на ўзгаранне вадкасцяў. Тут, вядома ж, галоўныя "фігуранты" хлопчыкі. І што толькі яны не робяць — і запальнічкі запраўляюць, і наяўнасць бензіну ў каністры правяраюць з дапамогай запалкі, а часам увогуле ладзяць цыркавыя нумары.

Напярэдадні летнія канікулы, дзеці адправяцца адпачываць у вёскі, на дачы. Тут, акрамя небяспекі на дарогах, дадаецца яшчэ адна — вадаёмы. У летні перыяд колькасць выпадкаў гібелі дзяцей на вадаёмах ўзрастае. Галоўная прычына — адсутнасць бацькоўскага кантролю. Але не заўсёды і прысутнасць бацькоў гарант бяспекі дзіцяці. Летась былі сітуацыі, калі дзеці танулі на вачах у сваіх бацькоў. Віной таму — звычайная чалавечая бестурботнасць і ўпэўненасць, маўляў, са мной нічога не адбудзецца.

Праблема гібелі і траўматызму дзяцей на пажарах не менш актуальная. Дзіцячыя "эксперыменты" з запалкамі, запальнічкамі прыводзяць да вялікіх матэрыяльных страт. Але часцей за ўсё заканчваюцца пагібеллю. Чаму небяспечныя прадметы аказваюцца ў руках дзяцей? Тут адказнасць цалкам кладзецца на бацькоў. Практычна ва ўсіх выпадках дзеці знаходзіліся дома адны.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст Савецкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях горада Мінска

А ў чым ваша "фішка"?

Сусветна вядомы беларускі віяланчэліст Іван Карызна робіць тур па Беларусі. Нагадаем, летась ён разам з такім жа зорным піяністам Кірылам Кедуком аб'ехаў 27 нашых гарадоў. Цяперашняя праграма — іншая: гэта яго сольны вечар з аркестрам "MuzzicDom Orchestra" і, часткова, з яшчэ адным маладым віяланчэлістам, лаўрэатам міжнародных конкурсаў, студэнтам нашай Акадэміі музыкі Міхаілам Радунскім.

Надзея БУНЦЭВІЧ

У той час, як абласныя філармоніі радасна рапартуюць пра свае здзяйсненні ("К" № 16), абодва туры ладзіліся прыватным чынам. Мабыць, таму ніхто з філарманічных кіраўнікоў, падводзячы леташнія вынікі, ні слоўцам не абмовіўся, што на яго сцэне выступала такая знакамітасць: маўляў, канцэрт не наш, і чужой славы нам не трэба. Геаграфія цяперашніх гастроляў — Баранавічы, Гродна і, вядома, Мінск. Залы паўсюль — нефіларманічныя: універсітэт, драмтэатр, Палац культуры прафсаюзаў, дзе давялося пабываць і мне. Назва тура — "Сіла класікі "Volkswagen". Згаданая кампанія аказала падтрымку, асноўныя ж клопаты ляглі на Музычны дом "Класіка", які не ўпершыню папулярызуе нацыянальныя музычныя дасягненні сусветнага маштабу. Дастаткова згадаць хаця б колішнюю пастаноўку оперы Станіслава Манюшкі "Слова гонару", зладжаную з маладым дырыжорам Іванам Касцяхіным.

Канцэрт № 2 Ёзафа Гайдна Ваня выконваў неяк раней, але цяпер прагучала зусім іншае прачытанне той жа музыкі. Аркестравы ўступ падаўся амаль моцартаўскім па выкананні, залішне вытанчана ўзнёслым — ажно да сентыментальных уздыхаў. Але саліст адразу ўнёс менавіта гайднаўскія "зямныя" ноткі. Карызна іграў вельмі проста, без аніякіх знешніх эфектаў, калі самыя шалёныя пасажы ўспрымаюцца як штосьці цалкам натуральнае і нават "прахадное" ад адной "падзейнай" ноты да другой. У другой павольнай частцы мы напоўніцу змаглі ацаніць ясны, выразны і адначасова па-класічнаму строгі гук. У фінале замест юначай заліхвацкасці з'явілася тое няўлоўнае гайднаўскае "бюргерства", адметнасць гэтага кампазітара.

Канцэрт Антоніа Вівальдзі для дзвюх віяланчэлей з аркестрам скарыў сапраўднай барочнай энергетыкай. Твор выконваўся без дырыжора, як гэта і было прынята ў тыя часы, калі тон аркестру задавалі салісты. Іх дасканалае пачуццё ансамблю адразу выдавала, што абодва вучыліся ў аднаго педагога — прафесара, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь, кавалера ордэна "Акадэмічныя пальмы" (Францыя), нязменнага кіраўніка Канцэртнага камернага аркестра гімназіі-каледжа пры Акадэміі музыкі Уладзіміра Перліна. У другой частцы салісты склалі цудоўнае трыа з канцэртмайстрам групы віяланчэляў аркестра Станіславам Петчанкам. У трэцяй — уразілі вельмі лёгкім, палётным гукам, недасягальным для большасці музыкантаў, якія звычайна "спецыялізуюцца" на музыцы рамантызму.

Але ж як змяніўся тэмбр усё той жа віяланчэлі, выраблена французскім майстрам Бернардэлем у 1867 годзе, у другім аддзяленні, дзе выконваліся творы пазнейшых стагоддзяў! Яно пачалося, як аб'явіў сам герой вечарыны, з даніны памяці пра Чарнобыль, бо канцэрт прыпадаў акурат на 30-годдзе з дня аварыі. "Элегія" Габрыэля Фарэ гучала без аніякага надрыву, з вялікім густам і пранікнёнай філасафічнасцю. У найскладаным Канцэрце Роберта Шумана, які нядаўна папоўніў рэпертуар Івана, гук стаў яшчэ больш насычаным, сакавітым, "густым" — бы тэмперныя фарбы, а не ўласцівыя музыцы Вівальдзі акварэльныя. Але зноў — ніякіх знешніх эфектаў, толькі самапаглыбленне ў музыку, разгортванне якой падобнае да плыні жыцця.

Бываюць музыканты, якіх трэба "слухаць вачыма": у аўдыёзапісу ўсё іх зачараванне знікае. А ў Івана Карызны выразнасць дасягаецца выключна музычнымі сродкамі, рухі ж адыгрываюць найперш функцыянальную ролю, не адцягваючы на сябе ўвагу. Таму, мабыць, і ўзнікае адчуванне боскай гармоніі пачутага і ўбачанага.

На "біс" быў выкананы твор сучаснага італьянскага кампазітара і віяланчэліста Джавані Саліма "Вібруйце, віяланчэлі", які сабраў разам усіх удзельнікаў вечарыны. У гэтай буйной партытуры з элементамі мінімалізму хапала стылёвых спасылак на гістарычнае развіццё віяланчэльнай (і, шырэй, струннай) музыкі, былі задзейнічаны розныя віды тэхнікі, усё багацце штрыхоў, ансамблевых перазоваў, а выразная інтанацыйная аснова спалучалася з яркай кампазітарскай канцэпцыяй. Слухаючы гэты твор, паспрабавала прыгадаць беларускі аналаг — і не знайшла. Ну не пішуць у нас так, а тым больш для дзвюх віяланчэляў са струнным аркестрам! Раптам падумалася: калі ў нас ёсць такія выканаўцы, чаму б не аб'явіць кампазітарскі конкурс на п'есы менавіта для іх?

І яшчэ адна думка не давала спакою — пра суадносіны дзяржаўных і прыватных калектываў і ўстаноў. З аднаго боку — ура! Мамантавы і Зіміны, што зрабілі некалі вялікі ўнёсак у развіццё музычнай культуры канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, вяртаюцца. З іншага ж… У той час, як дзяржаўныя ўстановы вымушаны дбаць пра зараблянне грошай, прыватныя "могуць сабе дазволіць" задумацца пра вечнае, выхоўваць нацыянальна-патрыятычныя пачуцці, папулярызаваць айчынных творцаў — не па разнарадцы, а па загаду душы. Дык у чым тады "фішка" дзяржаўных? У выкананні даведзеных планаў? Не ведаю… Але разумею адно: тых дзеячаў, якія бачуць сваю місію ў падтрымцы нацыянальнага мастацтва і адраджэнні агульнай культуры, трэба на руках насіць — дзяржаўныя яны ці прыватныя.

К

Яны былі… дакладнымі

25 — 26 красавіка ў тэатральнай гасцёўні Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа праходзіў конкурс "Сцэнічныя чытанні "Школьны тэатр-20". Прадстаўнічае журы на чале з загадчыкам кафедры рэжысуры, дацэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Віталём Катавіцкім вызначала лепшых.

Сцэны са спектакляў "Дагарэла свечачка…" (СШ № 10), "Стомлены д'ябал" ("Тэатр цудаў" СШ № 45). / Фота Наталлі ЯРМОЛАВАЙ

Сцэнічныя чытанні школьнікаў у дэталях

Ён жа правёў пад час другога дня фестывалю майстар-клас для абітурыентаў — выпускнікоў віцебскіх школ, азнаёміў іх з некаторымі асаблівасцямі паступлення і навучання ў акадэміі, адказаў на пытанні падлеткаў. Мы ж папрасілі яго падзяліцца ўражаннямі ад сёлетняга конкурсу:

— У Віцебску на "Школьным тэатры" я не ўпершыню. Але мінулы мой прыезд адбыўся дастаткова даўно. Хачу адзначыць, што змены адбыліся. Па-першае, на прафесійным узроўні. Усе калектывы працуюць больш дасканала менавіта ў кірунку акцёрскага майстэрства. Юныя артысты сталі больш разняволенымі, некаторыя нават здзівілі ўменнем уступаць у зносіны, узаемадзейнічаць на сцэне, бачыць і чуць партнёра, што з'яўляецца рэдкасцю і ў прафесійных выканаўцаў. Яны былі дакладнымі, а не толькі эмацыйнымі, як гэта часцяком бывае ў самадзейнасці.

Адна з галоўных асаблівасцей сёлетніх чытанняў палягала ў тым, што пераважалі спектаклі аўтарскія, гэта значыць, нават літаратурная аснова нараджалася ў школьных калектывах. Асобныя педагогі — самі ці супольна з выхаванцамі — бяруцца за стварэнне арыгінальных п'ес, інсцэніровак, і ў некаторых з іх, зазначым, гэта атрымліваецца. Магу назваць тую ж Аляксандру Раманаву, кіраўніка ўзорнай тэатральнай студыі "Дарослыя дзеці" віцебскай гімназіі № 8, якая летась атрымала Гран-пры за вельмі кранальны і шчымлівы спектакль "Ідэальныя людзі" пра цыркавых артыстаў. Сёлета яна прапанавала свой новы драматычны твор — "Невядомую справу Шэрлака Холмса". Цягам спектакля юныя дэтэктывы расследуюць таемную "крымінальную справу": знікненне… снегавіка. Для іх гэта цікавая гульня, менавіта таму рэжысёр, яна ж аўтар п'есы, карыстаецца найперш прыёмамі і сродкамі "іграва тэатра". Пры ўсім тым ёсць спроба (і даволі ўдалая) зразумець псіхалогію падлетка, які праз гульню, праз іранічны погляд на свет, на людзей спрабуе адмовіцца ад пэўных стэрэатыпаў дарослага чалавека. Спектакль, пабудаваны на акцёрскай імправізацыі, атрымаўся вельмі дасціпным і разумным, заняўшы II месца, а юны Шэрлак Холмс (Анатоль Сухаў) атрымаў дыплом за лепшую мужчынскую ролю.

Яшчэ адной асаблівасцю сёлетніх чытанняў я назваў бы той факт, што юныя артысты бралі альбо самі стваралі п'есы, героі якіх іхнія ж аднагодкі, мо таму іх перажыванні, учынкі здаваліся падлеткам асабліва блізкімі, а інтанацыя спектакляў атрымалася вельмі шчырай, вобразы — арганічныя, праўдзівыя, пераканаўчыя. Пераважала ж у гэтых спектаклях тэма кахання, якое, нягледзячы на перашкоды, жорсткасць, зайздрасць, усё ж перамагае. Сярод іх можна назваць пастаноўкі "Мост у цішыню" Вікторыі Грэцкай (драматычны гурток "Аншлаг" сярэдняй школы № 21, кіраўнік Святлана Карпенка, I месца), "Калі ў сэрцы жыве каханне" Кацярыны Дорміной (школьны тэатр СШ № 28, кіраўнік Зоя Таранеўская, III месца). Гэтыя спектаклі зрабілі добрае ўражанне прыстойнай рэжысёрскай, пастановачнай культурай, здольнасцю правільна арганізаваць прастору. Апошні ўзнімае яшчэ і праблему фармальнага (школьнага, сямейнага) выхавання дзяцей і падлеткаў, у выніку чаго спараджаецца іх цынізм, абыякавасць, жорсткасць, сучасны прагматызм, адмова ад духоўных каштоўнасцей.

Асновай аўтарскага спектакля "Дзіцячая пляцоўка" Таццяны Быкавай, кіраўніка тэатральнага калектыву "Прэм'ера" гімназіі № 1, стала аднайменнае апавяданне Рэя Брэдберы, праўда, істотна перапрацаванае. Вытокі чалавечай жорсткасці, на яе думку, трэба шукаць у дзіцячых крыўдах дарослых людзей, у несправядлівых пакараннях, беспадстаўных прыніжэннях дзяцей бацькамі альбо выхавацелямі, якія справакавалі іх дарослыя заганы, памылковае ўяўленне, што праз гвалт над асобай можна чагосьці дамагчыся. Спектакль атрымаў галоўны прыз конкурсу, бо ў ім спалучылася ўсё: адметная рэжысура, выдатная пластыка, харэаграфія, касцюмы і, вядома ж, яркія акцёрскія работы, пэўныя прыкметы ансамблю.

Апрача аўтарскіх спектакляў, на сцэнічных чытаннях быў прадстаўлены шэраг работ па творах вядомых беларускіх пісьменнікаў, некаторыя з якіх ужо сталі класікамі. Так, героі Уладзіміра Караткевіча з аповесці "Лісце каштанаў" ажылі ў прачытанні ўзорнага тэатральнага калектыву "Прэм'ера" Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Кастрычніцкага раёна Віцебска (кіраўнік — Паліна Паўлыга). Твор складаны, бо для сённяшніх юнакоў і дзяўчат вельмі няпроста занурыцца ў той пасляваенны час, зразумець яго жорсткасць і, разам з тым, узвышаны рамантызм герояў. Спектакль атрымаў I месца, падзяліўшы яго з "Мостам у цішыню".

Даволі часта сцэнічныя калектывы, як прафесійныя, так і аматарскія, звяртаюцца да фантасмагорыі Сяргея Кавалёва "Стомлены д'ябал" ("Тэатр цудаў" СШ № 45, кіраўнік — Канстанцін Ганчароў). Праўда, лічу, што для дзіцячага калектыву гэта даволі складаны матэрыял, бо ёсць рызыка за фарсавасцю, яскравай камедыйнасцю сюжэтных сітуацый, герояў не заўважыць той унутраны змест, які хавае п'еса. Журы ацаніла арыгінальнасць рэжысёрскай задумы (д'ябал у спектаклі існуе ў жаночым абліччы, да таго ж , так б мовіць, у множным ліку) і яскравую, я зазначыў бы, дакладную акцёрскую работу Вагіфа Мірзоева, які стварыў яскравы вобраз Яські (дыплом за лепшую мужчынскую ролю).

І яшчэ пра адзін спектакль. "Дагарэла свечачка…" паводле п'есы Алеся Петрашкевіча, пастаноўка якой прысвечана 30-годдзю Чарнобыльскай катастрофы. У цэнтры спектакля — вобраз старой Марфы, якая адмаўляецца пакідаць сваю хату і жыўцом спальвае сябе ў ёй. У яе працяглых расповядах, дзе яна звяртаецца то да самой сябе, то да родных, сваякоў, якія пайшлі з жыцця, то да шалапутнай пляменніцы Любкі, узнікае поўная трагізму гісторыя беларусаў, на чыю долю цягам савецкага перыяду гісторыі XX стагоддзя лёг цяжар страшэнных выпрабаванняў. Юная актрыса Кацярына Піталенка (дыплом за лепшую жаночую ролю) паспрабавала далучыцца да складанага (прынамсі, па ўзросце і жыццёвым досведзе) вобраза.

У заключэнне хацелася б выказаць словы падзякі тым людзям, якія 20 гадоў таму пачыналі і вялі складаную фестывальную справу, на якіх падзея доўгія гады трымалася. Гэта колішняя загадчык літаратурнай часткі Коласаўскага тэатра Святлана Дашкевіч і былы рэжысёр сцэнічных чытанняў, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Грушоў. Іх шматгадовая праца была адзначана дыпломамі "За значны асабісты ўклад у развіццё школьнага тэатральнага руху горада Віцебска".

Юрый ІВАНОЎСКІ,
літаратурны рэдактар
Нацыянальнага акадэмічнага
драматычнага тэатра
імя Якуба Коласа,
сакратар журы

КАЗАХСТАН, ЛІТВА, ПОЛЬШЧА, РАСІЯ

Абрады ці “Зорныя войны”?

З 29 красавіка па 1 мая ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў у рамках Года культуры адбылася X Міжнародная навуковая канферэнцыя “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання”. Пленарныя і секцыйныя пасяджэнні, XIII этнаграфічны канцэрт “Фальклор беларускай глыбінкі” і выступленні маладзёжных фальклорных гуртоў, майстар-класы вядучых спецыялістаў, а таксама экскурсія ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту на мастацкую рэканструкцыю валачобнага абраду беларусаў... Тым часам “К” прадстаўляе вытрымкі з дакладаў некаторых замежных спецыялістаў, якія выступілі на гэтым прадстаўнічым форуме, каб даць пэўны спектр тэм, цікавых фалькларыстам замежжа.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Богдан МАТЛАЎСКІ, доктар габілітаваны, прафесар, загадчык кафедры Заходняй Польшчы і Скандынавіі факультэта этналогіі і антрапалогіі культуры Шчэцінскага ўніверсітэта (Польшча):

— Даследванне гісторыі стварэння і функцыянавання фальклорных спеўных гуртоў і капэлаў у культуры Заходняй Памераніі ў 1945 — 1990 гады выклікае вялікую цікавасць у навукоўцаў. Справа ў тым, што гэты рэгіён знаходзіцца на мяжы з Германіяй і мае свае адметныя рэгіянальныя асаблівасці. Да таго ж, Заходняя Памеранія раней не ўваходзіла ў склад Польшчы — была нямецкай тэрыторыяй. Такім чынам, гісторыя даследавання гэтага краю з боку польскіх навукоўцаў налічвае на сёння прыкладна 70 гадоў.

Менавіта з сярэдзіны 1940-х тут пачалі ствараццa спеўныя гурты, якія адрозніваліся адзін ад аднаго не толькі сваёй рэгіянальнай культурай, але і традыцыйнай музыкай, рэпертуарам, манерамі выканання, а таксама музычнымі інструментамі, на якіх гралі музыкі.

Натуральна, сапраўдных, аўтэнтычных музыкантаў не так шмат, яны, можна сказаць, свайго кшталту прадстаўнікі “творчай эліты”. Але за дзясяткі гадоў функцыянавання гэтых калектываў яны сталі сапраўднай з’явай народнай культуры гэтага рэгіёна, якую сёння можна вывучаць і даследаваць…

Ігар МАЦІЕЎСКІ, кампазітар, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, акадэмік Расійскай Акадэміі прыродазнаўчых навук, загадчык Сектара інструментазнаўства Інстытута гісторыі мастацтваў, заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны і Польшчы (Санкт-Пецярбург, Расія):

— Тэма музычных сімвалаў абрадаў пераходу вельмі багатая і разнастайная. Скажам, першы крык дзіцяці пасля нараджэння — гэта той знак, той своеасаблівы пераход у іншы, жыццёвы свет, які адчуваецца немаўляткам адразу. Прыкладна па такой жа схеме пабудаваны і многія народныя звычаі і абрады.

Скажам, вясельныя спевы часта гавораць пра змену статусу маладога і маладой, а многія абрады падчас гэтых святочных дзён вяселля падкрэсліваюць гэты пераход у іншы стан у шматкроць. І такі ж самы пераход падкрэсліваецца ў многіх галашэннях многіх народаў, а таксама ў час пахавальнага абраду.

Менавіта пра пераход у іншы жыццёвы статус сведчыў і колішні старадаўні абрад ініцыяцыі, пасля якога хлопчык мог як дарослы прымаць удзел у розных мужчынскіх справах. Але, натуральна, спачатку адбывалася паступовае навучанне будучага мужчыны, воіна і гаспадара ў сям’і…

Вітаўтас ЛУКШАС, магістр мастацтваў, старшыня клуба мастацтваў “Kaukoras” (Вільнюс, Літва):

— На жаль, літоўскі эпас не дайшоў да нашага часу, як, напрыклад, карэла-фінская “Калевала” ці сярэднявечная нямецкая “Песня пра Нібелунгаў”. Таму адным з напрамкаў дзейнасці нашага клуба з’яўляецца аднаўленне такога гіпатэтычнага літоўскага эпасу, ягоная візуалізацыя з дапамогай нейкіх абрадаў, спеваў і танцаў.

Так, гэта даволі цяжка зрабіць, і цалкам магчыма, што створаны намі эпас — нешта накшталт казачнага расповеду з “Уладара Пярсцёнкаў” ці нават “Зорных войнаў”. Але, лічу, нашы высілкі не марныя: на нашы абрады, на нашы візуалізацыі казак прыходзяць людзі, цікавяцца імі, і гэта дае нам сілы працаваць далей...

Руслан КАЙШЫБАЕЎ, магістр мастацтваў, кіраўнік фальклорнага ансамбля “Айнаколь” (Какшэтаў, Казахстан):

— Фальклор Паўночнага Казахстана вельмі багаты і разнастайны. Складнікам гэтага аўтэнтычнага багацця з’яўляюцца аўтэнтычныя спевы, якія выконваліся на многіх народных інструментах, з якіх найбольш вядомай з’яўляецца домбра. А зараджэнне такіх спеваў, як вядома, ідзе з глыбіні стагоддзяў, і іхняму з’яўленню паспрыяла традыцыя шаманізму, дзе ў шмат якіх абрадах выкарыстоўваліся спевы і гранне на музычных інструментах.

Напрыклад, сёння ў Казахстане вядомая творчасць Курмангазы, Даўлеткерэя, Казангапа, Біржана, Ахана і многіх іншых стваральнікаў музычных кампазіцый. Гэтыя імёны ўвайшлі ў гісторыю не толькі казахскай, але і сусветнай музычнай культуры. Іх творчасць, якая вызначаецца яркай індывідуальнасцю стылю, характэрным вобразным строем, як я лічу, уваходзіць у класічную скарбонку казахскай музычнай культуры.

На здымках: фрагмент рэканструкцыі валачобнага абраду ў музеі народнай архітэктуры і побыту; выступленне гасцей фэсту з Казахстана.

Фота Вячаслава КАЛАЦЭЯ

К

ІТАЛІЯ

“Арыведэрчы” ненадоўга

Чым адрозніваюцца бубеншчыкі?

Амаль год таму ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, напэўна, прамаўляліся словы “арыведэрчы” ды “чао”: мінская публіка развітвалася з італьянскім гуртом “I Tamburellisti di Otranto” (“Бубначы з Атранта”). Праўда, расстанне аказалася нядоўгім: у красавіку гэты ансамбль, у склад якога ўваходзяць юныя музыканты, што спяваюць, танчаць ды, натуральна, граюць на бубнах, пры падтрымцы пасольства Італіі ў рамках творча-адукацыйнага праекта “Мост дружбы: Беларусь — Італія” паказаў праграму “Музыка душы” з удзелам і беларускіх калектываў.

Масіма Панарэза і “Бубначы з Атранта”.

Алег КЛІМАЎ

Гледачы змаглі пазнаёміцца з народным мастацтвам рэгіёна Салента, які “Бубначы...” і прадстаўляюць, ды музыкай Італіі наогул. А я яшчэ сустрэўся з арганізатарам гурта Масіма Панарэза (М.П.) ды кіраўніком міжнароднага музычнага фестывалю “La Notte della Taranta” (“Ноч Таранты”) Луіджы Кірыяці (Л.К.).

— Што, на ваш погляд, павінен адчуваць глядач на выступе ансамбля “Бубначы з Атранта”?

М.П.: — Любоў да таго, што мы робім. Да інструмента, на якім граюць дзеці. Тое прыносіць радасць і ім самім, і публіцы, залучаючы яе ў канцэртнае дзейства. Гэта галоўны наш мэсідж — каханне, яднанне людзей. Калі я бачу, як падлеткі ў зале адкладаюць свае гаджаты ды з цікавасцю пачынаюць глядзець на тое, што адбываецца на сцэне, шчыра радуюся. Спадзяюся, яны становяцца духоўна багацейшымі ў такія хвіліны, бо тое, чым мы займаемся, гэта не бізнес — тым больш штука вельмі небяспечная, калі ў яго спрабуюць уцягнуць дзяцей. Мы, як гэта ні пафасна прагучыць, нясем грамадству культуру.

— Бубен — інструмент вельмі... дэмакратычны, ці не так?..

М.П.: — Вядома ж! У нашым ансамблі ёсць дзеці і з паспяховых сем’яў, і з сацыяльна небяспечных — прадстаўнікі розных слаёў насельніцтва, карацей. І ёсць бубен — даступны для ўсіх інструмент, для бедных ды багатых. 7 гадоў таму, калі ствараўся праект, я разглядаў яго не надта сур’ёзна. А да цяперашняга часу ён ператварыўся ў прыкметную рэалію нацыянальнага маштабу. Цяпер мне хочацца, каб ён жыў доўга, каб пра яго як мага больш ведалі не толькі ў Італіі, але і за яе межамі.

— Колькасць удзельнікаў гурта пастаянна вар’іруецца. У залежнасці ад пляцовак, на якіх ён выступае?

М.П.: — Больш правільна будзе адзначыць, што на мае ўрокі ігры на бубне наведвае больш за 400 чалавек. Кагосьці хапае на 2 месяцы, а іншы ўліваецца менавіта ў склад ансамбля. Мая пазіцыя такая: калі нават дзіця не валодае асаблівым талентам, няхай усё роўна лепш прыходзіць на курсы, чым боўтаецца немаведама дзе. Мая задача — выклікаць у дзіцяці адчуванне, што тое, чым яно займаецца, — справа вельмі важная і для яго самога, і для іншых людзей. У мінулы мой прыезд у Мінск мне ўдалося папрацаваць з беларускімі дзецьмі. Яны ў вас вельмі... сур’ёзныя. Але ў працэсе зносін, заняткаў яны прыкметна разняволіліся і гэтым разам сустрэлі мяне ўсмешкамі.

— Колькі гадоў самаму маленькаму вашаму артысту?

М.П.: — У мінулым верасні да пачатку новага навучальнага года мы давалі канцэрт у Рыме, на ім прысутнічаў прэзідэнт Італьянскай Рэспублікі. Дык вось, там і прадставілі самага юнага артыста ансамбля: яму 2 гады. Гранічны жа узрост удзельнікаў гурта — 12 — 13 гадоў. А адной з першых на мае курсы запісалася Марыя К’яра Тома: тады ёй было 3 гады, а сёння яна — прыма. Дзякуючы ў тым ліку і ёй у ансамблі пануе вельмі дружная ды цёплая атмасфера: старэйшыя, лідары ніколі не дазваляюць сабе папракаць іншых за непазбежныя памылкі, а дапамагаюць справай ды словам.

— Што з сябе ўяўляе народная творчасць рэгіёна Салента?

Л.К.: — Яна вельмі сінтэтычная з-за таго, што побач знаходзяцца такія краіны, як Албанія, Грэцыя, Турцыя. Розныя культуры ды мастацтва на працягу многіх стагоддзяў аказвалі самы непасрэдны ўплыў на фарміраванне фальклору Салента. (Плюс, натуральна, культура, мастацтва самой Італіі.) У народнай музыцы Салента чутныя, напрыклад, і адгалоскі арабскіх матываў.

— А пра што спяваецца ў вашых аўтэнтычных песнях?

Л.К.: — Напэўна, пра тое ж, пра што і ў аўтэнтычных песнях любой іншай краіны. Пра што беларускія песні?

— Пра родны край, пра каханне, пра цяжкую сельскую працу...

Л.К.: — Вось! Пра жыццё звычайнага чалавека з натуральнымі эмоцыямі, з простымі пачуццямі. Узяць традыцыю тарантызму, якой вядомая наша зямля. Шматлікія стагоддзі яе культывавалі жанчыны, якія жадалі вызваліцца ад уласных праблем — ад сацыяльных да асабістых. І, калі пачынаць філасофстваванне, сваю пазіцыю яны даносілі да грамадства і з дапамогай танца піцыка (разнавіднасць знакамітай тарантэлы). На побытавым жа ўзроўні нараджэнне яго звязваюць з укусамі тарантулаў, ахвярамі якіх былі жанчыны, што займаліся зямельнымі працамі. Адчуўшы на сваім целе павука, яны пачыналі, лічы, шалёныя скокі, танчылі да таго часу, пакуль тарантул не спадаў з іх і, раздушаны, не гінуў. Гэта значыць, паралелі відавочныя: жанчына вызваляецца ад зла, ад усяго дрэннага, што ёй перашкаджае. У Салента, дарэчы, не першы год праходзіць міжнародны музычны фэст “La Notte della Taranta” (“Ноч Таранты”).

— А ў Беларусі ёсць “Ноч музеяў”...

М.П.: — У Італіі таксама праходзіць такая акцыя!

К

Страта*

Памяці Ігара Мікалаевіча Бабака

(5.02.1960 — 2.05.2016)

2 мая 2016 года раптоўна пайшоў з жыцця Ігар Мікалаевіч Бабак, намеснік старшыні Канфедэрацыі творчых саюзаў Рэспублікі Беларусь.

Ігар Мікалаевіч нарадзіўся 5 лютага 1960 года ў горадзе Днепрапятроўску. Скончыў Ваенны Чырванасцяжны інстытут Міністэрства абароны СССР у Маскве ў 1982 годзе з кваліфікацыяй "Замежныя мовы: кітайская англійская, перакладчык-рэферэнт кітайскай і англійскай, афіцэр з вышэйшай ваенна-палітычнай адукацыяй". З 1993 па 2007 год працаваў у сістэме Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, у тым ліку двойчы ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. З 2001 па 2007 год з'яўляўся саветнікам па гандлёвых і эканамічных пытаннях Пасольства Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, быў Прадстаўніком Беларускай гандлёва-прамысловай палаты ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы. З 2014 года праца І.М. Бабака ў Канфедэрацыі творчых саюзаў унесла значны ўклад у развіццё сяброўскіх адносін і дзелавых і партнёрскіх сувязяў паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь, а таксама аказала вялікі ўплыў на папулярызацыю беларускай культуры ў далёкім замежжы. Дзякуючы асабістаму ўдзелу І.М. Бабака 31 ліпеня 2015 года ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася цырымонія падпісання дамовы аб супрацоўніцтве паміж Канфедэрацыяй творчых саюзаў Беларусі і Асацыяцыяй культуры і мастацтва Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Па ініцыятыве І.М. Бабака неаднаразова былі арганізаваны выставы і пленэры беларускіх мастакоў і скульптараў, выступленні вядомых музычных дзеячаў Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Пад яго кіраўніцтвам штогод ладзіліся выставы вядомых кітайскіх мастакоў у музеях Рэспублікі Беларусь, быў сфарміраваны кітайскі стэнд на Міжнароднай кніжнай выставе ў г. Мінску.

За сваю дзейнасць І.М. Бабак быў адзначаны наступнымі ўзнагародамі: Ганаровай граматай Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Падзякай Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, сярэбраным медалём 15-годдзя дыпламатычных адносін Беларусь — Кітай.

У апошні час Ігар Мікалаевіч займаўся прыцягненнем да ўдзелу вядомых кітайскіх музычных дзеячаў у Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Энергічны, інтэлігентны, актыўны чалавек, спецыяліст вышэйшага класа, Ігар Мікалаевіч назаўсёды застанецца ў памяці родных, блізкіх, сяброў, беларускіх і замежных калег светлым чалавекам, які паспеў зрабіць многае. Калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім Ігара Мікалаевіча.

Пытанні па прыёме, размяшчэнні і забеспячэнні беларускіх грамадзян у эвакуацыі вырашаліся аддзелам па працы з эвакуіраваным насельніцтвам пры Савеце Народных Камісараў Беларускай ССР. Грашовую аднаразовую дапамогу атрымлівалі эвакуіраваныя дзіцячыя дамы, параненыя партызаны, дастаўленыя ў савецкі тыл на лячэнне, іншыя грамадзяне, якія апынуліся ў цяжкім становішчы... Звярталіся па яе і беларускія дзеячы навукі, культуры ды мастацтва. Хто яны, якія абставіны вымушалі іх звярнуцца па дапамогу? Прывядзём некалькі прыкладаў з дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Дапамога эвакуіраваным

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны тысячы беларускіх грамадзян былі эвакуіраваны ў савецкі тыл. Многія, ратуючыся ад акупантаў, прабіраліся на ўсход самастойна. Пачынаючы з 1943 года, калі была наладжана авіяцыйная сувязь з партызанамі, з лясных аэрадромаў сталі прыбываць у савецкі тыл таксама партызанскія сем'і і дзеці-сіроты. Скажам, згодна з каштарысам выдаткаў на першы квартал 1943 года эвакуацыйнай базы СНК БССР у раёне горада Тарапца Калінінскай вобласці, кожнаму, хто прыбыў з варожага тылу, належыла бясплатнае харчаванне і праезд да месца прызначэння, выдзялялася верхняя вопратка, абутак, бялізна і галаўныя ўборы, а таксама грашовая дапамога ў памеры 200 рублёў на адну сям'ю. Але дапамагалі беларусам і раней.

У жніўні 1941 года, пасля эвакуацыі з Віцебска, у Горкаўскай вобласці апынулася сям'я настаўнікаў Валынцэвічаў у складзе пяці чалавек. У лютым 1943 года Людміла Валынцэвіч ў лісце на імя старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР апісвае бядотнае становішча сям'і ў далёкім савецкім тыле і просіць аказаць матэрыяльную дапамогу: "Мы просім Вас падтрымаць нас у гэты цяжкі момант нашага жыцця, аказаўшы, калі гэта магчыма, дапамогу харчовай пасылкай. Адначасова просім Вас не рабіць прапаноў прадстаўнікам мясцовага ўраду дапамагчы нам на месцы, бо, як паказаў вопыт іншых асоб, што звярталіся ў цэнтры, такія ўказанні не даюць добрых вынікаў і толькі выклікаюць незадавальненне і варожасць да тых, хто з'яўляўся прычынай такіх распараджэнняў з цэнтраў. Лепей адмоўце ў дапамозе непасрэдна нам праз ліст".

Два месяцы ішоў гэты ліст па інстанцыях, і толькі 27 красавіка 1943 года выйшла, урэшце, распараджэнне СНК БССР выдаць аднаразовую дапамогу эвакуіраваным з Віцебска настаўнікам Валанцэвічам у памеры 1000 рублёў.

13 лютага 1943 года ў СНК БССР звярнулася былая работніца Суражскай фабрыкі імя Вароўскага Віцебскай вобласці З.П.Голубева з просьбай аказаць ёй і яе малалетняму сыну дапамогу ў набыцці адзення і абутку. А абставіны складваліся наступным чынам. Перад самым пачаткам вайны Голубева з сынам выехала на лячэнне ў Маскву. Там яе і заспела вайна. Сяк-так яна змагла вызначыцца з жыллём — прытулілі добрыя людзі. А вось з-за адсутнасці адзення і абутку з надыходам халадоў стала невыносна. Ліст заканчваўся словамі: "Пераканаўча прашу вас дапамагчы мне ў чым можна, я вельмі прашу. Не адмоўце".

Гэтым разам ужо праз тыдзень рушыла ўслед распараджэнне за подпісам намесніка старшыні СНК БССР Івана Захарава: "Прапанаваць Наркамгандлю БССР адпусціць з тавараў, атрыманых ад выканкама Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца бясплатна для сям'і партызана, забітага нямецка-фашысцкімі акупантамі, тав. Голубевай: паліто жаночае, сукенка, панчохі — 2 пары, бялізна жаночая — 2 пары, швэдар ваўняны дзіцячы, пальчаткі — 1 пара".

У дзень Чырвонай Арміі 23 лютага атрымалі падарункі ад СНК БССР беларускія пісьменнікі Міхась Лынькоў і Кандрат Крапівы: скураныя курткі, штаны, пінжакі, кашулі, шкарпэткі, пальчаткі. Аказана грашовая дапамога і выдадзены бясплатнае адзенне і прадукты харчавання сем'ям беларускіх пісьменнікаў Якуба Коласа (тройчы), Піліпа Пестрака, Міхася Клімовіча і іншым, а вось сям'і паэта-франтавіка Аркадзя Куляшова СНК БССР рэкамендаваў, чамусьці атрымаць «за наяўны разлік касцюмы жаночыя — 2 пары, валёнкі — 1 пару, бялізну жаночую — 2 пары, панчохі — 2 пары, мыла гаспадарчае — 2 кавалкі».

27 сакавіка 1943 года распараджэннем № 75 СНК БССР аказана матэрыяльная дапамога групе беларускіх артыстаў у колькасці 13 чалавек, якія абслугоўваюць дзеючую армію: цукру па 400 г на чалавека, масла па 200 г, селядцоў па 500 г, сыра па 200 г, мыла гаспадарчага па 1 кавалку .

У архіве захоўваюцца заявы і распараджэнні Савнаркама БССР аб аказанні аднаразовай грашовай дапамогі ў памеры ад 500 да 4000 рублёў беларускім артыстам Ларысе Александроўскай, Аляксандры Нікалаевай, Рыце Млодак, кампазітару Яўгену Цікоцкаму і іншым.

У пачатку студзеня 1944 года ў Маскве адкрывалася мастацкая выстава, прысвечаная 25-годдзю БССР. Для мастакоў і навуковых супрацоўнікаў, якія абслугоўваюць выставу, было замоўлена і пашыта ў атэлье спецыяльнае адзенне. Кіраўнік выставы Алена Аладава, напрыклад, была экіпіравана наступным чынам: паліто, гарнітур ваўняны, туфлі мадэльныя, боты фетравыя, блуза шаўковая, панчохі шаўковыя, джэмпер шарсцяны. Вядомыя мастакі Яўген Зайцаў, Іван Ахрэмчык, Андрэй Бембель, Аляксей Глебаў, Пётра Гаўрыленка і іншыя атрымалі касцюмы, паліто, чаравікі, галёшы.

9 — 11 студзеня 1943 года ў Маскве праходзіў сход прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. Пра тое, як кіраўніцтва справамі СНК БССР хацела "здзівіць" удзельнікаў сходу, паведамляюць наступныя дакументы архіва.

6 студзеня намеснік кіраўніка справамі накіроўвае ліст у Наркамгандаль СССР з просьбай адпусціць для ўдзельнікаў сходу два мяхі папярос вышэйшага гатунку, а 8 студзеня ўжо сам кіраўнік спраў Савнаркама С.С.Кесцюк просіць Наркамгандаль СССР для таго ж сходу адпусціць 10 скрыняў мандарынаў і 100 кг сухафруктаў. На наступны дзень ён накіроўвае яшчэ адзін ліст па тым жа адрасе пра отпуск "для патрэб артыстаў і прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, якая прыбыла ў Маскву на сход, адэкалона на суму 8000 рублёў, пудры на 1500 руб, мыла туалетнага 100 кавалкаў".

У архіве захоўваецца яшчэ адзін дакумент, які адносіцца да пытання абслугоўвання вышэйназванага сходу. Гэта даверанасць на імя А.А.Міленькай для атрымання 100 кг сухафруктаў ад халадзільніка № 1/15. Падпісана даверанасць намеснікам Наркама гандлю БССР Галіным 12 студзеня 1943 года, гэта значыць ужо пасля таго як адбыўся сход.

Атрымлівалі аднаразовую дапамогу і работнікі беларускіх выданняў, якія знаходзяцца ў Маскве. 22 лютага 1943 года на імя намесніка старшыні Савнаркама БССР А.І.Шаўрова паступіў ліст ад работніка выдавецтва "Савецкая Беларусь" Л.Ігнатовіч, якая пісала: "7 снежня 1942 гады з памяшкання выдавецтва ў мяне скралі маё адзінае паліто і да цяперашняга часу я не магу ніяк набыць новае, таму прашу Вашай дапамогі ў набыцці паліто для мяне. У Чырвонай Арміі 3 браты і муж". Ніжэй заявы прыпіска: "Факт крадзяжу паліто ў Ігнатовіч пацвярджаю. Заг. выдавецтвам Пінхасік".

Праз два дні па распараджэнні СНК Л.Ігнатовіч з прыпіскай "Вельмі мае патрэбу ў верхняй вопратцы" Наркамгандлю БССР прапаноўвалася вылучыць паліто жаночае. А 8 сакавіка рушыла ўслед распараджэнне Савнаркама "Аб аказанні аднаразовай грашовай дапамогі" ўжо самому Г.І.Пінахсіку ў памеры 700 рублёў. У лісце на імя старшыні Савнаркама БССР Івана Былінскага ён пісаў: "Жонку маю і сына, якія знаходзяцца ў Самаркандзе, абакралі, забралі літаральна ўсё, што ў іх было з асабістых рэчаў". Як той казаў — хочаш вер, хочаш не вер.

■■■

У 1943 годзе большасць насельніцтва Беларусі знаходзілася на акупаванай фашыстамі тэрыторыі, шмат хто не меў прытулку, галадалі, дапамагалі партызанам, верылі ў перамогу і спадзяваліся на лепшую будучыню. Выжывалі самі і, як маглі, гадавалі дзяцей. Так было ў гады вайны і ў першыя пасляваенныя гады. Але ніякія цяжкасці не зламалі волі беларускага народа, таму што ён заўсёды заставаўся патрыётам.

Генадзь БАРКУН, гісторык

У кожнага, хто перажыў вайну, свая памяць пра той час, свой боль, свае ўспаміны. Старыя фотаздымкі, дакументы, узнагароды, побытавыя рэчы і талісманы, шматлікія малюнкі захоўваюць памяць аб лёсах тых, хто з годнасцю прайшоў страшэнную навалу. Мой аповед пра Уладзіміра Сакалова, які самааддана служыў сваёй Айчыне і мастацтву ўсё сваё жыццё.

Ён нарадзіўся ў Мінску, але яго школьныя гады прайшлі ў Чэрвені. У Віцебскі мастацкі тэхнікум юнак паступіў у 1928 годзе — 20-гадовым хлопцам. Вучоба на графічным аддзяленні пакінула глыбокі след у фарміраванні арыгінальнага творчага почырку. Яму пашчасціла вучыцца ў вядомых майстроў таго часу — Фёдара Фогта, Яфіма Мініна, Валянціна Волкава, Міхаіла Керзіна, Міхаіла Эндэ. Дыпломнай работай стала серыя графічных аркушаў пра Віцебскае чыгуначнае дэпо. А ўпершыню малады мастак выставіўся ў час Усебеларускай мастацкай выставы — гэта значыць, у 1932 годзе. Пасля Уладзімір Фёдаравіч зноў у Мінску, працуе ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве. У пачатку 1933-га ён быў мабілізаваны на службу ў Чырвоную Армію, а праз год дэмабілізаваны ў запас. Зноў родны горад, плённая работа…

Ды 17 верасня 1939-га Сакалова нечакана прызываюць зноў, а пазней ён скончыў у час службы аднагадовыя курсы артылерыйскай падрыхтоўкі. Словам, давялося да штыка прыраўняць пяро… Вялікая Айчынная абрывае ўсе творчыя задумы. З першых дзён вайны малодшы лейтэнант Сакалоў на фронце. Спачатку — камандзірам агнявога ўзвода, які ўдзельнічаў у абарончых баях на Гомельшчыне і Браншчыне. Потым былі фашысцкі палон, вызваленне і… зноў калючы дрот у 1949-м: амаль на сем гадоў у ГУЛАГаўскай Дубаўцы Карагандзінскай вобласці. Тыповы кінасюжэт... На шчасце, усе гады суровых выпрабаванняў яго маральнай падтрымкай, апорай заставалася жонка Соф'я Ігнатаўна. Шчырае спачуванне, перажыванне і падтрымка сталі для Уладзіміра Фёдаравіча выратаваннем, дапамагалі перанасіць пакуты, якія выпалі на яго долю. (У ваеннае ліхалецце яна разам з маленькай дачкой Ларачкай спаўна спазнала гора ў акупаваным Мінску, зарабляла на жыццё рукадзеллем і шыццём, а пасля Перамогі працавала мастаком-афармляльнікам у Палацы культуры Мінскага аўтамабільнага завода і СМУ № 8. Пакахалі ж яны адзін аднаго яшчэ калі разам вучыліся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Ажаніліся ў 1933-м...)

Да нас дайшлі хвалюючыя лісты і некалькі маленькіх фотаздымкаў таго часу. У іх уражвае невымернасць чалавечай трагедыі. Чытаючы запіскі і пісьмы бясконца шчырага і сумленнага чалавека, міжволі захапляешся яго душэўнай сілай і здольнасцю ў тых умовах заставацца добразычліўцам. Думкі пра вяртанне ў родны горад, да сям'і, не пакідалі яго. Ён чакаў і спадзяваўся…

Вось гэтыя хвалюючыя лісты:

6 чэрвеня 1953 года.

"Дорогие Зося и Лорочка!

Посылаю свои рисунки Вам на память обо мне. Сохраняйте их в семейном архиве как напоминание о том, что я любил искусство так же, как и Вас.

Крепко целую. Володя.

В этой папке 85 рисунков. Когда получите, то в ответ пришлите в посылке или бандероли журнал "Творчество" или

Уладзімір Сакалоў.



Вогненныя рубяжы і тыповы кінасюжэт



Няхай месцамі і выцвіла туш... Лёс мастака Уладзіміра Сакалова



Лісты і малюнкі Уладзіміра Сакалова, а таксама партрэт мастака, зроблены ў час ссылкі.

небольшую монографию о каком-либо русском художнике с репродукциями (небольшого формата) с подписью для меня.

Почему ничего не пишете? Вслед за посылкой я всегда ожидаю письмо. После предыдущей посылки, полученной мною в конце апреля месяца, письма от Вас ещё не получал. Пишите, жду письма с нетерпением, с подробным описанием хода и результатов экзаменов у Лорочки.

До свидания. Будьте здоровы и невредимы. Любящий Вас Володя".

14 лютага 1953 года.

"Посмотрите на этот рисунок, сделанный рукой коллеги, и вы признаете знакомые черты близкого Вам человека. Сегодня 28 марта по радио объявили амнистию, может быть, Бог будет милостив к нам и судьба моя изменится, и мы будем ждать скорой встречи, и тогда человек, нарисованный на этом листке, близкий Вам и родной, крепко прижмёт Вас к своей истосковавшийся и измученной груди.

Крепко целую Володя".

14 студзеня 1955 года.

"Здравствуйте дорогие мои Зося и Лорочка.

Посылаю Вам свои рисунки карандашом, тушью и акварелью, выполненные в свободное от работы время, большинство — вечером в нашей вечерней Академии, как мы, любители искусства, называем нашу студию. Как видно из работ, здесь нет серьёзных композиций, и приходится ограничиваться лёгкими набросками и этюдами с натуры, чтобы не забывать основы искусства и поддерживать в себе уверенность в том, что кое-что ещё могу нарисовать. Может, в будущем ещё пригодиться и найдёт прямое применение моё искусство. Да и ещё один важный фактор: свободное своё время провожу рационально — не одолевает так тоска о разлуке с Вами, за занятием незаметно проходит время и появляется некоторое моральное удовлетворение. Что время проходит не даром. Года проходят, уже настал 1955 год, и хочется надеятся и верить, что этот год будет более счастливый, чем предыдущие года, и когда-нибудь настанет время встречи.

Ну, на этом заканчиваю свою небольшую записку.

До свидания. Будьте здоровы счастливы и невредимы.

Крепко целую Володя.

Ожидаю ответа на поздравительное Новогоднее письмо и подробное описание Вашей жизни, работы и учёбы.

Больше пиши о Лорочке. Жду ответа.

Количество рисунков в этой посылке больше сотни. На 100 листах".

28 снежня 1955 года.

"Здравствуйте, дорогие и любимые Зося и Лорочка!

Поздравляю Вас с наступающим Новым 1956 годом.

От всего сердца желаю Вам здоровья, благополучия и счастья в Вашей жизни!

1956 год, год нашей встречи.

Крепко целую. Володя.

28 декабря 1955 г."

Сёння ў зборы твораў выяўленчага мастацтва Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны беражліва захоўваецца частка ўнікальнай серыі малюнкаў алоўкам, тушшу, акварэллю, выкананых Уладзімірам Сакаловым у пачатку 1950-х, у перыяд знаходжання ў сталінскім ГУЛАГу. Тут і партрэты сяброў па няшчасці, і міні-эцюды з успамінаў дзяцінства, праведзенага ў вёсцы Ачыжа Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці, сюжэтныя замалёўкі чэрвеня 1941 года, фрагменты ўспамінаў па бытавай тэматыкі…Сваеасаблівае рэха ваенных падзей і эмацыйны напал пачуццяў. Аўтар настолькі ўжыўся ў створаныя ім вобразы, што іх верагоднасць не падлягае сумненню.

Пажаўцелая, пацёртая папера, месцамі выцвіла туш і акварэльныя фарбы, усе малюнкі нібы зацягнутыя пацінай часу... Усе гады Сакалоў захоўваў дарагі мастацкі архіў. У кастрычніку 1998 года ў музеі працавала выстава "Палітра памяці" да 90-годдзя з дня яго нараджэння, дзе ўпершыню і прадставілі шматлікія малюнкі, выкананыя мастаком у розныя гады сваіх пакут. Пасля экспанавання дачка мастака Ларыса Архангельская перадала значную іх частку ў дар музею.

Вогненныя рубяжы пакінулі глыбокі след у памяці, суровыя выпрабаванні вайны прайшлі праз сэрца мастака і сталі амаль галоўнай тэмай яго творчасці і ў жывапісе, і ў графіцы. Сюжэтныя замалёўкі, зробленыя ў гады выпрабавянняў, Сакалоў увасабляе ў такіх палотнах, як "Мінск гарыць", "Няскораныя", "У нямецкім палоне". Ну, а пра тое, які ён выдатны графік, і казаць не варта: майстар працаваў у літаграфіі, манатыпіі, алоўкам. Прызнанне аматараў мастацтва заслужылі аўталітаграфіі, прысвечаныя абаронцам Айчыны "Бой з танкамі 100-й стралковай дывізіі ля Астрашыцкага гарадка", "Бой памежнікаў 4-й заставы Ф.П.Кірічэнкі".

Назіральнасць дапамагала мастаку бачыць свет шырока, пранікаючы ў сутнасць з'яў. Уладзімір Сакалоў шмат падарожнічаў па рэспубліцы і ўсім СССР. Порты Прыбалтыкі і Чорнага мора, пагранічнікі Брэстчыны, Гродзеншчыны і Крыма, новабудоўлі Беларусі — тое далёка не поўная геаграфія вандровак творцы. У выніку ж, з'явіліся дзясяткі замалёвак, аўталітаграфій і лінагравюр аб жыцці і службе воінаў-пагранічнікаў, пра найбуйнейшую ў рэспубліцы будоўлю таго часу — Лукомльскую ДРЭС. Ён часта выязджаў з перасоўнымі выставамі ў гарады, раёны рэспублікі, у ваенныя часткі, на пагранічныя заставы.

Ваенна-патрыятычная тэма на многія гады стала вызначальнай у мастацкай і грамадскай дзейнасці Уладзіміра Сакалова. Шмат гадоў ён узначальваў ваенна-шэфскую камісію Саюза мастакоў БССР. За вялікую работу і ўслаўленне воінаў-пагранічнікаў у сваёй творчасці Сакалоў быў узнагароджаны медалём "За адзнаку ў ахове дзяржаўнай мяжы СССР". Трэба адзначыць і плённую мастацтвазнаўчую працу Уладзіміра Фёдаравіча.

Па ўспамінах дачкі Ларысы Уладзіміраўны, яе бацька быў чалавекам вельмі натхнёным, шматграннай творчай асобай: добра граў на мандаліне, займаўся спортам. Памяць дзяцінства і зараз вяртае яе ў далёкія перадваенныя гады, калі яна з маці была сярод гледачоў на спаборніцтвах з удзелам бацькі ў ваенным гарадку Замброва (Польшча). Ці калі ён выконваў на мандаліне ўлюбёныя творы — старадаўні вальс "Смутак" Бакалейнікава, "Чардаш" Монці. Сёння ўспаміны дачкі вяртаюцца і да гадоў, калі яна з маці з болем і пяшчотнасцю перачытывала невялікія запіскі і пісьмы бацькі, дасланыя ў перыяд жорсткіх выпрабаванняў, разглядвалі яго шматлікія замалёўкі. Ён і ў няволі знаходзіў сілы для творчасці, бо сэнсам жыцця гэтага чалавека было мастацтва.

■■■

Мінулі гады. У родзе Сакаловых захоўваецца прафесійная пераемнасць. Інжынерам-архітэктарам стала дачка мастака Ларыса Уладзіміраўна, унучка Ларыса Георгіеўна — сама мастак і мастацтвазнаўца, праўнучка ж Любоў Дзмітрыеўна скончыла гімназію-каледж імя Івана Ахрэмчыка...

Наталля ФІЛІПОВІЧ,
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".

■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".

■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".

(У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)

■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".

■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".

■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ **"Героіка і лірыка мінулага стагоддзя"** — рускі жывапіс са збору музея — да 25 мая.

■ Сумесная выстава іспанскага мастака Дуйліа дэ Хенара і беларускага скульптара Сяргея Парцянкова — да 16 мая.

■ Выставачны праект **"Vita–Ludi–Veritas"**, у якім прымаюць удзел тры беларускія мастакі: Уладзімір Тоўсцік, Алена Шлегель і Уладзімір Ганчарук — да 26 мая.

■ Выстава твораў Мікалая Мішчанкі **"Рэальнасць чуйнай цішыні"** — да 20 мая.

■ Выстава адной карціны. Уладзімір Кожух. **"Белае на чорным. Чорнае на белым"** — да 23 мая.

■ Выстава **"Рэальнасць без падабенства"** да 90-годдзяз дня нараджэння майстра абстрактнага жывапісу, сцэнографа Аляксандра Салаўёва — да 30 мая.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".

■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".

■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.

■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".

■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.

■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.

■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.

■ Выстава **"ЭКСПІРЫмЕНТуС"** — незвычайная экспазіцыя прыбораў і прылад, якія дэманструюць фізічны бок разнастайных і дзіўных па прыгажосці з'яў, — да 3 ліпеня.

■ Выстава плакатаў часоў Вялікай Айчынная вайны — да 26 мая.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".

■ "І З'езд РСДРП у асобах".

■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".

■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".

■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"**, падрыхтаваная сумесна з мінскім музеем папулярнай навукі "Элемента", — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".

■ "Сезонныя змены".

■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".

■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".

■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".

■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.

■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.

■ Незвычайны атракцыён – **"Стужачны лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".

■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".

■ "Беларуская музычная культура XX ст.".

■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выставы:

■ **"Аўтамабіль на далоні"**.

■ Выстава **"Вялікдзень у Пецярбургу"** — да 16 мая.

■ Выстава прыватнай калекцыі Вікторыі Катарне **"Магія свечак"** — з 11 да 27 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

■ Выстава графікі славенскага мастака Стояна Брэзачніка **"Вяртанне"** — да 8 мая.

■ Міжнародная выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"Фарбы душы"** (унікальныя ўпрыгажэнні, аксэсуары і адзенне ручной работы) — з 13 па 29 мая.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл: 327 11 66; 203 07 92. Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Беларусь — радзіма марскіх герояў"** — да 10 мая.

■ **Святочная праграма, прысвечаная Дню Перамогі** — 8 і 9 мая. 8 мая музей працуе з 10.00 да 23.00, 9 мая — з 10.00 да 24.00 (у сувязі са святочным салютам 9 мая ўваход у музей і выхад з яго не будзе ажыццяўляцца з 21.30 да 22.15).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 19 верасня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.

■ Выстава **"Скарбы князёў Радзівілаў у скарбніцы Мірскага замка"** — да 28 мая.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.

■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.

■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).

■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).

■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

■ Выстава з цыклу **«Краявіды зямлі беларускай.Творы класікаў беларускага жывапісу з прыватных збораў»** — да 11 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

■ Выстава твораў Віктара Шматава, Уладзіміра Кожуха, Віктара Барабанцава **"Зямля адчужэння"**, прымеркаваная да 30-й гадавіны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, — да 22 мая.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г.Мінска Міхаілу Савіцкаму.

■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**

■ Выстава **"Адзінства"** мастакоў — членаў Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў — да 10 мая.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, рушнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX - пачатку XX ст.).

■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЯСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а. Тэл.: 321 24 30.

■ Персанальная выстава скульптара Дзмітрыя Аганава **"Метаформа"** — да 8 мая.

■ Выстава твораў Уладзіслава Пятручыка **"Маімі вачыма"** — з 11 да 29 мая.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).

■ **"Чырвоная гасцёўня".**

■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**

■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**

■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**

■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Інтэрактыўная выстава-шоу з Рыміні (Італія) **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 6 чэрвеня.

■ Выстава **"З любоўю да Беларусі"** (прадстаўнічыя падарункі кіраўнікоў дзяржаў, дыпламатаў і грамадскіх арганізацый Рэспублікі Беларусь) з фондаў Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці — да 15 мая.

■ Выстава **"Беларусь. 30 гадоў пасля Чарнобыля"** — да 15 мая.

■ Выстава **"Мумії свету"** — да 8 мая.

■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 29 мая.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:

■ Выстава **"Мудрая думка"** — выданні ўсходняй літаратуры (фонд мініяцюр) другой паловы XX ст. — да 29 мая.

■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.

■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.

■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.

■ **"Музей крыміналістыкі"**.

■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.

■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.

■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.

■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.

■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**

■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**

■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9 тэл. 801595- 2-68-96

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").

■ Выставы **"Яўрэйскі квартал"**, **"Доўгія вёрсты вайны"**.

■ Персанальная выстава ікон Ядзвігі Сянько.

■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка", паслуга "Дні нараджэння ў музеі".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.

■ Фотавыстава **"Усе дарогі вядуць у... Італію"** — да 15 мая.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ Арт-праект **"Семечкі"** — да 15 мая.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **7 —** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню Перамогі.

■ **11 — "Рыгалета"** (опера ў 2-х дзеях) Дж.Вердзі.

■ **12,13 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

■ **11 — "Адамавы жарты"** (камедыя паводле твораў Ф.Аляхновіча і Л.Родзевіча) С.Навуменка.

■ **12 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.

■ **13 — "Ліфт"** (хроніка аднаго злачынства) Ю.Чарняўскай.

■ **14 — "Дзённік паэта (Інтымны дзённік)"** (гісторыя кахання і здрады) С.Кавалёва.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

■ **11 — "Сільва"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана.

■ **12 — "Вяселле ў Малінаўцы"** (музыкальная камедыя ў 2-х дзеях) Б.Аляксандрава.

■ **13 — "Лятучая мыш"** (аперэта ў 3-х дзеях) І.Штраўса.

■ **14 — "Дуброўскі"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **7 — "Бука"** (казка для дзяцей ад 3 год) М.Супоніна. Пачатак аб 11-й.

■ **8 — "Дапытлівае сланяня"** (казка для дзяцей ад 5 год) Р.Кіплінга. Пачатак аб 11-й.

■ **14 — "Піліпка і Ведзьма"** (казка для дзяцей ад 5 год) С.Кавалёва. Пачатак аб 11-й.

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне **+ 375 17 286 07 97** і па тэлефоне/факсе **+375 17 334 57 41,** альбо пішыце на электронны адрас **kultura@tut.by!**